Л.В.Ракава

# ТРАДЫЦЫІ СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ



Л.В.Ракава

# ТРАДЫЦЫІ СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ

Мінск
«Ураджай»
2000

УДК 37.018.1:392.3 (=826)
ББК 74.9 (4 Беи)
Р 19

Р э ц э н з е н т ы : *І.І.Калачова*, канд. гіст.навук, ст. навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі, *Т.А.Навагродскі*, канд. гіст. навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, *І.І.Сташулёнак*, нам. дырэктара Мінскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа № 1.

**Ракава Л.В.**

Р19 Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. – Мн.: Ураджай, 2000. – 111 с.: іл.

ISBN 985-04-0398-5

У кнізе на шырокім гісторыка-этналагічным матэрыяле аналізуюцца традыцыйныя формы, метады і сродкі выхавання дзяцей у беларусаў, асаблівасці іх побыту і культуры.

Разлічана на этнографаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, настаўнікаў і выхавацеляў дашкольных і школьных устаноў, а таксама на ўсіх тых, хто цікавіцца праблемамі выхавання.

**УДК 37.018.1:392.3 (=826)**
**ББК 74.9 + 63.5 (4 Беи)**

**ISBN 985-04-0398-5**

© Л.В.Ракава, 2000

# УВОДЗІНЫ

Ты пакуль што — быццам тая дзічка ў гаі,
На якую аніхто і не зважае.
Прышчапі ж галінак — з розуму і цноты,
З веры ў Бога шчырай, з дабраты, пяшчоты,
Гэткіх дасць яна пладоў!

*М.Рэй з Нагловіц**

Беларуская вёска з яе працавітым і добразычлівым народам, улюбёным у сваю зямлю і край, які мае своеасаблівы побыт і вельмі багатую духоўную спадчыну, заўсёды прыцягвала ўвагу даследчыкаў. Асобую цікавасць да жыцця вясковага насельніцтва маюць этнографы, якія на працягу двух стагоддзяў вывучаюць мінулае і сённяшні сямейны і грамадскі побыт, матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў. Адным з найменш даследаваных бакоў жыцця да нядаўняга часу заставалася народная педагогіка, якая ўвабрала ў сябе шматвяковы вопыт выхавання, выверaны практыкай многіх пакаленняў. Цікавасць да яе ўзрасла, калі востра ўстала праблема выхавання нацыянальнай самасвядомасці, стварэння нацыянальнай сістэмы адукацыі і выхавання дзяцей у сям'і.

Яшчэ ў мінулым стагоддзі даследчыкі заўважылі, якую велізарную ролю ў выхаванні дзяцей адыгрывала сям'я — яна была і творцай, і ахоўнікам педагагічных традыцый. П.Бабpoўскі пісаў, што нацыянальна вызначальныя рысы беларуса яскрава праяўляліся ў мове, спецыфічным характары, у песнях, прыказках і г.д. «Свае перакананні і маральную філасофію ён (беларус) перадае разам з мовай сваім дзецям і ўнукам» (Бобровский. 1863. Ч. 1. С. 822).

Народная педагогіка дазваляла вырасціць фізічна загартаваных і духоўна багатых людзей, асноўнымі якасцямі якіх сталі шырока вядомая ў свеце працавітасць і добразычлівасць беларусаў. Неабходнасць ведання паўзабытых і адкінутых народных традыцый, якія і сёння маюць велізарнае значэнне для практыкі выхавання дзяцей і моладзі, абумовіла інтарэс аўтара да вывучэння народнай педагогікі з пункту гледжання этнаграфіі. Аўтара цікавілі не толькі нарматыўныя ўяўленні народа аб выхаванні, педагагічны ідэал, але і сама выхаваўчая практыка.

**Мікалай Рэй* (1505–1569) — славуты польскі пісьменнік, «бацька польскай літаратуры», родам з Нагловіц.

Асэнсаванне каштоўнасцей народнай педагогікі беларусаў пачалося ў канцы XIX стагоддзя, калі з'явіліся працы этнографаў, у якіх утрымліваліся і звесткі аб укладзе жыцця дзяцей у XIX — пачатку XX стагоддзя, традыцыйных нормах выхавання, педагагічным ідэале беларусаў, аб ролі вясковай сям'і ў выхаваўчых працэсах, у тым ліку і ў сацыялізацыі асобы і перадачы этнакультурнай інфармацыі. Гэта перш за ўсё даследаванні М.Я.Нікіфароўскага, М.В.Доўнар-Запольскага, А.К.Сержпутоўскага, П.В.Шэйна, Е.Р.Раманава, А.Я.Багдановіча і інш. Аднак і ў іх мы не знаходзім дастатковай колькасці апісанняў канкрэтных жыццёвых сітуацый, дзе дзеці паказаны ва ўзаемаадносінах з бацькамі, аднагодкамі, вяскоўцамі і г.д. Больш увагі ў гэтых працах нададзена працоўнай дзейнасці дзяцей, гульням, звычаям і абрадам, звязаным з імі.

Многія аспекты дзіцячага выхавання закрануты ў працах А.Я.Багдановіча — бацькі знакамітага паэта Максіма Багдановіча. Сам педагог, ён сабраў, апублікаваў матэрыялы па народнай педагогіцы і выкарыстоўваў іх у сваёй практычнай дзейнасці. А.Я.Багдановіч, збіраючы ўзоры народнай творчасці, заўважыў, што фальклор — выдатная крыніца для вывучэння педагагічных поглядаў народа, дзе знайшлі адлюстраванне прынцыпы, формы і метады выхавання. Ён зразумеў, што мае справу з цэласнай сістэмай выхавання, адпрацаванай, адшліфаванай многімі пакаленнямі беларусаў і апрабаванай у кожным з іх, і што гэты гісторыка-педагагічны вопыт народа трэба зберагчы і выкарыстоўваць як крыніцу народнай мудрасці.

Даследчыкі больш позняга часу таксама звярталі ўвагу на праблемы выхавання дзяцей і спецыфіку дзіцячай культуры. Аб неабходнасці вывучэння побыту дзяцей Беларусі ў 1930 г. пісаў краязнавец М.Каспяровіч. Ён прыйшоў да высновы, што гэты побыт мае свае асаблівасці як у розных нацыянальнасцей, так і ў горадзе і вёсцы, а таму лічыў неабходным даследаванне не толькі матэрыяльнага побыту дзяцей (умовы жыцця, адзенне, ежа, праца), але і духоўнай культуры (абрады, вераванні, гульні, цацкі, асаблівая дзіцячая мова і іх творчасць) (Каспяровіч. 1930. С. 16–19).

У апошняе дзесяцігоддзе па народнай педагогіцы апублікаваны дзве працы Г.П.Арловай (Арлова. 1993, 1995). У першай аўтар на шматлікіх фальклорных матэрыялах, галоўным чынам прыказках, прымаўках, казках, песнях, аналізуе педагагічныя ідэі і выхаваўчы вопыт народа. Другая прысвечана выкарыстанню ў навучальна-выхаваўчым працэсе сучаснай школы формаў, метадаў і сродкаў народнай педагогікі.

У 1996 г. выйшла кніга «Народная педагогіка беларусаў» калектыву аўтараў, якая знаёміць з традыцыямі народнай педагогікі, з вопытам выкарыстання іх у агульнаадукацыйнай школе на Беларусі ў папярэднія эпохі, пачынаючы з сярэдневякоўя і заканчваючы пачаткам XX стагоддзя.

Педагагічныя традыцыі беларусаў былі аб'ектам вывучэння І.І.Калачовай (Калачова. 1995, 1999). Асаблівасці беларускай этнапедагогікі разглядаліся аўтарам дадзенай працы ў шэрагу артыкулаў (Ракава. АВ, 1996,№ 2, 7 і 8). У кнізе «Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы» аналізуюцца выхаваўчыя традыцыі вясковай сям'і на працягу амаль двух стагоддзяў, якія ахопліваюць і перыяд найвышэйшага іх росквіту (канец XIX стагоддзя), і перыяд заняпаду (другая палова XX стагоддзя). У аснову даследавання пакладзены гістарычны прынцып. Як этнограф аўтар не магла абыйсці ўвагай асаблівасці побыту дзяцей: адзенне, харчаванне, умовы існавання дзяцей, працу, гульні, забавы, удзел у святах і абрадах, бо ў кожным з іх ёсць выхаваўчыя моманты. Інакш кажучы, гэта народная педагогіка ў дзеянні.

Мая праца над тэмай пачалася з вывучэння фальклору: казак, песень, прыказак, прымавак і г.д. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала тое, што да паслуг даследчыкаў існуе велізарны «Збор беларускай народнай творчасці» (45 тамоў), выдадзены аддзелам фальклору Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі ў апошнія дзесяцігоддзі.

Адначасова назапашваліся матэрыялы ў ходзе этнаграфічных экспедыцый 1993–1998 гг. Апытанні старажылаў у розных кутках Беларусі, назіранні за ўмовамі жыцця і побыту, успаміны аб далёкай мінуўшчыне былі дапоўнены ўласнымі ўражаннямі і аповядамі родных, вяскоўцаў, пачутымі ў дзяцінстве. Яно прайшло ў маленькай вёсцы Сушчэўская Слабодка непадалёку ад Чавус, што на Магілёўшчыне. Дзядуля Мікіта Несцеравіч і бабуля Марфа Ігнатаўна Гаўрыленкі, якія нарадзіліся ў канцы мінулага стагоддзя, не толькі шмат расказвалі аб далёкім мінулым, сваім дзяцінстве, але, па традыцыі, карысталіся народнымі метадамі і сродкамі выхавання. Згодна з іх поглядамі, выхаванне пачынаецца з працы і ў працы. Яшчэ да школы яны навучылі мяне хатняй працы, а таксама жаць, «браць» лён, палоць, даглядаць птушак і г.д. На ўсё жыццё запомнілася мне дзедава «бярозавая каша» (бярозавы пруцік), якая вісела напагатове за бэлькай над паліцай. Яе зведала я не аднойчы за дрэнныя ўчынкі.

Бабуля і асабліва дзядуля захоўвалі бытавыя традыцыі і звычаі і прывучалі ўнукаў трымацца іх. На ўсё жыццё запалі ў

душу народныя спевы, калі сяляне збіраліся ў час свят у адной хаце. Гэта былі спевы з падгалоскамі, вельмі прыгожыя,быццам яны штодня рэпеціравалі. Запомніліся абшчыннасць, калі аднавяскоўцы былі вельмі блізкімі адзін аднаму, працавалі, адпачывалі разам, разам будавалі дамы і дапамагалі ў складаныя моманты жыцця. Гэта гатоўнасць беларусаў прыйсці на дапамогу была тыповай для вясковага жыцця пасляваеннага часу.

Матэрыялы, сабраныя ў этнаграфічных экспедыцыях, дазволілі вызначыць як агульныя рысы, так і рэгіянальныя асаблівасці ў дзіцячым побыце, традыцыях іх выхавання ў XX стагоддзі.

Шмат каштоўных звестак аб выхаванні дзяцей розных саслоўяў выяўлена з гістарычных крыніц XVIII – XX стагоддзяў. Усе гэтыя матэрыялы ілюструюць адметнасць народнай педагогікі беларусаў, якая мела глыбокія і трывалыя карані, але сёння, на жаль, забываецца. Жывая і дзейсная, яна магла б паслужыць многім пакаленням беларусаў, узбагачаючы педагагічны вопыт лепшымі народнымі традыцыямі.

Выхаванне чалавека — вельмі складаны, разнастайны і супярэчлівы працэс. Таму ў вызначэнні прадмета народнай педагогікі як адной з галін педагогікі ў цэлым існуе шмат падыходаў. Аднак большасць даследчыкаў сходзіцца на думцы вызначальнай ролі традыцыйнай сям'і як каталізатара і крыніцы развіцця педагагічных ідэй, якая назапашвала традыцыі педагагічнай культуры народа на працягу многіх стагоддзяў. Зыходзячы з гэтага, я палічыла мэтазгодным разгляд традыцый сямейнага выхавання падаць наступным чынам. Спачатку аналізуюцца ўзроставыя ступені дзяцінства, бо не ўлічваць іх у працэсе выхавання немагчыма. Затым ідзе асноўны раздзел даследавання — «Працэс выхавання ў народнай педагогіцы», у якім у канцэнтраваным выглядзе разглядаюцца ўсе аспекты, якія ўваходзяць у паняцце «сістэма выхавання». У наступных, асобных раздзелах яны аналізуюцца больш падрабязна — гэта і ўмовы жыцця дзяцей, гульні і забавы, вераванні і абрады традыцыйнай культуры, у кругаварот якіх дзеці былі далучаны з калыскі, назіралі іх, засвойвалі, а потым гэтак жа, на прыкладах, у працэсе працы, гульні, перадавалі сваім дзецям. Аўтар спадзяецца, што чытачу будзе цікавая гэта кніга, з якой ён даведаецца аб педагагічным ідэале беларусаў, багатых выхаваўчых традыцыях XIX – XX стагоддзяў.



## ДЗЯЦІНСТВА: УЗРОСТАВЫЯ СТУПЕНІ

У кожнага народа складалася свая «мадэль» дзяцінства, якая нярэдка супадала не толькі ў блізкіх па культуры народаў, але і ў вельмі далёкіх. У XIX стагоддзі ў беларусаў дарослым лічыўся чалавек з моманту ўступлення ў шлюб. У больш аддалены час (XVI – XVII стагоддзі) уступленне ў правы дарослага грамадзяніна пачыналася ў «леты зупольныя», якія, згодна са звычаёвым і дзяржаўным правам, для хлопцаў вызначаліся 15 – 18, а для дзяўчат – 13 – 15 гадамі (Статут. 1588). З гэтага ўзросту яны мелі права выступаць на «копных» судах як у якасці сведкі, так і адказчыка і несці адпаведнае пакаранне.

З далёкай мінуўшчыны, галоўным чынам праз фальклор, да нас дайшлі ўяўленні народа аб нараджэнні дзяцей праз цуд. Такія ўяўленні ўласцівы многім народам, што яскрава праяўляецца ў народнай творчасці, перш за ўсё ў казках, у якіх малюецца карціна нараджэння дзіцяці без маці, без бацькі. У беларускай народнай казцы «Пакаці-гарошак», напрыклад, доўгачаканы сын зўяўляецца з пасаджанай маці гарошыны. Большасць даследчыкаў бачаць у гэтым рэшткі татэмістычных вераванняў, калі чалавек лічыў сябе часткай прыроды і не праводзіў выразнай мяжы паміж сабой і астатнім жывёльным светам. Таму і бытуюць у народзе творы, дзе жанчына выкормлівае маленькага звярка або звер корміць нованароджанага багатыра. Акрамя таго, ёсць творы, у якіх расказваецца, што ў птушкі ці жывёліны нарадзілася дзіця-чалавек.

Існуюць сведчанні і невыразных народных уяўленняў аб самім працэсе зацяжарання жанчыны. Да сённяшняга часу на сяле дарослыя расказваюць маленькім, што іх браціка ці сястрычку прынёс бусел або іх знайшлі ў капусце, гаросе ці яны з'явіліся на свет «з дапамогай» з'едзенага прадмета і г.д.

Дарэчы, бусел стаў своеасаблівым нацыянальным сімвалам тлумачэння нараджэння дзіцяці. Гэты сімвал існуе і сёння.

У некаторых мясцовасцях захаваўся звычай пры нараджэнні дзіцяці пасадзіць дрэўца. Мала хто задумваецца зараз над сэнсам гэтага. У старажытнасці народ верыў, што дрэва з'яўляецца крыніцай жыцця і яго рост і развіццё суадносіў з ростам і развіццём дзіцяці, а таксама лічыў, што гэта дрэва ўплывае нават на яго лёс.

У розных народаў склаліся свае традыцыйныя «нормы» ў адносінах да колькасці дзяцей у сям'і. У беларусаў мець многа дзяцей у сям'і лічылася адзнакай шчасця. «Багаты Аўдзей, поўна хата дзяцей», — сцвярджае прымаўка. Бясплоддзе ж было няшчасцем, божай карай. «Многа дзяцей — многа клопату, але і радасці шмат». «Хата без дзяцей — магіла, а з дзецьмі — базар», — гаварылі ў народзе. Цікава, што, па народным разуменні, дзяцей у сям'і павінна быць не менш трох, інакш цяжэй выхаваць з іх добрых людзей. Адносна адзінага дзіцяці ў сям'і народная мудрасць гаворыць так: «Адзін сын — смятаннік», «З адзіняка будзе сабака», «Адзін сын — не сын, два сыны — паўсына, тры сыны — сын». Але калі дзяцей у сям'і было многа, а жанчына нараджала амаль штогод («Аднаго да долу, другога да дому»), цяжка было пракарміць усіх. Сяляне спачувалі такім бацькам і далейшую пладавітасць лічылі божым пакараннем, бо такую сям'ю чакала беднасць, нястача («Былі недастаткі цераз дзень, а як дзеткі пайшлі, дык штодзень»). Як правіла, не спраўджвалася спадзяванне на тое, што «Дасць Бог раточак, дасць і кусочак».

Цікава, што ў розных народаў перавага аддавалася хлопчыкам, а не дзяўчынкам. У нашых продкаў хлопчыкі таксама былі больш жаданымі. І гэта жаданне было пануючым у іх поглядах, бо вынікала з бяспраўнага і падпарадкаванага становішча жанчыны ў сям'і і грамадстве. Больш таго, лічылася, што дачка — адрэзаны кавалак для сям'і, а каб яе аддаць замуж, трэба было яшчэ падрыхтаваць і пасаг. Гэтыя меркаванні практычнага характару падзяляліся ўсімі саслоўямі грамадства.

У.Сыракомля адзначаў, што селянін больш радаваўся нараджэнню сына, чым дачкі, бо марыў мець памочніка ў гаспадарцы, апору ў старасці і прыводзіў словы народнай песні, у якой яскрава прасочваецца гэта думка: «Калі ў мяне сын народзіцца, я здабуду для гасцей вішнёвага соку, калі дачка — вадой іх прыму, калі сын, збудую высокія гмахі, калі дачка — і шалаша не пастаўлю» (Сыракомля. 1993. С. 312). Падобная думка сустракаецца і ў асобных песнях, прыведзеных П.В.Шэйнам. Напрыклад, у песні, запісанай у Віцебскай

губерні, калі бацька пытае аб тым, хто нарадзіўся, так пяюць (Шейн. 1887. Т. I. Ч. 1. С. 21–22):

Колі дочушка – дастаўлю я соку,
А колы сыночак – горэлачку добуду.

У Барысаўскім павеце Мінскай губерні ім запісана падобная песня:

Колі сына, я мёду добуду,
Колі дочушка, я і так абойдуся,
Колі сына, я і горад пастаўлю,
Колі дочушка, з кажушкамі адпраўлю.

Такім чынам, хлопчыкам аддавалі перавагу як у сем'ях багатых, так і ў сем'ях простых людзей. З нараджэннем сына багатыя радаваліся з'яўленню наследніка, простыя людзі – работніка. Народ лічыў, што «Дзеўкі – чужая крупеня», «Сын у дом грабе, а дачка ў людзі бярэ», «Хто мае дочкі, той ходзіць без сарочкі, а хто мае сынкі, той пячэ блінкі». Разам з тым жаданне мець сына або дачку залежала ад кожнай асобнай сям'і: дзе нараджаліся часцей дочкі – хацелі сына, а дзе нараджаліся сыны – наадварот, марылі аб дачцы. Больш таго, усе разумелі, што добра мець і дзяўчынку, бо яна – памочніца ў доме. Народная мудрасць сцвярджае: «Без дачкі сям'я, што без агня», «Без дачкі парастуць пад лаўкаю казлячкі». У кожнага полу, па народным разуменні, ёсць свае прывілеі: хлопчык стане добрай апорай для бацькоў, асабліва калі яны састарацца, узяўшы ўсе абавязкі бацькі на сябе, і «будзе каму вочы закрыць»; дзяўчынка ж стане дапамагаць маці ў нялёгкай хатняй працы.

Жаданне мець хлопчыка або дзяўчынку ў розных народаў дыктавалася рознымі прычынамі.

У большасці народаў з далёкай мінуўшчыны закладзена жаданне мець больш дзяцей мужчынскага полу. Спачатку гэта было звязана з імкненнем павялічыць колькасць воінаў. Вядома, напрыклад, што ў персаў па гэтай прычыне забівалі нованароджаных дзяўчынак, пакуль не народзіцца сын. Перавага мужчынскага полу тлумачылася жаданнем мець нашчадка, паслядоўніка, тым больш што спадчыннае права больш ільгот давала мужчынам.

У дваранскіх сем'ях нараджэнне хлопчыка было асабліва пажаданым і лічылася найвышэйшым шчасцем, бо яно гарантавала працяг роду і прозвішча, а ўрэшце – і справы бацькі. Не толькі бацька, але і маці часта хацела сына, каб дагадзіць мужу і не трапіць да яго ў няміласць. З літаратуры і жыцця мы ведаем шмат прыкладаў таго, калі жанчыны, каб мець сына, звярталіся

да знахарак. Да дзяцей мужчынскага полу ставіліся з большай увагай і любоўю. Цікава адзначыць, што паступова, калі пры дзецях выказвалася меркаванне, што лепш мець сына, чым дачку, у хлопчыкаў развівалася пачуццё самазадаволенасці, асабістай годнасці і гордага ўсведамлення сваёй перавагі над дзяўчынкамі.

І ўсё ж бацькі незалежна ад полу заўжды радаваліся нараджэнню здаровага дзіцяці. Селяніну было цяжэй у будучым ажаніць сына ці аддаць замуж дачку, калі яны мелі фізічныя недахопы ці калецтвы. Дзецям багатых суджанага ці суджаную знаходзілі амаль заўсёды. Здараліся выпадкі, калі дзяўчына з багатай сям'і, якая моцна кульгала ці мела іншы фізічны недахоп, выходзіла замуж за самага прыгожага хлопца (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 1).

***Перыяд дзяцінства***, у адпаведнасці з традыцыямі і народным поглядам, падзяляўся на ***чатыры ўзроставыя ступені***: маленства — ад нараджэння да 6—8 гадоў; дзяцінства — ад 6—8 да 12—14 гадоў; падлеткавы ўзрост — ад 12—14 да 16—17 гадоў і юнацтва — ад 16—17 да 18—20 гадоў. Кожнай з іх адпавядалі змены ў біялагічным развіцці дзіцяці, пэўныя абавязкі дзяцей у сям'і і грамадстве, адносіны бацькоў да дзяцей розных узростаў, адносіны да іх іншых членаў сям'і і грамадства.

Першая ступень — **маленства** — у сваю чаргу ўключала дзве ўзроставыя падгрупы, якія мелі адпаведныя назвы — *«анёлкі»* і *«блазнюкі»*. Першая пачыналася ад з'яўлення на свет дзіцяці — немаўляці, «анёлка», і заканчвалася, калі яго адымалі ад грудзей — у 2—3 гады. Да *анёлкаў* на Беларусі адносілі дзяцей без розніцы полу. Існавала павер'е, што памерлыя дзеці, якія не былі ахрышчаны і не зведалі малака маці, служаць Богу на небе ў якасці анёлаў (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 46). Адсюль, відаць, і назва. Верылі, што душы памерлых без хрышчэння дзяцей лятаюць над раздарожжам і плачуць, просячы, каб прахожы ахрысціў іх. Пачуўшы плач, роўна апоўначы, трэба было назваць мужчынскае ці жаночае імя. Калі чалавек, які пачуў гэты плач, не ўгадае імя, яна — душа — зноў паляціць з плачам і так будзе лятаць, пакуль не ўгадаюць яе імя. Калі ж імя будзе ўгадана, душа трапіць у рай, а чалавек, што паспрыяў гэтаму, будзе шчаслівы, а калі не — то яна трапіць у пекла з вечнаю крыўдаю на людзей (Шейн. 1887. Т.І. Ч. 1. С. 18). Нашы продкі былі ўпэўнены, што «анёлкі» могуць увасабляцца ў наступных дзецях. Душы памерлых дзяцей ушаноўваліся нароўні з душамі дарослых (Харузіна. 1911. С. 73).

Вера беларусаў у тое, што дзіцятка, прыйшоўшы ў свет, можа ў любы момант вярнуцца ў небыццё, што душа яго можа свабод-

на пакідаць цела і хадзіць па розных месцах, маюць аналогіі з уяўленнямі іншых народаў, геаграфічна аддаленых, напрыклад, нганасан і нанайцаў (Бутинов. 1992. С. 13).

Уяўленні аб сутнасці дзіцячай прыроды знаходзім у вераваннях і абрадах, якія звязаны з наданнем імя. У народзе жыло перакананне аб шчаслівых і нешчаслівых імёнах, якія могуць уплываць на лёс дзіцяці. Таму было шмат спосабаў варажбы на конт выбару імя, улічвалі прадказанні сну і г.д. У Магілёўскай губерні існаваў звычай: калі паміраў нованароджаны, яму давалі імя бацькі ці маці (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 1).

Выбіраючы імя для дзіцяці, кіраваліся тым, што праз яго — праз імя — можна перадаць тыя якасці і рысы характару, якія былі ўласцівы чалавеку, што насіў яго. Тут праглядваецца і культ продкаў, калі, напрыклад, нованароджанаму давалі імя паважанага продка, вера ў перасяленне ў нованароджанага душы памерлага і яго другое нараджэнне. Беларусы пазбягалі даваць імёны памерлых дзяцей нованароджаным, каб іх не напаткаў той жа лёс (Кухаронак. 1993. С. 40). Бацькі стараліся не даваць сваім дзецям імёны блізкіх і далёкіх людзей, якія мелі дрэнную рэпутацыю. Часта дзяцей называлі ў гонар дзеда або бабулі ці імёнамі бацькоў. Але часцей за ўсё імя дзіцяці давалі па святцах у гонар аднаго з праваслаўных святых, які прыходзіўся на дзень нараджэння дзіцяці, які, па рэлігійнай традыцыі, на працягу ўсяго жыцця будзе яго анёлам-засцерагальнікам.

Наданне дзіцяці імя, хрэсьбіны адкрывалі жыццёвы цыкл, які можна назваць «сацыяльным нараджэннем». Пры гэтым адбывалася ўключэнне новага чалавека ў род, абшчыну, грамадства шляхам прадстаўлення яго запрошаным на свята членам грамады.

Адносіны да дзяцей першай узроставай ступені з боку бацькоў і іншых членаў сям'і былі асаблівымі. Догляд за імі патрабаваў пільнай увагі і клопатаў. Немаўлят закручвалі ў пялюшкі, туга перавязвалі «спавівачом» — спецыяльна тканым вузкім паяском і клалі спаць у драўляную або плеценую з лазы калыску, якую падвешвалі да столі ці бруса. Кармілі іх выключна грудзьмі. Іншы раз маці клала спаць нованароджанага побач з сабой, каб хутчэй супакоіць дзіця, калі яно заплача, патрабуючы ежу. Гэта было небяспечна і бывалі выпадкі, калі стомленая цяжкай працай жанчына ў моцным сне магла задушыць дзіця, падмяўшы яго пад бок. У народзе пра такую жанчыну гаварылі, што яна «прыспала» дзіця.

Яшчэ з часоў паганства ў беларусаў захаваўся агульнаславянскі звычай «пастрыга», які ў тыя часы абазначаў момант пераходу дзіцяці ад апекі маці да выхавання бацькам

ці племем (Новый труд. 1912. № 3. С. 58). Першапачатковы сэнс гэтага звычаю, праўда, быў даўно страчаны, і ўжо ў XIX стагоддзі «пастрыг» азначаў, што дзіцяці споўніўся год і яго ўпершыню стрыглі. Больш ранняе галенне лічылася шкодным.

У жыцці маленькіх так вызначалі перыяды іх росту: «садзіцца», «поўзае», «стаіць на ножках», «робіць першыя крокі», «ходзіць», «гаворыць першыя словы», «размаўляе».

Сачылі і за з'яўленнем першых зубоў у дзіцяці. Ранняе з'яўленне іх — на 3—5-м месяцы — лічылася непажаданым, таму што гэтыя зубы, па народным уяўленні, будуць нетрывалыя; больш позняе — на 6—8-м месяцы — нармальным. Прарэзванне зубоў звычайна суправаджалася пагаршэннем настрою і агульнага фізічнага стану дзіцяці; яно станавілася неспакойным, капрызіла, плакала. Каб прарэзванне зубоў адбывалася лягчэй, маленькім дзецям давалі кусаць цвёрдыя прадметы, моркву, яблык і інш.

Як вядома, у маленькіх хутка растуць пазногці, якімі яны, распавітыя, могуць абадраць сабе твар. Таму іх перыядычна ўкарочвалі. Паўсюдна ў мінулым пазбягалі іх падрэзвання, а адкусвалі. Звычайна гэта рабіла маці.

Размаўляць з немаўляткам пачыналі з першых дзён жыцця, каб, слухаючы мову, дзіця хутчэй навучылася гаварыць. Рабілі гэта ў час спавівання яго або трымаючы на руках ці гушкаючы ў калысцы. Паўтаралі першыя гукі, якія вымаўляла маленькае, потым яго першыя словы.

Стараліся не ўпусціць моманту, калі дзіця ўпершыню свядома вымавіць «мама», «тата», «дзед», «баба». Радаваліся іх першым словам, паўтаралі гэтыя словы, каб дзіця запомніла іх.

Трэба адзначыць, што часцей за ўсё словы, якім вучылі дзіця, вымаўляліся скажона. Існавала шмат слоў у дзіцячым лексіконе, якія ў практыцы дарослых не ўжываліся: «зюзя» (холад, мароз), «цюця» (сабака), «мымка» (дамавік), «кака» (дрэнны) і інш.

У 4—6 месяцаў дзіця ўжо садзілі на ложку, абклаўшы падушкамі. Калі дзіця добра трымалася на нагах (у 7—8 месяцаў), яго пачыналі вучыць хадзіць, спачатку трымаючы за дзве ручкі, а пазней — за адну. Звычайна ў маці было вельмі шмат клопатаў па гаспадарцы, не хапала часу для такіх заняткаў, і іх з задавальненнем выконвалі старэйшыя дзеці.

У раннім дзяцінстве, па народным звычаі, дзяцей нельга было біць, крыўдзіць. Увогуле да капрызаў маленькіх гэтага ўзросту адносіліся спагадліва. Па традыцыі, вельмі гарэзлівыя паводзіны спынялі або лёгкім плескачом, патрабавальным словам ці простым падманам, калі пераключалі ўвагу маленькага на нейкі прадмет, і яно суцяшалася. Разам з тым народная

мудрасць асуджала тых бацькоў, якія вельмі патуралі дзіцячым капрызам: «Не патурай, а што трэба — дай». Патрэбы маленькіх стараліся выконваць у першую чаргу, але тое, што дазволена было рабіць маленькім дзецям, не дазвалялася дзецям больш старэйшага ўзросту.

К канцу першага года жыцця маленькіх прывучалі адпраўляць прыродныя патрэбы арганізму ў адведзеных месцах, а таксама мыцца, прычэсвацца, апранацца, трымаць у руцэ лыжку і карыстацца ёю. Гэта ўсё дзеці рабілі па прыкладу дарослых.

Перыяд **маленства**, згодна з нашай класіфікацыяй, уключае і *другую ўзроставую падгрупу*, якая мае адрозненні ад першай. Гэта дзеці ад 2 – 3 да 6 – 8 гадоў. Іх беларусы называлі *«блазнюкамі»*, *«блазненкамі»* або *«блызненкамі»* (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 46).

«Блазнюкам», як і «анёлкам», патрабаваліся вялікая ўвага і клопаты. «Блазнюкі» ў сям'і былі акружаны ўвагай бацькоў, старэйшых дзяцей. Праўда, патрабаванні і просьбы «блазнюка», у адрозненне ад «анёлка», выконваліся толькі тады, калі бацькі лічылі іх неабходнымі, бо народная мудрасць папярэджвала: «З пестуна нічога не будзе».

У народнай творчасці мы знаходзім непасрэдныя ўказанні на тое, як выхаваць з дзіцяці добрага чалавека, выкарыстоўваючы розныя прыёмы ў залежнасці ад узросту. Народная прымаўка вучыць бацькоў: «Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі — пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка». Прагляд-ваецца тут яшчэ адзін важны момант: у маленстве, лічыць народ, неабходны мяккія, уважлівыя, пяшчотныя адносіны да дзіцяці. Гэта дазваляе гаварыць аб існаванні своеасаблівай «школы пешчання» маленькіх, якія яшчэ толькі пачынаюць развівацца, фарміравацца і ў іх зараджаецца асэнсаванае разуменне. Толькі к пяці гадам з'яўляюцца першыя свядомыя парасткі маральнасці. Добрыя звычаі, якія якраз замацоўваюцца да гэтага ўзросту, лепш за ўсё фарміруюцца шляхам пераймання. У народзе добра разумелі дзейснасць такога важнага сродку. У многім спрыяла гэтаму само жыццё, дзе кожны дзень дзіця назірае пэўныя сітуацыі, слухае гісторыі, казкі, пасвойму ўспрымаючы іх, засвойвае асноўныя паняцці.

Беларусы з маленства дзяцей прывучалі да працы. Ужо ва ўзросце 4 – 5 гадоў яны выконвалі нескладаныя работы па дому: пасвілі птушку, няньчылі малодшых братоў і сясцёр і г.д. У гэтым узросце дзеці былі цалкам пад апекай маці, якая карміла, даглядала іх, давала невялікія заданні.

І хлопчыкі, і дзяўчынкі спалі разам. Іх бралі з сабой у лазню то бацька, то маці.

Да сямі гадоў звычайна дзеці хадзілі ў адных сарочках і хлопчык адрозніваўся ад дзяўчынкі толькі даўжынёй валасоў: у хлопчыка – кароткія, у дзяўчынкі – доўгія. Гулялі яны разам: бегалі, скакалі на палачных «коніках», гулялі ў «лялькі», пяклі «блінцы», будавалі пячуркі. Калі ж яны падрасталі, кожны шукаў гульні ў акружэнні свайго полу, хоць характар гульні не мяняўся. Адбываўся пераход да другой узроставай ступені.

***Перыяд дзяцінства*** ў беларусаў пачынаўся з 6–8 гадоў і быў звязаны з пэўным адасабленнем хлопчыкаў ад дзяўчынак. У іх з'яўляюцца адрозненні ў адзенні, гульнях, працоўных занятках. У мінулым стагоддзі існаваў абрад пераходу ад маленства да дзіцячага ўзросту. У кнізе «Простонародные приметы...» М.Я.Нікіфароўскі прыводзіць нам яго апісанне. Да 6–8 гадоў хлопчыкі і дзяўчынкі хадзілі ў доўгай сарочцы. Перад тым як упершыню надзець хлопчыку штаны, а дзяўчынцы спадніцу, у прысутнасці членаў сям'і рассцілалі старыя бацькоўскія штаны для хлопчыка і спадніцу маці для дзяўчынкі. Дзецям прапаноўвалі пераапрануцца. Дарослыя наглядалі за імі.

Вернай прыметай доўгага жыцця лічылі найбольшую ўпорлівасць дзіцяці пры гэтым. Першую спадніцу і першыя штаны, калі яны будуць даношаны, спальвалі. З гэтага часу дзеці атрымлівалі назву «блазнаў»: хлопчык – «блазн», дзяўчынка – «блазноўка», «блазнотка» (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 47).

Аналізуючы заняткі, працу, гульні, а таксама адносіны дарослых да гэтай групы дзяцей, можна заўважыць пэўныя адрозненні паміж 12–14-гадовымі і 6–8-годкамі. Таму мы лічым, што **перыяд дзяцінства мае ў сваю чаргу дзве ўзроставыя ступені**: **«блазноцтва»** – ад 6–8 да 10 гадоў і **пераходны** – да **ўласна падлеткавага** – ад 10 да 12–14 гадоў. Так, у першым толькі пачынаецца адасабленне хлопчыкаў ад дзяўчынак у адзенні, гульнях, працы, у другім – яно завяршаецца. З 12–14 гадоў хлопчыкі выходзяць з-пад апекі маці і больш трымаюцца бацькі, разам з якім выконваюць розныя «мужчынскія» работы па гаспадарцы: зграбаюць сена, косяць, барануюць, працуюць у лесе. Дзяўчынкі-падлеткі могуць рабіць ужо больш складаныя справы: прасці, шыць, ткаць. Гэта азначае падзел працы на «жаночую» і «мужчынскую», якую выконваюць падлеткі ў залежнасці ад полу. Мяняюцца арыентацыі і ў гульнях. Хлопчыкаў больш захапляюць такія, дзе патрабуецца спрыт, сіла, упартасць, дзяўчынак – больш спакойныя гульні.

Дзеці-падлеткі прымаюць пад сваю адказнасць шэраг функцый у хатняй гаспадарцы, у полі, на агародзе і г.д. і выкон-

ваюць іх значна лепш, чым малыя. У гэтым узросце яны нярэдка чуюць папрокі бацькоў за неруплівасць, а таксама часта караюцца за непаслушэнства. Больш за ўсё дастаецца «блазнам», якія «моўчкі бяруць розныя навукі ад бацькоў і старэйшых, моўчкі зносяць розгі і штуршкі» (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 47).

***Юнацтва*** – гэта перыяд жыцця паміж дзяцінствам і сталасцю. Яно пачынаецца з фізічных праяў палавой спеласці і доўжыцца да набыцця чалавекам самастойнасці.

***Ранняе юнацтва*** – гэта пераходны перыяд, які характарызуецца інтэнсіўным ростам і працэсам палавога фарміравання. Калі раней ён пачынаўся ў 16 – 17 гадоў, то зараз акрэсліваецца 11 гадамі для дзяўчынак і 13 – для хлопчыкаў.

Пачаткам палавога выспявання ў юнакоў было з'яўленне «пушка» над вуснамі, ломка голасу і інш., у дзяўчат – першых месячных («рэгулы»). У беларусаў існавала павер'е, што чым раней у дзяўчыны пачнуцца месячныя, тым больш яна будзе мець дзяцей, а таксама што яна будзе любіць мужа і не мець шлюб у цяжар, а дзеці будуць даўгавечнымі (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 47). Ідэалам жаноцкасці лічыліся паўнагрудыя жанчыны. Для гэтага выкарыстоўваліся розныя магічныя прыёмы. Некаторыя з іх прыводзіць М.Я.Нікіфароўскі. Ён піша, што, каб паскорыць рост грудзей, дзяўчынка павінна была больш ужываць у ежу акруглай гародніны: бульбы, буракоў, рэпы, бручкі. Перш чым з'есці, іх трэба было крыху патрымаць за пазухай на голым целе. І абавязковай умовай для дасягнення мэты лічылі асабістае жаданне дзяўчыны, а не па загаду дарослых (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 47 – 48). Як толькі хлопцы жаніліся, а дзяўчаты выходзілі замуж, яны пераходзілі ў разрад ***дарослых***.

Падсумоўваючы аналіз народнага светапогляду адносна ўзроставых ступеней дзяцінства, трэба адзначыць, што ў адпаведнасці з кожнай з іх мяняліся адносіны да дзяцей у сям'і і грамадстве, мянялася і выхаваўчая практыка. Маленства з яго школай пеставання і адноснай бестурботнасцю змяняў перыяд уласна дзяцінства, затым падлеткавы, а потым і юнацкі ўзрост, у якім праца паступова запаўняла жыццё дзяцей. Абрады, наданне імя, пастрыг, пераапрананне і інш. – падкрэслівалі пераход ад адной узроставай ступені да другой.



## ПРАЦЭС ВЫХАВАННЯ Ў НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

Народная педагогіка беларусаў была педагогікай жыцця. Выхаваўчая практыка на працягу многіх стагоддзяў пачыналася з калыскі і была цесна звязана з жыццём і побытам, гаспадарчай дзейнасцю народа, абапіралася на яго жыццёвыя традыцыі. Найбольш цікавыя і карысныя звесткі па народнай педагогіцы беларусаў мы знаходзім у вуснай народнай творчасці, звычаях, дзіцячых гульнях, аналіз якіх дае магчымасць уяўляць асноўныя праблемы народнай педагогікі. Выхаванне ў розных саслоўях і групах мела адметныя рысы. Далей мы павядзём размову аб сялянскай традыцыі выхавання, якая абапіралася на агульначалавечыя каштоўнасці і мела багатыя набыткі.

Можна гаварыць аб народнай педагогіцы як пэўнай галіне ведаў, якія з'яўляюцца вынікам абагульненага погляду беларусаў на выхаванне. Кожны селянін усведамляў ролю выхавання, якое ўплывала на развіццё розуму, волі і характару, стан маралі і неабходнасць навучаць дзяцей з маленства: «Хто дзяцей мае, няхай навучае», «Вучы дзіця, пакуль яно ўпоперак ложка, а не ўздоўж», «Замаладу прывучаць трэба».

Аналізуючы шматлікія фальклорныя творы, можна ўбачыць, што *ідэалам беларуса з'яўляецца ў першую чаргу працавіты, сумленны, добры, гасцінны, фізічна загартаваны і гуманны чалавек*: «Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто для дзела гож», «Добра працуеш — павагу маеш», «Хлуснёй багаты не будзеш», «Лгарствам недалёка зойдзеш», «Нічога, што рукі чорныя, абы душа была чыстая», «Здароўе даражэй за ўсё», «Як здаровы, то і багаты». Такія ж погляды прасочваюцца ў народных казках і песнях, іншых фальклорных творах, дзе добрыя якасці чалавека адзначаюцца як узор для выхавання.

Ідэалам чалавека *лічыўся таксама той, хто імкнецца да ведаў, чалавек разумны і мудры, бо мудрасць, па народным уяўленні, вышэй за багацце і нават за фізічную сілу*: «Розум і сілу перамагае», «Не сілай дзяруцца, а розумам». Таму даць дзецям адукацыю ў народзе лічылася вельмі важнай і неабходнай справай: «Хто вучыцца, той пад старасць не будзе мучыцца», «Не кручаны — не рамень, не вучаны — не чалавек» і інш.

Школьнае навучанне дзяцей у Беларусі да XIX стагоддзя амаль што не праводзілася, за выключэннем дзяцей дваран і багатых гараджан. Што датычыцца навучання вясковых дзяцей, то пачатковыя школы з'явіліся ў вёсцы і атрымалі масавае распаўсюджванне ў другой палове XIX стагоддзя. Праўда, больш заможныя сяляне маглі адправіць сваіх дзяцей для навучання грамаце ў мястэчка або горад. Але і са з'яўленнем школ далёка не кожны сялянскі хлопчык ці дзяўчынка маглі наведваць іх. Частка дзяцей перарывала навучанне ў час палявых работ, калі патрабаваліся рабочыя рукі ў гаспадарцы або трэба было даглядаць малодшых братоў і сясцёр, якіх звычайна нямала было ў сям'і. Большасць сялянскіх дзяцей, што хадзілі ў школу, вучыліся толькі з позняй восені да вясны. Як сведчаць нашы апытанні вясковага насельніцтва Беларусі, нават у пачатку XX стагоддзя хлопчыкі наведвалі школу не болей трох гадоў, а дзяўчынкі — і таго меней.

Цяжкае жыццё беларуса выпрацавала свой погляд на навуку дзяцей. Добра разумеючы каштоўнасць ведаў і вельмі высока ацэньваючы вучонасць, як сведчыць народная творчасць («Вучыцца заўсёды прыгадзіцца», «Чалавеку з вучонасцю ўсюды дарога», «Хто без навукі, той як бязрукі» і г.д.), народ не заўсёды меў магчымасць даць дзецям адукацыю. Умовы сялянскага жыцця XIX — пачатку XX стагоддзя, недахоп школ і іншыя прычыны не дазвалялі вучыць усіх дзяцей у сям'і. Часта навука спынялася, як толькі дзеці навучаліся пачаткам граматы. Але часта з сям'і стараліся вывучыць хоць аднаго, для гэтага патрабавалася шмат сродкаў.

У беларусаў існавала традыцыя запрашаць да сябе хатняга настаўніка — «дарэктара». Гэта быў звычайна хлопчык-падлетак ці юнак, які сам няшмат ведаў і вучыў дзяцей грамаце, як умеў. За «навуку» яго кармілі і адзявалі, зрэдку ён атрымліваў крыху грошай.

У пачатку XX стагоддзя меркаванне, што праца на зямлі — адзіны занятак селяніна, завагалася і дзяцей часцей сталі пасылаць вучыцца, «аддавалі ў навуку» розным рамёствам у мястэчка, бліжэйшы горад або да майстра ў суседнюю вёску, а таксама на «настаўніка», тэлеграфіста ці іншым спецыяльнас-

цям. Атрымаўшы іх, лягчэй было пракарміць сям'ю. Багатыя ж сяляне мелі магчымасць адпраўляць дзяцей у гімназіі, рэальныя вучылішчы і іншыя навучальныя ўстановы.

У XIX стагоддзі ідэалам беларусаў быў чалавек, які змагаўся за сацыяльную справядлівасць. У ім увасабляліся лепшыя рысы народа, ён з'яўляўся героем народных казак, паданняў. Спачатку такім чалавекам выступаў багатыр, потым — казак, пазней — рэвалюцыянер. У савецкі час ідэалам становіцца змагар за новае грамадства. Прыклад для пераймання — «ленінец», «чапаевец», «будзёнавец», «карчагінец», «салдат». Але пастаянным народным ідэалам застаецца чалавек працы. Просты народ заўсёды імкнуўся выхаваць сваіх дзяцей працавітымі, сумленнымі, з добрым сэрцам і маральнымі якасцямі. Такі чалавек, на думку народа, мог моцна трымацца ў жыцці і быць апорай бацькам у старасці.

Трэба адзначыць, што ў мінулым дзеці добра ведалі ***азбуку жыцця***. На іх долю выпадала шмат недзіцячай працы, а нярэдка — і гора. Не з расказаў ці кніжак, а з асабістага вопыту яны спасцігалі і светлыя, і цёмныя бакі жыцця. Рана набывалі дзеці пачуццё адказнасці за свае ўчынкі, усведамленне неабходнасці працы, павагі да бацькоў і старэйшых і клопатаў аб малодшых. Гэта значыць, што працэс сталення адбываўся раней, чым зараз.

Вельмі развітай была ў дзяцей любоў да прыроды. Яна выпрацоўвалася практычна тады, калі сялянскае дзіця непасрэдна клапацілася аб раслінах і жывёлах, штодзённа назірала за прыродай і яе з'явамі, разумела яе і жыва цікавілася ўсім, што было звязана з навакольным светам. Менавіта непасрэдная блізкасць да прыроды, калі можна пагладзіць і пакарміць жарабя, цялятка, кураня, пасадзіць і даглядаць расліны, паволі ўцягвала дзяцей у жыццё прыроды, рабіла іх неад'емнай яе часткай. Ужо з дзяцінства звычкі, паводзіны жывёл і птушак добра знаёмы дзецям. Сам уклад жыцця робіць гэтую сувязь з жывёльным і раслінным светам цеснай і непарыўнай.

П.Баброўскі адзначаў у беларусаў цікавую акалічнасць у выхаванні маленькіх дзяцей. Гэта рана набытая імі асцярожнасць, чаму, на наш погляд, спрыяла вялікая самастойнасць дзяцей, да якой прывучала занятая працай маці. Так, дзіця, пасаджанае на лаўцы ці прыпечку, спакойна сядзіць і рухаецца такім чынам, каб не зваліцца. Сялянскія дзеці не баяліся хатняй жывёлы: яны ўмелі запрагаць каня, падаіць карову, накарміць іншую жыўнасць (Бобровский. 1863. Ч. 1. С. 822).

Любоў да зямлі, да роднага краю фарміравалася з ранняга дзяцінства, якое праходзіла на ўлонні прыроды, дзе быў вядо-

мы кожны кусцік у лесе, кожная купіна ў полі. Чалавек з дзяцінства прырастаў да гэтай зямлі, да людзей, якія жылі побач. У кожнай вёсцы ў дзяцей былі свае любімыя мясціны, дзе наладжваліся гульні, дзе яны ганяліся за матылямі, збіралі кветкі, вадзілі карагоды.

*Асноватворным у народнай педагогіцы беларусаў было выхаванне ў адпаведнасці з прыродай, неад'емнай часткай якой лічыўся чалавек.* У залежнасці ад узросту дзіцяці выкарыстоўвалася і выхаваўчая практыка. Рост і развіццё яго разглядаліся пры гэтым па аналогіі з прыродай. Як расце дрэўца, так расце і чалавек. Прынцып прыродаадпаведнасці прасочваецца ў творах народнай творчасці: у казках, песнях, прыказках, прымаўках: «Гні дрэўца, пакуль гнецца», «Гні галінку, пакуль маладзенька», «Расце, на лес гледзячы» і інш.

Век чалавека ў народнай творчасці мае перыядызацыю ў адпаведнасці з порамі года: дзяцінства — вясна, маладосць — лета, сталасць — восень, старасць — зіма або з гадзінамі дня адпаведна: ранак, дзень, падвячорак, вечар. Таму і выхаванне трэба пачынаць змалку, калі дзіця, як маладзенькае дрэўца, мае пластычную псіхіку, хутка засвойвае ўсё, чаму яго вучаць, і ў гэтым узросце дзякуючы бацькоўскай мудрасці і добрым традыцыям выхавання можна паўплываць на характар дзіцяці, інакш дрэнныя паводзіны ці якасці характару трывала ўкараняюцца і паправіць іх бывае цяжка альбо немагчыма: «Прырода і навуку адалее».

Народная педагогіка з упэўненасцю сцвярджае, што *дзеці павінны выхоўвацца і расці ў сям'і*, бо толькі ў сям'і найлепшыя для гэтага ўмовы: «Без маткі і сонца не грэе», «Без маці, без айца блукаецца, як аўца». Уклад сям'і адпавядае прыродзе чалавека, як і прыродзе ўвогуле. Птушка вырошчвае птушанят, звер — зверанят, расліна дае жыццё парасткам і гэтак усё ў прыродзе знаходзіцца ў згодзе і гармоніі.

Цяжэйшым быў лёс дзяцей, у якіх памерла маці і іх выхоўвала мачаха. Пра сваё жыццё з мачахай, адносіны да падчаркі і пасынка так расказвала адна рэспандэнтка: «Яна была сапраўднай мачахай і з першых дзён узненавідзела мяне з братам. Застаўляла рабіць самую цяжкую работу, увесь час сварылася і скардзілася на нас бацьку. Сваім дзецям яна давала цэльнае малако, а нам напалову разбаўляла вадой. Таму ўвесь час хацелася есці» (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 29). Аналагічны лёс мелі дзеці ў іншых сем'ях. Часта мачасе здавалася, што пасынак або падчарка шмат ядуць. І калі не было бацькі, яна адбірала лыжку са словамі: «Мае дзеці яшчэ па адной з'елі, а ты ўжо пяць...» І пры гэтым яна старалася спачат-

ку пакарміць сваіх дзяцей, а потым падчарку. Тая ўвесь час была галоднай. Мачаха сваім дзецям клала ў торбачку кавалак хлеба і сала, калі яны ішлі ў школу, а падчарка мусіла без абеду ісці сем кіламетраў да школы (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 30). Дзеці, якія выхоўваліся без маці або без бацькі, часцей за ўсё мелі хібы ў выхаванні. У беларускім фальклоры шырока прадстаўлена карціна цяжкага становішча дзяцей, якія жывуць з няроднымі маці або бацькам: «Як у полі асіна — так і сіраціна: яе вецер гне і мачаха б'е», «Хто сіратою не бываў, той і ліха не знаваў» і г.д. Няроднае дзіця, як правіла, адчувала няўтульна сябе ў такой сям'і. Нават калі мачаха і айчым адносіліся да пасынкаў у цэлым добра, заўвагі іх і пакаранні здаваліся дзецям несправядлівымі. Ды і самім бацькам даводзілася помніць аб тым, што ў выпадках, калі для ўласнага дзіцяці можна ставіцца больш строга, для пасынка і падчарыцы такі стыль не прыдатны. Гэта адлюстравана і ў прымаўках: «Сваё дзіця бі — шкадуй, на чужое крычы — думай».

Народная педагогіка беларусаў, дзе адным з асноўных фактараў выступае выхаванне ў сям'і, абавязкам бацькоў лічыць стварэнне ўмоў для фарміравання дзяцей, падрыхтоўкі іх да жыцця: «Умеў нарадзіць — сумей навучыць». Больш таго, народ упэўнены, і не без падставы, што ад таго, якая сям'я, які ў ёй уклад і ўзаемаадносіны, як паводзяць сябе бацькі і іншыя члены сям'і, залежыць выхаванне дзяцей: «Як добрае семя, дык і добрае племя», «Па роду і куры чубатыя». Такім чынам, выхоўвае дзяцей увесь лад жыцця, узаемаадносіны бацькоў і прыклад старэйшых.

Важнейшым выхаваўчым момантам народ лічыў ***прыклад бацькоў***. Яны павінны быць добрым прыкладам маральных паводзін. Дзеці вучыліся, гледзячы на старэйшых, і ўспрымалі «кодэкс» сялянскай маралі. Беларускі этнограф А.Я.Багдановіч падкрэсліваў, што ў народзе высока цанілі выхаванне ў сям'і і разумелі, як яно ўплывае на развіццё розуму і маральнасці, волі і характару, і якая важная роля бацькоў у гэтым працэсе (Богданович. Педагогические... 1886, № 61, 18 ноября).

*Навучанне паводзінам у традыцыйнай сям'і, узаемаадносінам паміж яе членамі адбывалася непасрэдна ў паўсядзённым жыцці*. Якімі вырастуць дзеці і якія тыпы паводзін перанясуць потым у свае сем'і, залежала ад узаемаадносін у бацькоўскай сям'і. У добрай сям'і, дзе быў мір, спакой і згода паміж бацькамі, панавалі такія ж адносіны і паміж дзецьмі.

Да старых — дзядуль, бабуль — на Беларусі як дзеці, так і ўнукі звычайна адносіліся з павагай, пашанай,

прыслухоўваліся да іх парад, заснаваных на вялікім жыццёвым вопыце. Здаралася, што ў некаторых сем'ях старыя былі ў цяжар, таму стараліся не звяртаць асаблівай увагі на іх хваробы, бурчанне і патрэбы. У адной беларускай казцы расказваецца, як дрэнна дачка адносілася да бацькі, нават ежу яму давала асобна ў запечку са старой драўлянай міскі. Толькі тады, калі яна ўбачыла, што маленькі сын майструе такую ж міску, з якой збіраўся карміць яе ў старасці, маці вымушана была змяніць свае адносіны да бацькі.

Аб наследаванні дзецьмі паводзін бацькоў у паўсядзённым жыцці гаворыцца ў многіх вуснапаэтычных творах: «Калі матка ведзьма, дык і дачка зелле знае», «Якая дошка, такая і стружка, якая маці, такая і дачушка». Бацькі павінны былі сачыць за сваімі паводзінамі. Спрэчныя і далікатныя пытанні беларусы імкнуліся вырашаць не ў прысутнасці дзяцей. Асабліва гэта тычылася інтымных адносін. Трэба адзначыць, што імкненне народа да выхавання маральных якасцей у дзяцей ахутвала інтымныя адносіны мужа і жонкі вялікай таямніцай. Больш таго, элементарныя веды аб інтымных узаемаадносінах паміж жанчынай і мужчынам імкнуліся даць як мага пазней, часцей — у юнацкім узросце. Можа, гэта адбывалася і таму, што палавое паспяванне ў XIX стагоддзі пачыналася пазней, чым зараз. Нярэдка дзяўчына выходзіла замуж у 17—18 гадоў і ў яе, як казалі, «не было на рубашцы» (месячных).

У народнай педагогіцы на працягу стагоддзяў існавала няпісанае правіла: *дзеці ва ўсім павінны былі падпарадкоўвацца бацькам*. Народная прыказка «Бацькоўскае слова дарэмна не гаворыцца» якраз і характарызуе гэта. У большасці сем'яў загады бацькоў, асабліва бацькі, не падлягалі абмеркаванню і павінны былі выконвацца дзецьмі абавязкова. Пры гэтым апытаныя адзначалі, што «бацька толькі гляне, і мы ціха выконваем усё, што ён загадаў» (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, адз. зах. 83, л. 14). Большасць прытрымлівалася думкі, што нельга дзецям «даваць патачку», «распускаць». Сялянская мараль ведала сумны вынік у тых сем'ях, якія не прытрымліваліся гэтага правіла: «Дасі дзецям волю, адбярэш долю», «Дай яму волю, дык ён і дзве возьме».

Цікава адзначыць, што ***павага дзяцей да бацькоў і дарослых*** у мінулым была нацыянальнай рысай не толькі беларусаў, але і многіх іншых народаў. А што датычыцца захаванасці гэтай традыцыі, то ў сярэднеазіяцкіх і закаўказскіх народаў яна з'яўляецца нормай і сёння. Абхазцы, напрыклад, гавораць: «Гора таму народу, дзе малод-

шыя не паважаюць старэйшых». Аднак сёння і ў вёсцы, і, асабліва, у сучасным горадзе паважлівыя адносіны да бацькоў існуюць далёка не ва ўсіх сем'ях.

Парушэнне гэтай вельмі важнай для выхавання традыцыі звязана з многімі фактарамі, важнейшым з якіх, на наш погляд, з'яўляецца адасабленне дарослых ад дзяцей у паўсядзённым жыцці. Добрыя ўзаемаадносіны ў сям'і, павага да бацькоў, да старэйшых узнікаюць як вынік выхавання дзяцей у сумеснай працы, калі дзеці працуюць разам з бацькам і маці дзеля стварэння дабрабыту. Так было ў традыцыйнай сям'і.

Звычаёвае права беларусаў, якое патрабавала ад дзяцей павагі да бацькоў і старэйшых увогуле, падпарадкавання іх волі, падтрымлівалася і афіцыйным правам. Калі суд разглядаў сямейныя справы аб спрэчках бацькоў і дарослых дзяцей, то ён выносіў рашэнне аб пакаранні як першых, так і апошніх. Бацькоў – у выглядзе штрафаў і прымусовага царкоўнага пакаяння за дрэннае выхаванне – «давалі патачку», «былі самі прычынай сямейных спрэчак» і г.д. Дзяцей абавязвалі «падпарадкоўвацца старэйшым», прыбягалі пры гэтым да цялесных пакаранняў (Довнар-Запольский. Очерки... 1891. С. 94). Дзеці знаходзіліся пад уладай і кантролем бацькоў да ўступлення ў шлюб, яны не маглі прымаць асабістых рашэнняў, якія змянялі б ход сямейнага жыцця. «Воля бацькі, маці ці старэйшага дзядзькі, увогуле самага старэйшага ў сямействе члена свяшчэнна для ўсяго сямейства, без яго волі нішто важнае не бывае» (Довнар-Запольский. Очерки... 1891. С. 94).

Пры звароце ў суд членаў сям'і, якія не жадалі падпарадкоўвацца волі старэйшага, суд звычайна абавязваў малодшага брата «за ўсім падпарадкавацца і слухацца старэйшага брата, слухацца бацьку, старэйшага сваяка і г.д.» (Довнар-Запольский. Очерки... 1891. С. 76).

*У аснове народнай педагогікі беларусаў былі даволі суровыя адносіны бацькоў да дзяцей, якія селянін лічыў не процівагай бацькоўскай любві, а, наадварот, яе доказам.*

Да нашых дзён у свядомасці народа захавалася перакананне, што любіць дзяцей трэба ў душы, не паказваючы свае пачуцці, бо інакш працэс выхавання не будзе мець добрых вынікаў. Звычайна кіраваліся нормай: «Любі дзіця ў душы, але віду не паказвай». Напэўна, гэты педагагічны ідэал паводзінаў быў запазычаны славянамі з Ветхага завета, дзе адна са старажытных запаведзей Маісея ўстанаўлівала: хто будзе шанаваць сваіх бацьку і маці, таму будзе добра і ён будзе даўгавечным на зямлі. Згодна з запаведдзю Саламо-

на, каго любіць Гасподзь, таго карае і мае ласку да таго, як бацька да сына.

Трэба адзначыць, што народная мараль асуджала рэзкасць і жорсткасць ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей. І тут таксама, на наш погляд, дзейнічае прынцып гуманізму і адпаведнасці прыродзе ў выхаванні. Жорсткасць можа зламаць дзіця. У народзе кажуць: «Як не загнеш маладое дубінкі, то як устарэе — пераломіцца», «Не бі сабаку кіем, бо ён яшчэ больш брахаць будзе». Не адмаўляючы фізічнага пакарання, у народнай мудрасці ўсё ж лічаць яго меней дзейсным, чым павучанне: «Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі!».

Да маленькіх дзяцей бацькі адносіліся асабліва ўважліва і пяшчотна. Іх акружалі любоўю і ласкай. Лічылі неабходным даць тую рэч або цацку, якую патрабаваў маленькі, калі ён плакаў, — пагуляць з ім. Задавальняючы патрэбы маленькіх, з разуменнем адносячыся да іх свавольстваў, разам з тым не стваралі для іх штучных умоў. Лічылася, што трэба загартоўваць дзяцей, выхоўваць іх больш прыстасаванымі да жыцця. Вучылі таксама цярпліва пераносіць боль і іншыя выпрабаванні.

У працэсе выхавання дзяцей амаль у кожнай сям'і выкарыстоўваўся такі сродак, як **фізічнае пакаранне**. Аднак перавагу мела маральнае асуджэнне, вымова або пагроза. Пакаранне рамянём («спражкай»), прутам («бярозавай кашай»), пугай лічылася ў асноўным надзвычайнай мерай. Асцерагаліся біць па галаве, па жываце, а таксама цяжкімі прадметамі, каб не пакалечыць дзіця. У народзе лічылася, што лупцоўка павінна быць адчувальнай, але не шкоднай. Але нават у межах адной сям'і не да кожнага дзіцяці прымянялася фізічнае пакаранне, бо аднаму з іх дастаткова было пагразіць, зрабіць заўвагу, і гарэзнік супакойваўся, а другога мог спыніць толькі пруцік («Адно дзіця баіцца ківа, а другое кія»). Гэта якраз пацвярджае індывідуальны падыход у выхаванні дзяцей, калі ўлічваецца іх характар, узрост, фізічнае і эмацыянальнае развіццё.

*Асаблівую ролю ў выхаванні выконвала маці*. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што пяшчотная любоў маці да сваіх дзяцей — характэрная рыса адносін у сям'і беларусаў. Такая любоў уласціва жанчыне ў большай ступені ў параўнанні з мужчынам: «Дзеці балуюцца ад матчынага блінца, а разумнеюць ад бацькоўскага дубца». Сэрца маці заўсёды баліць аб дзецях, аб іх усе яе думкі і клопаты: «Маці сама не з'есць, а дзіцё накорміць», «Як дзіця плача, маткі сэрца з жалю скача». Маці ніколі не бывае жорсткай з дзецьмі, нават калі злуецца ці сварыцца. У выпадках, калі ў гневе яна і казала

«Каб цябе пранцы ўзялі», «Каб цябе гром забіў», жанчына ціхенька, звяртаючыся да Усявышняга, прамаўляла: «Каб ты не пачуў» (Шейн. 1893. Т. II. С. 513).

У кожнага народа на працягу многіх стагоддзяў склаліся свае сацыяльна-маральныя ідэалы і нарматыўныя ўяўленні аб выхаванні дзяцей і адпаведная ім выхаваўчая практыка. Традыцыйныя нормы, якія рэгламентавалі адносіны дарослых з дзецьмі, мелі «дваісты, амбівалентны характар», бо яны, з аднаго боку, прадпісвалі вельмі клапатлівыя, уважлівыя, спагадлівыя адносіны дарослых да дзяцей і асуджалі жорсткасць ці грубасць у адносінах да іх, з другога — выказвалі даволі нізкую сацыяльную каштоўнасць дзяцей да 6—7 гадоў (Артемова. 1992. С. 18). Пацвярджэнне гэтай думкі можна знайсці ў народнай творчасці: «Да дванаццаці гадоў дзіця чорту робіць работу», «Што ён знае: з носа ды ў рот», «Сем лет, а памяці нет» і інш.

**Строгасць і патрабавальнасць да дзяцей** была традыцыйнай нормай беларусаў. Аднак, характарызуючы розныя сітуацыі і стаўленне бацькоў да ўчынкаў дзяцей, «цярпімасць у адных адносінах часта спалучаецца са строгасцю ў другіх». (Кон. Этнография... 1983. С. 36). Так, калі здараліся бойкі паміж дзецьмі і бацькі знаходзілі, што сын «даваў здачу» або абараняў сястру ці каго іншага, то яны абыходзіліся заўвагай. Калі ж, наадварот, ён быў зачыншчыкам, агрэсіўна сябе паводзіў, то яго чакала пакаранне, у тым ліку і фізічнае.

Часам паміж жыхарамі суседніх вёсак узнікала варожасць. Асабліва ярка яна выяўлялася ў выпадках, калі ў вёсцы жылі нядбайныя людзі, п'яніцы ці хуліганы.

Моладзь і нават дзеці пры сутычках з «чужакамі» вырашалі спрэчкі з дапамогай кулакоў. Цікава, што «зарабіць на абаранкі» можна было, проста парушыўшы межы той або іншай вёскі. Так, сустрэўшы «чужакоў» у лесе за зборам грыбоў ці ягад на тэрыторыі, якая лічылася «сваёй», іх праганялі і нават маглі пабіць. Нельга было купацца, пасвіць скаціну, збіраць лясныя дары на тэрыторыі, якая належала другой вёсцы. Звычай абараняць «сваю зямлю» трымаўся доўгі час у быце беларусаў, спарадычна сустракаецца і зараз.

Да спрэчак і боек дзяцей бацькі адносіліся па-рознаму. У народнай творчасці мы знаходзім выраз «Дзетачкі ў лясачкі, матачкі ў сварачкі», што азначае ўмешванне дарослых ва ўзаемаадносіны дзяцей. І сапраўды, гэта нярэдка было прычынай канфліктных сітуацый паміж суседзямі.

Апытанне людзей старога ўзросту з розных куткоў Беларусі дазваляе гаварыць аб большай трываласці іншага падыходу да вырашэння гэтай праблемы. Так, на скаргі дзя-

цей аб тым, што хтосьці іх адлупіў ці пакрыўдзіў, бацькі адказвалі, што не трэба гуляць з імі, забараняслі хадзіць да іх і г.д. Увогуле скардзіцца бацькам лічылася непрыстойным, і да скаргаў часцей прыбягалі толькі маленькія. У народзе лічылася, што непаразуменні паміж малымі натуральныя і часовыя: «пабіліся — памірыліся» — і звярталі ўвагу толькі тады, калі здаралася што-небудзь сур'ёзнае.

Каб прывіць дзецям агульнапрынятыя маральныя нормы, ім з маленства расказвалі розныя гісторыі з жыцця знаёмых і незнаёмых людзей, з якімі здаралася няшчасце, таму што яны ў сваіх паводзінах непадпарадкоўваліся гэтым абавязковым правілам. Іх запалохвалі пакараннем неба (Бога, які бачыць усё і кантралюе кожны ўчынак чалавека). Дарослыя ў большасці і самі верылі ў гасподняе пакаранне і страх перад ім з маленства перадаваўся дзецям. Запалохваючы непаслухмяных, асабліва маленькіх, гаварылі: «Вось прыдзе «сівы дзед» («мымка», «сабака» і г.д.) і схопіць (з'есць) цябе». Альбо «Божанька ўсё бачыць».

Дзіця, якое плакала і доўга не супакойвалася, нярэдка запалохвалі дамавым, марозам, злымі сабакамі і старымі з торбамі, якія быццам бы ходзяць па дамах і збіраюць капрызных дзяцей. Асабліва хутка супакойвалася яно, калі быў чутны шум ветра, стук акна ці дзвярэй. Дзіця прыслухоўвалася і верыла, што сапраўды нехта страшэнны наглядае за ім, прыйшоў, каб забраць яго, а таму хутка супакойвалася і засынала.

Па традыцыі, каб суцешыць маленькае дзіця, калі яно ўдарылася аб нейкі прадмет, гэты прадмет білі або сварыліся на яго, быццам ён быў жывой істотай. Маці ці нянька з ліку дзяцей біла па стуле, стале, лаўцы і г.д., прымаўляючы, што «яны дрэнныя, бо пакрыўдзілі немаўля», да тых пор, пакуль дзіця не супакойвалася. Пэўны вопыт, які ўтрымліваўся ў папярэджанні, настаўленнях і меў дзейсны ўплыў на дзяцей, прыходзіў да іх з казак, песень, паданняў і інш. Сярод прыёмаў выхавання, у адпаведнасці з прынятымі ў народзе правіламі і этыкетам народнай маралі, было высмейванне дрэнных учынкаў у прысутнасці іншых людзей.

*Паводзіны дзяцей і іх выхаванне* былі саслоўна размежаваны. Калі вясковыя дзеці маглі праводзіць свой вольны час у гурце хлопчыкаў і дзяўчынак, то, згодна з правіламі паводзін у дваранскіх сем'ях, дзяўчынкі маглі гуляць толькі з дзяўчынкамі, і толькі ў межах сада, каля дома. Дзіця падрастала і адпаведна павялічваліся абмежаванні ў зносінах з прадстаўнікамі другога полу.

Непрыстойнымі для дзяцей вышэйшых саслоўяў лічыліся

гульні ў пясочку ці з іншымі рэчамі, у выніку якіх адзенне дзіцяці станавілася брудным. Недапушчальнымі дваране лічылі і гульні, і зносіны сваіх дзяцей з дзецьмі сялян. Веданне дваранскімі дзецьмі жыцця простага чалавека многімі з іх лічылася неабавязковым і нават шкодным.

Важнае месца ў выхаванні дваранскіх дзяцей належала прывіццю ім добрых манер, што было абавязковым для ўваходжання ў сваё сацыяльнае асяроддзе. Гэтым займалася спачатку няня, якая давала першыя ўрокі ветлівасці і акуратнасці, затым гувернанткі прывівалі сваім выхаванцам добрыя манеры і свецкі этыкет. У аснове добрых манер ляжала ўменне заўсёды быць ветлівымі з людзьмі, цярпліва выслухоўваць субяседніка, быць памяркоўнымі, утрымлівацца ад рэзкіх выказванняў пра іншых. Нормы «далікацтва» складаліся з уважлівых, пачцівых адносін да людзей, якія выключаюць і грубасць, і панібрацтва. «Паняцце далікатнасці ў дзіцяці, — піша А.Міцкевіч, — з маленства росцяць...» (Мицкевич. 1985. С. 20).

У сістэме выхавання дзяцей шляхецкага саслоўя ў XVIII—XIX стагоддзях важнае месца належала навучанню паслухмянасці бацькам, павагі да дарослых. У гэтым вялікую ролю адыгрывала рэлігія, дзе абсалютнае паслушэнства лічылася законам, устаноўленым ад Бога. Так, дзеці і нават дарослыя не мелі права без дазволу бацькі сесці. У касцёле сыны павінны былі знаходзіцца побач з бацькамі. У канцы XIX стагоддзя ўжо часцей сустракаліся выпадкі непачцівасці дзяцей да бацькоў, якія «не стыдятся открыто их воле противоборствовать» (Русская женщина. 1895. С. 25). У выкараненні гэтай звычкі шырока ўжывалася фізічнае пакаранне непаслухмяных дзяцей. Звычайна яго ў сям'і ажыццяўлялі з дапамогай плёткі, бізуна. У езуіцкіх і базыльянскіх школах выкарыстоўвалі яшчэ і нагайку (Охотский. 1874. С. 4). Некаторых дзяцей «частавалі» даволі часта і многа — 2—3 разы ў дзень. Разам з тым з ранняга дзяцінства ў шляхціца выхоўвалі пачуццё ўласнай годнасці, гонару дваранскім званнем. А гэта званне патрабавала пэўных паводзін у асяроддзі з роўнымі, гэта значыць у сваім саслоўі, асновай якіх была павага і братэрства, у той час як да ніжэйшага саслоўя адносіліся з пагардай. У пэўнай ступені гэтаму садзейнічала і абыходжанне з дзецьмі слуг, якім пры панскім дзіцяці не дазвалялася садзіцца ці стаяць у шапцы і ўвогуле забаранялася любая фамільярнасць у адносінах да панічоў. З цягам часу пачуццё сваёй выключнасці і гордасці станавілася такім моцным, што, як адзначалі многія дарэвалюцыйныя даследчыкі, стала рысай характару беларускай шляхты, якая «паказвала сваю фанабэрыю перад драбней-

шай шляхтай» і яшчэ больш перад сялянамі (Сыракомля. Вандроўкі... 1992. С. 149). Асноўную масу дваранскага саслоўя складала дробная шляхта, большая частка якой працавала на зямлі і па ладу жыцця і адукацыйнаму ўзроўню нічым не адрознівалася ад сялян (Шейн. 1887. Т. 1. Ч. 1. С. 552).

Дзеці вышэйшага саслоўя выхоўваліся па даволі строгай сістэме. І ў гэтым амаль адзінае падабенства з выхаваннем сялянскіх дзяцей. У адрозненне ад дзяцей сялян, якія працяглы час знаходзіліся побач з бацькамі (спалі ў адным пакоі, разам працавалі і г.д.), дваранскія дзеці жылі ў асобных пакоях і больш часу праводзілі з нянькамі, гувернанткамі, чым з бацькамі. Такім чынам, і жыццё іх праходзіла адасоблена ад бацькі і маці. Маленькіх дзяцей штодзённа прыводзілі да маці і бацькі, каб яны павіталіся або развіталіся. Пасля абеду па традыцыі дзеці павінны былі падзякаваць за абед і пацалаваць руку бацькі і маці. Нікому з дзяцей не дазвалялася гаварыць «ты» ні бацьку, ні маці. Але строгасць у выхаванні дзяцей, якім давалі адчуць, што яны існуюць для бацькоў, а не бацькі для іх, не выключала абавязковых клопатаў аб дзецях і любві да іх.

У выхаванні дваранскіх дзяцей вялікая ўвага надавалася замацаванню пачцівых адносін да дзяўчыны, у прысутнасці якой нельга было вымаўляць ніводнага «смелага» слова. Не заставалася без пакарання нават сумненне ў яе недасягальнасці. Бесцырымоннасці ў адносінах адзін да аднаго ўвогуле не было. Зазнайства лічылася кепскім тонам.

За моладдзю існаваў нагляд з боку старэйшых, сваякоў. Патрабаванні выконваць свае абавязкі, паводзіць сябе належным чынам, а таксама забароны разумеліся самі сабой. У адрозненне ад сучаснасці, дзеці вельмі лічыліся з жаданнямі і звычкамі старэйшых. Маленькім нельга было лезці да старэйшых з пытаннямі. Аднак дзіцячыя эмацыянальныя і інтэлектуальныя патрэбнасці абавязкова задавальняліся.

Калі дзяўчынкі падрасталі, лічылася добрым тонам захапляцца літаратурай, драматычнымі спектаклямі. У многіх дваран меліся багатыя бібліятэкі, якія маглі задаволіць цікавасць любога чытача.

Нельга не адзначыць таксама, што частка беларускай шляхты прытрымлівалася іншага пункта гледжання, звязваючы працэс выхавання сваіх дзяцей з веданнем традыцый жыцця народа. Так, ужо з XVI стагоддзя вядомы **звычай «дзядзькавання»**, калі дзяцей беларускай шляхты аддавалі на пэўны тэрмін на выхаванне ў сялянскую сям'ю з мэтай загартаваць іх фізічна і прывіць ім уласцівыя простаму народу працавітасць, любоў да зямлі, маральную сілу і вынослівасць,

непераборлівасць у ежы і адзенні (Статут. 1588. С. 480). Цікавую ілюстрацыю гэтага звычаю знаходзім у рамане У.Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», дзе галоўны герой Алесь Загорскі са знакамітага шляхецкага роду быў аддадзены ў сялянскую сям'ю Міхаіла Когута, добрага гаспадара, майстра, сумленнага чалавека, на выхаванне на пяць гадоў. У якасці ўзнагароды па сканчэнні тэрміну селянін атрымліваў «пакормнае» і «дзядзькавое». Галоўная мэта «дзядзькавання», як сцвярджае адзін з герояў, — «каб ведалі, як даецца зямля, каб не збэсціліся на сабаку. Аддавалі, бывала, як толькі чатыры гады дзіцяці. А потым, калі возьмуць хлопца зноў у двор, — даюць мужыку пакормнае за тое, што хлопец з'еў, і дзядзькавое, бо ўсе мы як быццам дзядзькі малому, выхоўвалі яго, розуму вучылі» (Караткевіч. Т. 4. С. 18).

Адам Міцкевіч у эпічнай паэме «Пан Тадэвуш» расказвае аб даўнім **звычаі «сынкавання»**, якога прытрымлівалася ўся шляхта. Магчыма, гэта тое ж самае «дзядзькаванне», з той толькі розніцай, што панскае дзіця выхоўвалася не ў сям'і селяніна, а на панскім двары, дзе займалася фізічнай працай гадоў дзесяць да той пары, «пакуль пад носам шчэцце не сплялося» (Міцкевіч. 1985. С. 18).

*Асноўныя веды і навыкі, неабходныя ў жыцці,дзеці засвойвалі на канкрэтных прыкладах, якія штодзённа наглядалі ў сям'і і за яе межамі.* Але разам з тым практыка народа ўтрымлівала і іншыя метады выхавання, такія, як напамінак і прывучанне да пэўных звычак паводзін з мэтай іх замацавання, метад пераканання ў неабходнасці выканання таго або іншага дзеяння, а таксама розныя метады і прыёмы выкаранення шкодных звычак, непажаданых праяў (маральнае і фізічнае пакаранне, пазбаўленне забаў, ежы, грамады аднагодкаў і г.д.). Немалаважнае месца сярод іх займала выкліканне агіды да чалавечых заганаў, такіх, як крадзеж, п'янства, гультайства і інш.

Недапушчальным лічыўся крадзеж дзецьмі рэчаў з дому ці ў каго-небудзь з суседзяў. Тым больш што падобны ўчынак, які станавіўся вядомым у вёсцы, мог замацаваць за злаўмыснікам «славу» злодзея. А ў сялянскім асяроддзі вельмі цанілася добрая слава, ад якой шмат што залежала ў далейшым жыцці: «Калі хочаш прапасці, ідзі красці», «Як украў, то й прапаў». Увогуле кожны клапаціўся аб захаванні добрага імя сваёй сям'і. А таму за ўчынкамі і паводзінамі дзяцей сачылі не толькі бацькі, але і блізкія і далёкія сваякі. Своечасовыя заўвагі, парады, пагрозы і нават пакаранні злаўмыснікаў у большасці выпадкаў давалі свой плён.

У Віленскай губерні існаваў звычай пакарання злодзеяў,

каб на прыкладзе, які выклікае ўсеагульнае асуджэнне, выхоўваць дзяцей і моладзь. Пасля суда старэйшын злодзея вадзілі па вёсцы. Ля варот першай хаты ён атрымліваў адну розгу, потым ля другой, трэцяй... У працэсіі, якая суправаджала гэта судзілішча, удзельнічалі і дзеці, якія слухалі пры пакаранні злодзея павучанні аб тым, што красьці нельга (Киркор. 1858. С. 173). Убачанае глыбока западала ў душу дзіцяці і для большасці з іх было добрым урокам. Акрамя таго, дзяцей бацькі навучалі: «Не руш (не чапай) чужога», бо «крадзеным не разжывешся, а ганьбу мець будзеш».

З першых гадоў жыцця дарослыя фарміравалі ў дзяцей дакладнае ўяўленне аб **сістэме роднасных узаемаадносін** і месцы саміх дзяцей у ёй. Адбывалася гэта паступова ў працэсе кантактаў з блізкімі і сваякамі, якія раней, трэба адзначыць, былі больш цеснымі і трывалымі. Зусім маленькімі дзеці атрымлівалі першыя паняцці роднасці: «бацька», «маці», «брат», «сястра», «дзядуля», «бабуля», «цётка», «дзядзька». Ужо ў малалецтве дзіця ведала такія паняцці, як «братавая» (жонка брата), «дзевер» (брат мужа), «дзядзіна» (жонка дзядзькі), «нявестка» (жонка сына), «пасёстра» (дваюрадная сястра, стрыечная сястра) і што ўсе яны звязаны агульнай назвай «радня» (кроўная радня). Падлетак ужо добра арыентаваўся ў больш складаных паняццях, такіх, як «род», і нядрэнна ведаў, якія асобы належаць да блізкай радні, а якія да больш аддаленай («сваякоў»). Такім чынам, засвойваючы словы, якімі вызначаўся кожны член сям'і і сваяк, дзеці даведваліся, якімі павінны быць адносіны да кожнага з іх. Так, дзецям гавораць: «Гэта твая маці, яна клапоціцца пра цябе, а ты павінен паважаць, слухацца яе і дапамагаць» ці «Гэта твая сястра, яна цябе няньчыла і ты павінен абараняць яе, дзяліцца з ёй усім, сябраваць» і г.д.

Кожнае сялянскае дзіця засвойвала правілы адносін да бацькоў, братоў, сясцёр, дзяцей, цётак, бабуль і дзядуль, асноўнае месца ў якім займала павага, паслухмянасць, дапамога, клопат. Галоўным у маральным кодэксе беларусаў былі ўзаемныя абавязкі блізкіх членаў сям'і адзін да аднаго.

Такім чынам, цесныя сямейныя сувязі ў мінулым спрыялі веданню дзецьмі ўсіх членаў свайго роду: і сваякоў, і далёкіх продкаў, аб якіх яны даведваліся ад маці, бабулі, калі тыя пераказвалі сямейныя паданні, успаміналі аб мінуўшчыне і людзях, якія некалі праславілі або зняславілі яго, зрабілі нешта карыснае, цікавае або дрэннае. Вядома, што часцей героямі паданняў і расказаў былі добрыя, цікавыя, таленавітыя і ўмелыя людзі.

З ранніх гадоў дзяцей навучалі правілам паводзін у гра-

мадстве і дома. Існавалі пэўныя забароны, парушэнне якіх заўжды асуджалася. Бацькі вучылі дзяцей саступаць адзін аднаму, калі яны сварыліся паміж сабой. У прысутнасці дарослых павінны былі размаўляць ціха, не крычаць. Не дазвалялася ім умешвацца ў размову дарослых. І калі ў гэты час узнікала патрэба звярнуцца да каго-небудзь з пытаннем, дзіця павінна было дачакацца канца размовы.

Народная традыцыя забараняла дзецям з'яўляцца ў пакой ці замінаць дарослым у час прыёму гасцей.

Згодна з правіламі, сялянскія дзеці пры ўваходзе ў хату чужых людзей, а ў асобных выпадках і пры з'яўленні бацькі, павінны былі забрацца на палаці і там ціха гуляць (Шейн. 1902. Т. III. С. 6). Пачцівасць і ветлівасць у адносінах да старэйшых, нават незнаёмых, выяўлялася ў тым, што дзеці называлі іх «дзядзькамі» і «цёткамі». Уваходзячы ў хату ці выходзячы з яе, дзверы трэба было зачыняць павольна, не стукаць імі. Непрыстойным лічылася размахванне рукамі ў час размовы, размаўляць у час яды і г.д.

Да сённяшняга дня на вёсцы захавалася традыцыя вітацца з кожным, нават з незнаёмым чалавекам.

Цікавым з'яўляецца і пытанне аб тым, як звярталіся адзін да аднаго ў сям'і. Маленькіх дзяцей звычайна называлі ласкавымі імёнамі: Манечка, Сцёпачка і г.д., «блазнаў» — часцей за ўсё Сашка, Валька, Манька, а ўжо ў юнацтве, пачынаючы з 16 гадоў, — поўным іменем: Марыя, Сцяпан, Іван і г.д.

Што датычыць звароту дзяцей да бацькоў, то, як адзначаюць шматлікія даследчыкі і апытаныя, часцей быў распаўсюджаны зварот на «вы»: «Вы, матуля», «Вы, тата, татка», а таксама да дзядуль і бабуль: «бабуля», «баба», «дзед», «дзядуля». Увогуле зварот дзяцей да старэйшых на «ты» ў большасці мясцовасцей Беларусі лічыўся надзвычайнай грубасцю. Аднак існаваў зварот і на «ты», які быў таксама нормай паводзін, як, напрыклад, на Случчыне.

У асяроддзі аднагодкаў дзеці называлі сябе і іншых па імёнах: Галька, Валька, Валодзька, а калі ішла размова аб тых, хто адсутнічаў, да ўласнага імя дадавалася не прозвішча, а імя бацькі, маці, у выпадку адсутнасці іх — дзеда ці бабулі. І гучала гэта прыкладна так: Галька Мікітава, Пецька Андрэеў. Калі хто з бацькоў меў мянушку ў вёсцы, то ў якасьці прыстаўкі ўжывалася яна: «Віцька Гарбузоўкін» і г.д.

Звычка даваць адзін аднаму мянушкі здаўна бытуе ў дзіцячым асяроддзі. Напэўна, яна ідзе ад дарослых. Дзецям вельмі падабаецца надзяляць мянушкамі сваіх сяброў, хоць не кожная задавальняе таго, хто яе атрымаў. Асабліва гэта датычыць насмешлівых, абразлівых мянушак, у якіх

падмечаны пэўныя фізічныя недахопы, рысы характару ці асабістыя якасці. Бывалі і анекдатычныя выпадкі, калі хтонебудзь з сябрукоў вельмі трапна і ярка мовіць слова, якое стварала пэўны вобраз. Іншы раз мянушка замацоўвалася за чалавекам на ўсё жыццё, нават, як пісаў М.В.Гогаль, «пойдзе яму ў род і патомства».

Сярод мянушак, якія даваліся раней і зараз, распаўсюджаны тыя, што ўтвораны ад імён і прозвішчаў, назваў розных жывёл, птушак, рыб, прадметаў, прымет быту і ладу жыцця. У XIX стагоддзі даволі часта сустракаліся мянушкі па імені ці прозвішчы далёкага продка або дзеда, бабы, маці ці бацькі, а таксама па роду заняткаў.

Пазашлюбных дзяцей і ў вясковай грамадзе, і ў дзіцячым асяроддзі называлі байструкамі, бенкартамі, бэнсямі, самасейкамі, бязбацькавічамі і г.д. Назва «бенкарт» — незаконнае дзіця («не чистого ложа», па сведчанні І.Лапо) сустракаецца ў Статуце Вялікага княства Літоўскага. Ім лічылася не толькі дзіця, прыжытае з другой жанчынай (у шляхты), але і дзеці, якія пры жыцці бацькі не былі прызнаны сваімі (Лаппо. 1901. Т. 1. С. 249). І абражалі іх значна часцей, робячы такім чынам «казламі адпушчэння». Нярэдка іх і шкадавалі. Як адзначаў М.Улашчык, у слянскім асяроддзі жорсткасць у адносінах да пазашлюбных дзяцей і маці-адзіночак не была характэрнай. Ён апісвае эпізод, калі сялянская грамада гуртам збудавала хату для такой жанчыны, якая была пазбаўлена бацькоўскага дому з-за нараджэння дзіцяці без бацькі (Улашчык. 1989. С. 72).

Цяжка было такой маці гадаваць дзіця, бо нярэдка сям'я адварочвалася ад яе. А тая невялікая плата на ўтрыманне, якую яна антрымлівала па рашэнні валаснога суда, дазваляла толькі зводзіць канцы з канцамі. Нярэдка здаралася, што даведзеная да адчаю маці падкідвала сваё дзіця ў чужую сям'ю. У Гродзенскай губерні штогод у розных месцах знаходзілі па восем падкідышаў (Бобровский. 1863. Ч. І. С. 556). Вядомы і выпадкі забойства дзяцей.

Як сведчаць статыстычныя матэрыялы, у горадзе выпадкаў нараджэння «байстуркоў» было значна больш, чым у паветах (прыкладна ў пяць разоў). У сярэдзіне мінулага стагоддзя пазашлюбныя дзеці ў Гродзенскай губерні, напрыклад, складалі 2,4 працэнта ад агульнай колькасці (Бобровский. 1863. Ч. І. С. 555).

*Большасць беларусаў верылі ў Бога і гэтую веру імкнуліся перадаць сваім дзецям.* Яны свята верылі, што менавіта ён «стварыў свет і ўсіх істот і кожнаму з іх даў сваю долю» (Шейн. 1902. Т. III. С. 13). У фальклорных творах, асабліва ў прыказ-

ках і прымаўках, яскрава прасочваюцца фатальныя адносіны да лёсу, які не зменіш і не мінеш, таму трэба змірыцца з гэтым: «Як суджана, то не міне», «Ад ліхой долі нідзе не ўцячы» (Прыказкі... 1976. Кн. 2. С. 419, 422). Разам з тым у народзе жыла, хоць і слабая, вера ў тое, што ад самога чалавека нярэдка залежыць яго лёс, доля: «Куй сам сваю долю». Пачуццё рэлігійнасці выхоўвалі з ранняга дзяцінства. Кожны на шыі абавязкова насіў крыжык. Дзяцей вадзілі ў царкву на ўсе рэлігійныя святы, а ў больш набожных — і ў іншыя дні. Калі дзіця пазяхала, маці хрысціла яму рот. Амаль з калыскі прывучалі дзяцей хрысціцца, малітвам пачыналі вучыць даволі рана — на 4–6-м годзе жыцця.

У дзяцей з шляхецкіх сямей «першымі словамі былі малітвы, якія пераймаліся ад маці» (Охотский. 1874. С. 3–4). Крыху пазней іх вучылі катэхізісу, а ў 9–10 гадоў хлопчыкаў аддавалі ў езуіцкія ці базыльянскія школы.

У заходніх раёнах Беларусі, якія вылучаліся большай рэлігійнасцю насельніцтва, дзяцей раней навучалі малітвам. Кожны год перад Велікодным святам дзеці хадзілі да споведзі (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 69, л. 11).

*Міласэрнасць*, як важную якасць чалавека, фарміравалі ў сям'і на прыкладах адносін да жабракоў, якіх у народзе лічылі «божымі людзьмі». Калі жабракі заходзілі ў сялянскую хату, гаспадары стараліся гасцінна прыняць, давалі цёплае месца на печы, прадукты харчавання (хлеб, бульбу, крупы, яйкі і г.д.), а таксама жыццёва неабходныя рэчы (лён, палатно, пяньку і інш.) (Романов. Очерк быта... 1890. С. 121). Жабракі, якія збіралі міласціну каля царквы, касцёла, атрымлівалі з рук дарослых і дзяцей грошы, ежу. Пры гэтым дзеці набывалі наглядныя ўрокі міласэрнасці. Нярэдка ўпартых і несупынных дзяцей пужалі, што «аддадуць у павадыры», гэта аблягчала ўпраўленне імі.

У народзе заахвочваўся ўдзел ў працы дзяцей з ранняга ўзросту. У сялянскім уяўленні «ўсе павінны працаваць», абумоўлівалі традыцыю паступовага прывучэння да працы з дзяцінства з мэтай выпрацоўкі звычкі да яе.

Дзеці, як спадкаемцы бацькоў, па народных уяўленнях, павінны былі набыць пэўныя веды і навыкі ва ўсіх відах дзейнасці: агратэхнічных, матэматычных, метэаралагічных, батанічных, медыцынскіх, выхаваўчых, будаўнічых, прыгатавання ежы і іншых бытавых справах, утрымання хатняй жывёлы, птушкі. Засвойвалі дзеці гэтыя веды і навыкі на практыцы. Бацькі паказвалі, як выконваць розныя работы, застаўлялі дзяцей удзельнічаць у пасільнай працы. Метэаралагічныя веды і навыкі здабываліся шляхам штодзённых назіранняў за з'явамі прыроды, тлумачэннем дарослых.

З сістэмай мер вагі, агародніцтва і іншых сельскагаспадарчых работ дзеці знаёміліся праз навучэнне і ўдзел у працы. Яны вучыліся берагчы жывёл, лячыць іх, здабываць лекавыя расліны і карыстацца імі. Маральныя вывады заўсёды рабіліся з канкрэтных жыццёвых сітуацый, і ў гэтым таксама прасочваецца мудрасць народнай педагогікі.

Ранняе ўключэнне дзяцей у працу, як мы ўжо адзначалі, цесна звязана з педагагічным ідэалам народа — выхаваць працавітага чалавека. У сялянскіх сем'ях малым хлопчыкам і дзяўчынкам даручалі аднолькавую работу. Працаваць пачыналі з пяці гадоў.

Нягледзячы на тое што дзеці падпарадкоўваліся волі бацькоў, яшчэ ў XIX стагоддзі працягвала існаваць замацаванае за імі законам права асабістай маёмасці, здабытай сваёй працай. У асноўным такое права мелі дарослыя дзеці — юнакі і дзяўчаты, якія выраблялі на продаж і атрымлівалі грошы за рэчы або прадукты, галоўным чынам з лішкаў. Так, юнакі прадавалі зробленыя імі драўляныя, плеценыя, ганчарныя і іншыя вырабы, дзяўчаты — ніткі, палатно, лён, каноплі, лішкі гародніны, малочных прадуктаў, грыбы, ягады, арэхі і г.д. (Довнар-Запольский. Очерки... 1891. С. 104).

У мяшчан дзеці мелі ваю долю — «атарыцу» ад продажу малака і агародніны, а таксама ад сабраных у лесе ягад, грыбоў і г.д. (Дембовецкий. 1882. Кн. I. С. 612). Вядома, што не ўвесь прыбытак ішоў на асабістыя патрэбы, бо пэўную частку яго аддавалі ў сямейную касу. Атрыманыя грошы захоўваліся ў маці на пасаг дачцы і набыццё маёмасці для жаніцьбы сына. Маці выдаткоўвала гэтыя грошы толькі пры ўступленні ў шлюб, і фактычна дзеці не маглі карыстацца імі да гэтага часу.

У вясковых дзецях уражвае перш за ўсё прыродная кемлівасць, практычнасць і глыбокае веданне жыцця. У размове яны заўсёды знаходзяць вострае слова, удала карыстаюцца прыказкамі і прымаўкамі, якія чуюць з ранняга дзяцінства і добра ведаюць. Дзеці шчыра вераць у тое, што сэнс, закладзены ў іх, адпавядае жыццёвым сітуацыям і з'яўляецца бясспрэчнай ісцінай. Яны не толькі карыстаюцца імі, але і ўспрымаюць з іх мараль, бо большасць народных выслоўяў якраз і мае чыста маральную мэту.

П.Баброўскі пісаў: «Беларусы, не ведаючы таго, што яны беларусы, захавалі і ў штодзённай мове, і ў песнях, і ў прыказках свае пэўныя, нацыянальныя, лагічныя формы, свой дух, свой пэўны характар, свае норавы, свае звычаі... Здзяйсняючы ўсе свае хрысціянскія абрады, быццам бы несвядома, беларус, ці то праваслаўны ці каталік, мае сваё перака-

нанне, сваю маральную філасофію і перадае ўсё гэта разам з мовай сваім дзецям і ўнукам» (Бобровский. 1863. С. 147).

*Менавіта з фальклорных твораў дзеці атрымлівалі простыя і разам з тым найбольш важныя для жыцця веды* аб з'явах прыроды, узаемаадносінах чалавека з навакольным светам, паміж блізкімі (у сям'і) і аднавяскоўцамі, суседзямі і г.д. Народная творчасць утрымлівала ў сабе павучанні, назіранні, якія вучылі любіць працу і працаўніка, цаніць усё, што здабывалася працай, захоўваць навакольнае асяроддзе, выхоўвалі павагу да зямлі. Педагагічныя ідэі, якія закладзены ў кожным творы, развівалі знаходлівасць, уменне пераадольваць цяжкасці.

Вядомы этнограф С.Ф.Рысінскі ў прадмоўі да «Любчанскага зборніка прыказак» падкрэсліваў ролю прыказак у выхаванні: «...з вострых народных слоўцаў кароткім шляхам зведваюць і тлумачаць прыроду рэчаў, фарміруюць норавы, атрымліваюць павучальныя звесткі аб сумесным жыцці людзей...» (Антология. 1986. С. 91).

Маці або бабуля ўжо з маленства малым пелі песенькі.

Каб яны навучыліся хутчэй размаўляць, выкарыстоўвалі з народнай творчасці вершы, скорагаворкі, дражнілкі, лічылкі, якімі яны карысталіся з задавальненнем.

Для традыцыйнай народнай педагогікі, як мы ўжо адзначалі, характэрна «**школа пешчання**», якой надавалася вялікае значэнне, бо яна пэўным чынам уплывала на фізічнае і псіхічнае здароўе дзіцяці, удасканальвала вобразнае мысленне і была першай школай музычнай адукацыі. Галоўным момантам яе было закалыхванне. У беларусаў здаўна склалася багацейшая песенная культура з вялікай разнастайнасцю калыханак, якія добра ведала кожная сялянка, дзякуючы трансмісіі народнага вопыту з пакалення ў пакаленне. Традыцыйныя навыкі закалыхвання набываліся з дзяцінства, калі маленькая нянька спявала пачутыя ад маці ці бабулі калыханкавыя песні (у ролі нянькі было амаль кожнае сялянскае дзіця).

Рэпертуар калыханак залежаў ад здароўя дзіцяці, сацыяльнага статусу (барскія, незаконнанароджаныя, казённыя), а таксама ўзросту і настрою нянькі, яе ўмення спяваць і ведання пэўнай колькасці калыханак.

Спявалі калыханкі не толькі для таго, каб закалыхаць дзіця да сну, заспакоіць і зберагчы такім чынам яго фізічнае і псіхічнае здароўе, але і вызваліць для сябе пэўную частку часу для адпачынку. Перш чым пець калыханку, трэба было даць немаўляці грудзі ці цёплае малако (зрэдку з макам), соску («сусолку») і потым, калыхаючы люльку, маці ці нянька ў рытм ёй спявала песні. Калыханка, як правіла, мела заспакойваючую мелодыю,

якая паўтаралася і садзейнічала хуткаму засыпанню.

Нянька спявала калыханкі, у якіх прысутнічалі страшныя персанажы (накшталт Бабы Ягі, Зюзі і інш.).

У калыскавых песнях — заспакойваючых, закалыхваючых — маці мякка і шчыра спявала аб радасці і горы, аб будучым дзіцяці — шчаслівым і радасным. У песнях-калыханках маці жадае дзіцяці здароўя, дабрабыту, шчасця, добрай долі, спявае пра тое, як яно вырасце і будзе радасцю для бацькоў і ўцехай ім, а таксама абаронцам сям'і, сваякоў і людзей увогуле. Калыханкі знаёмілі дзіця з навакольным светам, пашыралі яго ўяўленне аб жыцці. Тут і коцік — бархатны жывоцік, паўнаўладны жыхар кожнага сялянскага дома — першы аб'ект нагляданняў дзіцяці. Дзіця вучыцца любіць жывёл. У калыханках ён малюецца як істота, якая водзіць дружбу з маленькімі, клапоціцца пра іх: прыносіць піражок, булку, можа закалыхаць дзіця і г.д. Акрамя таго, у калыханках пра коціка ёсць элементы маралі і яны павучальныя. Яркімі фарбамі маляваліся вынікі дурных учынкаў і супрацьпастаўляліся ім дабрачыннасць (Шейн. 1887. Т. I. С. 31):

Пайшоў каток на таржок,
Купіў сабе піражок
І табачны ражок,
І сеў на калодзе
У добрай выродзе:
І табачкі занюхаў,
І добрых людзей паслухаў.

У беларусаў, як і ў многіх іншых народаў, пра гэта ўжо падрабязна расказвалася, крадзеж лічыўся адной з самых страшэнных заган. І перасцярога ад яго, навучэнне чэснасці пачыналася з самага ранняга дзяцінства. Ужо ў калыханках маці расказвала дзецям, што чалавек, які бярэ чужое, — дрэнны і асуджаны на ўсеагульную пагарду. Тое ж адносіцца да лянівага, нядбайнага чалавека. Такім чынам, дзякуючы калыханкам дзіця спасцігала асновы маральнага «кодэксу» селяніна. З ростам дзіцяці паступова ўскладняліся і песні, што пела маці.. У іх з'яўляюцца фальклорныя вобразы жывёл і птушак, якіх дзіця, падрастаючы, назірае на двары, у полі, на лузе, у лесе. Тут і голуб — сімвал прыгожага, узвышанага; тут і куры з куранятамі — сімвал клапатлівай маці і ўтульнай сям'і; тут і хітрая ліса. Пазнанне навакольнага асяроддзя ішло, як пазней у школе: ад простага да складанага, ад вядомага да менш вядомага. Пры гэтым маці тлумачыла незразумелае і такім чынам пашыралася свядомасць дзіцяці, набываліся элементарныя веды аб жыцці.

*Вялікую ролю ў выхаванні дзіцяці адыгрывала калыска* — яго дом. На ўсё жыццё чалавека застаюцца прыемныя ўспаміны пра яе. У калыханках створаны цудоўны вобраз немаўляці, якое спачывае ў калысцы, яго ахінае сон, дрымота — гэтыя лепшыя памочнікі маці. І для калыханак яна не шкадуе фарбаў. У народнай творчасці яны маляваліся ў выглядзе чалавекападобных істот, што ахоўваюць дзяцей, закалыхваюць іх.

У калыханках расказваецца пра ўяўленні народа аб шчасці, дастатку, якое магчыма было толькі ў мары. Паспытаўшы ў асабістым жыцці цяжар нястачы, маці ў калыханцы жадае свайму дзіцяці здароўя, дабрабыту. У калыханках шмат любві, пяшчоты, жыццёвай мудрасці, выказана філасофія сялянскага жыцця.

**Музычнае выхаванне**, у працэсе якога вучылі адчуваць прыгажосць народных напеваў, спяваць, пачыналася з маленства.

Першае знаёмства з музыкай і песняй адбывалася, як мы ўжо адзначылі, праз калыханкі. З узростам гэта знаёмства пашыраецца і становіца больш разнастайным. Дзеці слухаюць маці, іншых членаў сям'і ў час выканання хатніх спраў — за кудзеляй, за кроснамі, а таксама ў святочныя дні: у час розных каляндарных і сямейных святаў, у якіх і самі дзеці прымаюць удзел.

Улетку яны маюць магчымасць, напрыклад, «пайграць» на лістках дрэва, трымаючы іх паміж вялікіх пальцаў. Гукі, падобныя на птушыны свіст, атрымліваліся, калі дзьмуць у трысняговую трубачку, трубачку гусінага пяра. Незвычайныя гукі атрымліваліся пры крананні нацягнутай ніткі, адзін канец якой трымаўся зубамі, другі — нацягваўся рукой.

Адсутнасць спецыяльных музычных інструментаў дзеці папаўнялі за кошт самаробрных пішчыкаў, якія выраблялі з пер'яў, саломы, трыснягу і тонкіх ствалістых раслін. У раслінных трубачках прарэзвалі пяць дзірачак і атрымліваліся «пішчыкі», «пасвірэлкі», дудачкі, на якіх можна было іграць, атрымліваць мелодыі. Звычайна іх рабілі вясной з гладкага і роўнага лазняку, калі кара дрэва лёгка аддзялялася. Гэты немудрагелісты музычны інструмент, які выдаваў незвычайна прывабныя гукі і вельмі шанаваўся дзецьмі, быў амаль у кожнага вясковага хлопца.

Больш складаныя самаробныя музычныя інструменты — «жалейкі», «скрыпкі», «балалайкі» сустракаліся радзей і іграць на іх маглі толькі асобныя, здольныя дзеці.

*У засваенні духоўных каштоўнасцей велізарную ролю адыгрывала мова.* Праз мову ўсведамлялі, што — добра, што — зло. З першых дзён яна гучыць у хаце, і дзіця з калыскі вучыцца роднай мове, засвойвае новыя словы праз калыханкі, забаўлянкі, пяшчотныя словы маці і, урэшце, праз размовы ўсіх

членаў сям'і. Цікава, што нават дзеці шляхты з дзяцінства ведалі беларускую мову, на якой гаварылі нянькі, хатняя прыслуга, а таксама сяляне, што працавалі ў маёнтку на сельскагаспадарчых работах. У XIX стагоддзі беларуская мова шырока ўжывалася ў асяроддзі шляхты, асабліва дробнай — «засценкавай», «аколічнай» (Пыпин. 1892. Т. IV. С. 59).

Менавіта праз родную мову з пакалення ў пакаленне перадаваліся духоўныя набыткі, якімі карысталася кожнае наступнае пакаленне. Сама па сабе мова з'яўлялася скарбніцай, у якую народ складваў сваё духоўнае багацце. І засваенне народнай мовы — гэта засваенне народнай душы, культуры і ведаў, духоўнае далучэнне да таго вялікага цэлага, імя якому — народ (Каптерев. 1982. С. 225). Уражлівая дзіцячая натура разам з народнай паэзіяй калыханак, казак убірала ў сябе чыста народны светапогляд, павер'і і г.д., якія западалі ў душу і выхоўвалі здольнасць разумець народнае жыццё. Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца вялікі Пушкін, якога, дарэчы, выхоўвала і пеставала няня Арына Радзівонаўна — беларуска па паходжанні.

Такім чынам, у выхаванні сям'я як інстытут сацыялізацыі дзяцей была першай школай, дзе яны спасцігалі ўрокі эмацыянальных зносін, роднай мовы і мыслення, вучыліся гульні, засвойвалі навыкі самаабслугоўвання і працы, арыентацыі ў навакольным асяроддзі. Пяці-шасцігадовыя дзеці ўжо ведалі правілы паводзін і этыкету і карысталіся імі. Комплекс ведаў, сацыяльных норм і правіл, засвоеных у сям'і, дзеці пашыралі і замацоўвалі пры ўзаемаадносінах з аднагодкамі, у асяроддзі шматлікіх дваюрадных і траюрадных братоў і сясцёр, а таксама суседскіх дзяцей.

У сям'і закладваўся трывалы падмурак прафесійнай арыентацыі чалавека. За ўзор дзіця звычайна бярэ бацькоўскія паводзіны, якія механічна паўтарае і ўзнаўляе. Першасным этапам сацыялізацыі дзяцей можна лічыць навучанне іх будучым сямейным ролям. Усяму таму,што складае абавязкі, хлопчыкі вучацца ад бацькі, дзяўчынкі — ад маці. Адбываецца гэта ў працэсе жыцця, пачынаючы з маленства. Прыклад узаемаадносін, як правіла, потым пераносіцца ў іх уласную сям'ю.

Згодна з выхаваўчым ідэалам беларусы імкнуліся залажыць у дзяцей працавітасць, чэснасць, дабрыню, фізічную загартаванасць. Гэтаму садзейнічала народная мудрасць. Асноўным сродкам выхавання ў народнай педагогіцы з'яўлялася праца.

Выхаваўчая практыка абапіралася на высокі аўтарытэт бацькоў, дысцыпліну, строгае выкананне правіл і норм паводзін у сям'і і грамадстве, глыбокай павазе дзяцей да бацькоў і дарослых.



# ВЫХАВАННЕ ПРАЦАЙ

Як ужо адзначалася, выхаванне адносін да жыцця, навакольнага асяроддзя ішло праз працу і ў працы. Працоўныя абавязкі, якія ўскладваліся на дзяцей, былі розныя ў залежнасці ад іх узросту, дабрабыту сям'і, колькасці дзяцей у ёй і іншых абставін.

У час прыгону малалетнія дзеці павінны былі збіраць у лесе грыбы, ягады, арэхі і іншыя дары прыроды для патрэб панскай сям'і і для сваёй. Выкарыстоўвалі іх і на паляванні ў якасці загоншчыкаў зайцоў, цецерукоў, перапёлак. Ускладваліся на дзяцей і іншыя абавязкі: збор у лясах буралому (разам са старымі), прыбіранне дарог, збор камення на палях і іншыя працы (Никифоровский. Очерки... 1894. С. 31—32).

Дзеці пасвілі птушак (курэй, качак, гусей і г.д.), цялят, свіней, коз і іншых хатніх жывёл і неслі адказнасць перад бацькамі, суседзямі за шкоду, якую нярэдка рабіла жывёліна ці птушка пасевам. Дзіцячай справай было надраць лыка альбо нарэзаць лазы для вырабу лапцей, кошыкаў, іншых рэчаў сялянскага побыту. У доўгія зімнія вечары заняткам дзяцей было драць пер'е для падушак — праца манатонная і стамляючая.

Акрамя догляду за малодшымі братамі і сёстрамі дзеці з сямі гадоў мелі абавязак карміць хатнюю жывёлу: парасят, цялят. Павінны яны былі аберагаць агарод ад патравы птушак, насіць ваду з калодзежа або рэчкі, абеды тым, хто працаваў у полі або на лузе (часцей гэта выконвалі дзяўчынкі). Хлопчыкі павінны былі пасвіць коней. Апошняе вельмі падабалася ім, бо нярэдка збіраліся яны даволі вялікімі гуртамі, да 30 чалавек (Сборник... Вып. III. 1903. С. 89).

«Пастухоўскі век» пачынаўся з сямі гадоў (Шейн. 1902. Т. III. С. 10). Спачатку хлопчыкі і дзяўчынкі («блазны») пасвілі свіней, коз, пазней — кароў, коней. Гэты ўзрост пра-

цягваўся да 13 гадоў, пасля чаго месца «пастухоў» займалі малодшыя, а падлеткі прывучаліся да працы ў полі, на лузе, агародзе. Хлопчыкі былі памочнікамі бацькі, асвойваючы «мужчынскія» работы па гаспадарцы, дзяўчынкі — «жаноцкія» разам з маці.

У асобных сем'ях буйную рагатую жывёлу пасвілі нават малыя дзяўчынкі і хлопчыкі, і не толькі сваю, а яшчэ і суседскую. Так, у Віцебскай губерні (Гарадоцкі павет, в. Канашы), па ўспамінах старой жанчыны, за тое, што цэлае лета яна 6-гадовай дзяўчынкай пасвіла скаціну суседзяў, бацькі атрымалі пуд жыта (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 7, л. 9).

Дзяцей, якія не слухаліся бацькоў, не жадалі вучыцца гаспадарчым справам або дрэнна выконвалі іх, пужалі, кажучы, што аддадуць у пастухі («свінням хвасты круціць», «панскі двор недалёка — у пастухі возмуць») (Никифоровский. Очерки... 1898. № 2. С. 119). Пастухоўства лічылася непрыстыжным заняткам. Нават маючы сваіх дзяцей, сярэдні селянін, па словах М.Я.Нікіфароўскага, стараўся наняць пастуха. Тым больш, што гэта было даступна па сродках і проста з-за вялікай колькасці бедных сямей, вымушаных аддаваць сваіх дзяцей у наём, каб мець хоць невялікі заробак. Наймалі для гэтай справы дзяцей 10 — 15 гадоў на тэрмін ад «Вялікадня да Змітраўкі» (з сакавіка па канец кастрычніка) (Никифоровский. Очерки... 1898. № 2. С.119).

Дзеці-пастушкі добра ведалі грыбныя і ягадныя месцы. Дары лесу значна дапаўнялі іх харчовы рацыён. Акрамя таго, грыбы і ягады збіраліся для сямейнага стала, а таксама назапашваліся на зіму. Збіралі пастушкі і лекавыя расліны, якія былі адзіным надзейным сродкам лячэння сям'і.

Пастухі і падпаскі ў вольную часіну, калі скаціна скубла траву ці ў спякотны дзень адпачывала каля вады, займаліся пляценнем розных рэчаў: лапцей, кошыкаў, капелюшоў з лазы і саломкі, рабілі цацкі, дудачкі з дрэва і чароту, складвалі венікі і г.д. Дзяўчынкі-пастушкі плялі паясы, вышывалі. Як адзначаў М.Я.Нікіфароўскі, пастухі з'яўляліся ледзь не адзінымі вытворцамі запасных лапцей (Никифоровский. Очерки... 1897. С. 185). Сучаснікі штодня маглі бачыць пастуха з перакінутай цераз плячо пугай або кійком, на якім трымалася пара-другая лапцей ці зграбны кошык — выраб яго працавітых рук.

Пастушкам і падпаскам прыходзілася пасвіць скаціну і ў холад, і ў дождж. Большасць з іх не мела добрай вопраткі і абутку, а адсутнасць пашавых угоддзяў вымушала ганяць скаціну ў лес, на балоты і г.д. А.Сержпутоўскі, апісваючы побыт пастухоў, адзначаў, што яны нярэдка стаяць па калена ў

гнілой, стаячай балотнай вадзе і гразі цэлы дзень з ранняй вясны да позняй восені (Сержпутовский. Очерки... 1908. Ч. 5. С. 3). Пагэтаму і здароўе ў іх, як правіла, было дрэнным. А плата за працу складала ад 5 капеек за выпас авечак да 10—25 капеек за адну карову ў пашавы перыяд (Шейн. 1902. Т. III. С. 103).

Аднастайнай была ежа, якую клалі ў пастушкову торбу: хлеб, некалькі халодных бульбін, кавалачак сала, яйка, бутэльку малака. А рабочы дзень пастуха самы доўгі — ад усходу да заходу сонца. Свежае паветра спрыяла развіццю апетыту, які не магла задаволіць такая ежа. Таму пастушок шукаў і знаходзіў яе ў прыродзе. Гэта і смачныя пукі шчаўя, і лясныя арэхі, і ягады. Пастушкі гулялі ў розныя гульні — каменьчыкі, косці, хованкі, каталіся з узгоркаў, скакалі або гралі на дудачцы, жалейцы ці ражку.

Дзеці-пастушкі прыносілі карысць сям'і, бо не толькі часткова забяспечвалі сям'ю харчаваннем, але і давалі невялікі прыбытак. Хлопчыкі-падлеткі ганарыліся гэтым, як, напрыклад, галоўны герой у паэме Я.Коласа «Сымон-музыка»:

Ён цяпер глядзеў больш стала:
Ён — асоба, пастушок,
Нават права меў на сала
І на цёплы кажушок.

Пасвілі дзеці і коней. Гэтую працу хлапчукі любілі: яна была і лягчэйшай, і цікавейшай. Коней звычайна путалі (путамі) і яны пасвіліся на пашы смірна. Акрамя таго, на конях можна было пакатацца, калі ехалі пасвіць або вярталіся з пашы.

Трэба сказаць, што праца на кані была ўлюбёнай справай сялянскіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Звычайна гэтую справу давяралі дзесяцігадовым і крыху старэйшым дзецям. «Павознікі», як іх называлі, заўсёды ўдзельнічалі ў «помачах» (талака) у час летніх палявых работ. Ім вельмі падабалася ездзіць у «поразных калёсах» (Никифоровский. Очерки... 1893. № 2. С. 117), самастойна кіруючы канём, у поле да «скідэляў» саломы ці сена і з нагружаным возам вяртацца дахаты. Кожны з іх стараўся прыехаць першым, бо апошніх («зацялёпых») чакалі насмешкі таварышаў. Больш таго, «зацялёпы» не вячэралі разам з усімі, бо вымушаны былі вартаваць запрэжаных коней (Шейн. 1887. Т. I. Ч. 1. С. 202). Гэтая справа заўсёды дзручалася дзецям, бо дарослым хапала клопату падчас летняй пары. Гэтая традыцыя захоўвалася аж да 70-х гадоў нашага стагоддзя, калі ў працы і асабістай гаспадарцы ўдзельнічалі дзеці, асабліва ў летні час.

У народзе лічылася за шчасце, калі сына ўдавалася аддаць на панскі двор у «кухарскую навуку». Як пісаў вядомы беларускі пісьменнік М.Гарэцкі, якога ў дзяцінстве якраз і ўладкавалі на работу да пана, народ кіраваўся меркаваннямі, што гэта «лепей, чым ганяцца за свінямі ля статку ці быць у мястэчку жыдоўскім ваданосам» (Гарэцкі. У панскай... 1922, 25 сак.). Праўда, каб трапіць у маёнтак, трэба было навучыцца размаўляць «па-панску». Няпроста было спраўляцца і з працай на кухні, дзе хлапчук, які прывык да міскі, мог «прызвычаіцца да беленькай талеркі, не пабіўшы яе шмат разоў» (Гарэцкі. У панскай... 1922, 25 сак).

Дзеці-падлеткі дапамагалі маці ў хатняй працы. Узімку, калі жывёла была на стойлавым утрыманні, ёй трэба было парыць шмат бульбы. Дзецям даручалася выцягнуць яе са склепа, памыць і засыпаць у чыгун («саган»). Пасля таго як маці даставала з печы параную бульбу, злівала ваду і высыпала ў карыта, трэба было патаўчы яе таўкачом, удыхаючы пары, клубы якога напаўнялі памяшканне. Дарэчы, у народзе ведалі лячэбныя якасці пароў тоўчанай бульбы і выкарыстоўвалі іх у лячэбных мэтах. Напрыклад, добра дапамагала яна і пры цыстытах (захворванне мачавога пузыра). Пры гэтым хворага заварочвалі ў коўдру або дзяругу і некалькі хвілін трэба было стаяць над парай.

Хлопчыкі з 13–14 гадоў выконвалі больш складаную работу: аралі, баранавалі, пачыналі касіць.

Дзяўчынак з 7–8 гадоў прывучалі прасці, спачатку самы горшы лён («асмычыны»). Калі яны больш-менш навучаліся гэтай справе, ім давалі лепшы лён, які трэба было прасці ўжо не верацяном, а калаўротам. Кужаль (самыя тонкія ніткі з добрага лёну) пралі з 16–17 гадоў. Прасці пачыналі з восені і на працягу ўсёй зімы, каб задаволіць патрэбы сям'і ў адзенні і вопратцы. У дзяўчат прадзіва было звычайнай справай. Каб было не сумна, збіраліся на «папрадкі», «папрадухі» ў каго-небудзь з сяброўак. У гэтым узросце дзяўчатам трэба было наткаць палатна і для пасагу.

З 12 гадоў, а то і раней, дзяўчынак прывучалі жаць. Гэта была вельмі цяжкая праца, якая доўжылася па 13 гадзін. Жалі босыя, колючы ногі аб іржышча, амаль не разгінаючыся.

У сенакосную пару шмат працы было ўсім. Дзеці і падлеткі разбівалі пакосы, зробленыя бацькам і старэйшымі сынамі, варочалі сена два-тры разы ў дзень, складвалі ў копы. Потым звозілі яго. Вознікамі часта былі хлопчыкі (з 10 гадоў). Стоячы на возе, яны падхоплівалі віламі сена, раскладвалі яго і ўтрамбоўвалі.

Бедныя сем'і нярэдка вымушаны былі аддаваць сваіх дзяцей у «парабкі». Аплочвалася іх праца па дамоўленасці: у канцы года ці на працягу працы. Заробленыя грошы звычайна аддавалі бацькам. Добра адпрацаваўшы ў гаспадара, парабкі маглі акрамя заробку атрымаць і падарункі: кавалак сала, кілбасы, сыр і г.д. Жылі яны ў гаспадара на поўным забеспячэнні жыллём, ежай, адзежай і абуткам. Вядома, гэта былі не абновы — бялізна з саматканага палатна, зашмальцаваны кажух, старыя боты і інш. Спалі на кухні або на лаве ў хаце, летам — у гумне. Елі звычайна разам з гаспадарамі, за выключэннем свят ці калі ў хаце былі госці. Тады парабкаў кармілі асобна. Гаспадароў яны называлі на «вы» або «пан», «пані». За год парабак мог атрымаць 35—40 рублёў, дзеці-парабкі — 25—28 рублёў.

У XIX ст. сяляне (Мінская губ.) акрамя працы на пана штотыднёва два дні з канём і адзін — без каня адбывалі так званыя згоны (шэсць дзён у год з душы) — надзвычайныя выхады на працу (сенакос, жніво і г.д.) усяго працаздольнага насельніцтва, у тым ліку і дзяцей з 12 гадоў (Улашчык. 1989. С. 18). Дзеці дапамагалі бацькам у будаўніцтве і рамонце дарог, мастоў, а таксама ў выплаце пану дані, у якую акрамя сельскагаспадарчых прадуктаў (жыта, аўса, яек, птушкі і інш.) уваходзіла і пэўная колькасць напрадзенага лёну (Улашчык. 1989. С. 18).

М.В.Доўнар-Запольскі, характарызуючы ўдзел дзяцей у працы ў залежнасці ад узросту і полу, пісаў: «Дзеці з ранніх гадоў выконваюць тыя або іншыя гаспадарчыя абавязкі, і чым менш сям'я, тым раней сялянскі падлетак знаёміцца з суровай працай. З пяці гадоў дзіця няньчыць сваіх маленькіх братоў і сясцёр, з сямі-васьмі — ён ужо пастух, ідзе за возам і інш., з 12 гадоў для хлопчыка пачынаюцца першыя практыкаванні ў земляробстве: ён зграбае сена, барануе, з пятнаццаці гадоў бярэцца за цэп, касу, а яшчэ гады праз два і за саху, так што да 20 гадоў ён ужо хлебароб, які прайшоў усе акадэмічныя курсы сялянскай гаспадаркі. Дзяўчына да 16—17 гадоў ведае жаночыя работы. Вядома, што інтэнсіўнасць працы падлеткаў цалкам залежала ад складу і эканамічнага становішча сям'і (Довнар-Запольский. Очерки... 1891. № 1. С. 103).

Вельмі важнымі для сялян былі промыслы і рамёствы, без якіх не абыходзілася жыццё беларуса. Усе мужчыны звычайна ўмелі цяслярыць і сталярыць і навучалі гэтай справе сыноў, каб яны спачатку маглі зладзіць лаўку, стол, зэдлік і іншую простую мэблю для хаты, а затым збудаваць і абсталяваць гаспадарчыя пабудовы.

Падлеткам даручалі прынесці ў рэзгінах сена, салому,

канюшыну або «трушанку». Гэты корм жывёле звычайна насілі з гумна ці з адрыны. Гародніну (бульбу, буракі, рэпу, моркву і г.д.) насілі ў кошыках з лазы ці з тонкіх яловых каранёў. Для жывёлы яе секлі секачом (сечкай) у карыце ці начоўках, збітых з тоўстых дошак.

Да 18 гадоў кожны юнак і дзяўчына ўмелі выконваць усе работы і маглі поўнасцю, калі трэба, замяніць дарослых, бацькоў. Хлопец мог зрабіць сам барану, саху, калёсы, сані, пабудаваць хату.

Дзяўчына добра прадзе, тчэ, умее шыць сарочкі і спадніцы ці парткі для мужчын. Некаторыя дзяўчаты могуць вязаць кручком карункі, якімі потым упрыгожвалі рушнікі, настольнікі, каўняры, насоўкі і іншыя рэчы хатняга ўжытку. Што датычыць верхняга адзення, то сшыць яго маглі толькі асобныя жанчыны і дзяўчаты, звычайна сяляне заказвалі яго краўцам.

Прыгатаванне ежы заўсёды лічылася чыста жаночай справай. Дзяўчынку ў сям'і навучалі гэтаму яшчэ з дзяцінства, каб у будучым яна магла стаць добрай гаспадыняй. Яна павінна была ведаць, якіх і колькі браць прадуктаў, як іх апрацоўваць, калі ставіць у печ, як падаваць, запраўляць і шмат чаго іншага. Навуцы гатаваць ежу звычайна вучыла маці, бабуля ці хто іншы з членаў сям'і. Набыць уменне добра, ашчадна гатаваць было няпроста, бо, нягледзячы на цяжкае становішча шматлікай сялянскай сям'і, кухня беларусаў была вельмі багатай і разнастайнай і амаль кожная гаспадыня ведала сакрэты прыгатавання некалькіх дзесяткаў страў.

Маці павінна была навучыць дачку не толькі прыгатаванню смачнай ежы (каб у норме былі закладзены прадукты і соль, каб не трапіў выпадкова ў яе вугалёк ці саломіна, пруцік ці нітка), але і каб яды хапіла на ўсіх, каб яна была гатова ў час. Посуд трэба было трымаць у чысціні. Пасля снедання, абеду і вячэры вымыць яго. З печы даставалі гаршчок з цёплай вадой і мылі ўсе міскі, кубкі, лыжкі, гаршкі і чыгуны. Посуд пераварочвалі і ставілі на спецыяльную лаўку каля печы, гаршкі і чыгуны нярэдка падсушвалі ў цёплай печы.

Пэўнае месца ў працы дзяцей займалі хатнія справы. Цікава, што сяляне мала клапаціліся пра чысціню падлогі, лічылася гэта дробяззю, не вартай увагі, і хоць яе абавязкова вымяталі раз ці некалькі ў дзень, мылі рэдка. Зімой кожны, хто ўваходзіў у хату, змятаў снег венікам у сенцах або на ганку, але на абутку ён усё ж заставаўся і на падлозе ўтвараліся лужыны. Восенню немагчыма было «адбіцца» ад гразі, якая прыліпала да ботаў і яе заносілі ў хату.

Самая вялікая ўборка, калі вымяталі кожны вугал, знімалі

павуцінне, выцíралі пыл і чыста мылі падлогу, была перад Велікодным святам. Абавязкова бялілі печ і столь, скрэблі сталы, лаўкі, зэдлікі. Гэтую працу выконвалі звычайна дзяўчынкі.

Пачынаючы з 20-х гадоў XX стагоддзя дзеці побач з дарослымі працавалі спачатку ў камунах, а потым у калгасах і саўгасах і атрымлівалі за сваю працу не больш 10 – 25 працэнтаў сярэдняга заробку калгасніка, які складаў 25 рублёў у месяц (Шашалевич. 1930. С. 32). Крыху больш атрымлівалі падлеткі. А працаваць прыходзілася летам па 10 гадзін, у іншыя поры года — 8 гадзін.

Як бачым, праца была трывалым падмуркам народнай педагогікі. Менавіта праца і адносіны да яе займалі важнае месца ў жыцці беларусаў і ў XX ст. Уласная гаспадарка і зямля, у залежнасці ад колькасці едакоў у сям'і, атрыманая сялянамі пасля рэвалюцыі, патрабавала прыкладання і дзіцячых рук. У канцы 20-х гадоў акрамя ўласнай гаспадаркі працавалі і ў калгасе. Дзецям давяралі розную працу, але асабліва патрэбны былі іх рукі ў час сяўбы, касьбы, жніва і ўборкі розных культур. Летам у калгасе працавалі амаль усе дзеці, пачынаючы з 9 – 10 гадоў, а некаторыя і раней.

Хлопчыкам, як і заўсёды, вельмі падабалася працаваць на конях. Каб атрымаць такую магчымасць, трэба было разам з бацькамі раніцай ісці «на нарад» (сход), калі брыгадзір размяркоўваў працу на дзень. Дзеці з задавальненнем запрагалі выдзеленых ім коней, каб звозіць сена з луга або снапы з поля. Хлопчыкі спаборнічалі паміж сабой, хто болей зробіць ходак. У час дзённага адпачынку яны звычайна, папалуднаваўшы наспех, на конях ехалі да рэчкі, возера ці сажалкі, дзе купаліся і гулялі з сябрукамі.

Дзяўчаты разам з маці працавалі на лузе ці ў полі: грэблі і варушылі сена, укладвалі яго на калёсы. Даволі цяжкай і маруднай была праца на жніве з сярпом ў жнівеньскую спякоту, тым больш што трэба было яшчэ выконваць норму. Ад працы на выбарцы лёну балелі рукі. У асобных калгасах кожнаму вучню трэба было адпрацаваць у калгасе не менш 50 працадзён (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 83, л. 7). І за ўсё гэта ў канцы года яны маглі атрымаць пуд зерня і 1 – 2 вазы саломы (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 83, л. 7).

Трэба сказаць, што сялянскія дзеці не цураліся ніякай працы. Бо высокім было разуменне нялёгкага жыцця, з нястачай, недаяданнем і жаданне дапамагчы бацькам аблегчыць яго. Таму ўсе дзеці з ахвотай працавалі і ва ўласнай, і ў калектыўнай гаспадарцы. Прычым у калгас на працу «бегалі наперабой» (там жа, л. 5). Часцяком падлеткам, якія працавалі ў

калгасе, давалі працоўныя кніжкі. Як адзначалі амаль усе апытаныя жыхары незалежна ад мясцовасці, акрамя фізічнай сілы яны мелі яшчэ сілу духа, добры душэўны настрой, таму на працу і з працы ішлі з песняй. Сёння гэта ўспрымаецца неяк непрывычна, бо цяжка ўявіць стомленых працай людзей, якія яшчэ спяваюць прыгожыя песні.

У пасляваенныя гады вясковыя дзеці дзялілі з дарослымі турботы па аднаўленні сельскай гаспадаркі, будаўніцтву жылля і г.д. Многія юнакі і падлеткі вымушаны былі выконваць работы, якія пад сілу былі толькі сталым мужчынам, большасць якіх загінула на вайне. Жанчыны з дапамогай дзяцей будавалі новыя хаты. А для гэтага трэба было ў лесе нарыхтаваць шмат бярвёнаў, якія потым звозілі на каровах (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 12). І рабілі гэта паўгалодныя і паўраздзетыя дзеці, якія харчаваліся ў асноўным хлебам з мякінай, з жалудамі, папаратнікам і інш., ад чаго часта балелі жываты. А ад сцюжы не ўратоўвалі старыя кажушкі, світы, мерзлі ногі, абутыя ў лапці (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 83, л. 45).

Традыцыя ранняга прывучэння да працы сялянскіх дзяцей і сёння жыве ў вёсцы. Гэта патрабуе і вясковае жыццё з яго клопатамі і шматлікімі работамі. Таму нават маленькія дзеці павінны прыбраць у хаце, прыгледзець птушку, нарваць травы і выканаць шмат якіх абавязкаў. У залежнасці ад узросту дзеці рабілі розныя працы па гаспадарцы.

Такім чынам, дзеці з маленства ў вёсцы засвойваюць каштоўнасці традыцыйнага ладу жыцця, сярод якіх галоўнымі з'яўляюцца праца, сям'я, дом, бацькаўшчына.



# УМОВЫ ЖЫЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ

Дзеці складаюць асобую дэмаграфічную групу ў грамадстве, якая вылучаецца і асаблівасцямі побыту. Вядома, што кожная наступная ступень жыццёвага цыкла чалавека звязана з папярэдняй. Дзяцінства – пераходны перыяд да дарослаці і тут асаблівую цікавасць уяўляе працэс ўздзеяння сацыяльна-культурнага асяроддзя на фарміраванне ў дзіцяці працоўных навыкаў і ўмення, станоўчых маральных якасцей, якія дазваляюць ўзнаўляцца ў новых пакаленнях грамадства. А гэта ў сваю чаргу шмат у чым залежыць ад умоў жыцця і традыцый народа, што існавалі ў пэўны гістарычны час. Безумоўна, у побыце назіраюцца таксама рэгіянальныя і сацыяльныя адрозненні, і іх веданне дае ключ да разумення культуры і псіхалогіі народа ў цэлым.

Аналіз побыту дзяцей XIX – XX стагоддзяў немагчымы без ведання ўмоў іх жыцця, сістэмы харчавання, лячэння, гігіены, асаблівасцей адзення. Мы таксама рагледзім, як праводзілі вольны час дзеці кожнай узроставай катэгорыі.

**Харчаванне.** Найбольшыя адрозненні ў ежы дзяцей і дарослых існавалі і існуюць у перыяд ранняга дзяцінства. Як і ў большасці іншых народаў, у беларусаў адзінай ежай немаўлят было малако, а калі дзіця крыху падрастала, для яго гатаваліся асобныя стравы (праўда, не ва ўсіх сем'ях) з лепшых прадуктаў, якія дарослым не заўсёды траплялі на стол.

У першыя месяцы жыцця ежа мела асаблівае значэнне, бо ад яе якасці і колькасці ў многім залежала здароўе немаўляці. Статыстыка сведчыць, што менавіта ва ўзросце да года з-за нездавальняючых санітарна-гігіенічных умоў і парушэнняў у сістэме харчавання ў XIX стагоддзі наглядалася найбольшая смяротнасць дзяцей, асабліва ў сялянскіх сем'ях. У Чавускім

павеце Магілёўскай губерні вядомы звычай даваць немаўляці сок сырога бурака, першы чым прыкласці яго да грудзей. Гэта быццам бы служыла перасцярогай ад грыжы, якая здаралася часта ад дзіцячага крыку (АІМЭФ НАНБ, спр. 70, л. 3; Бараноўскі. 1928. № 8–9. С. 60).

У Беларусі, па традыцыі, маці кармілі грудзьмі дзяцей да паўтара-двух гадоў, а некаторыя і болей. У гэтым узросце дзіця ўжо добра размаўляла і ўсё разумела. П.В.Шэйн апісваў, як дзіця само прыносіла ўслончык і прасіла маці: «Дай мне цыцкі пассаць!» (Шейн. 1902. Т. III. С. 76). Па расказах старажылаў з розных куткоў Беларусі, пачутых мною ў экспедыцыях, дзеці ўжо саромеліся гэтай сваёй звычкі і стараліся, каб у гэты момант іх ніхто не бачыў. Бралі маці за руку і вялі ў хату ці іншае схаванае ад чужых вачэй месца.

У сем'ях дваран і багатых гараджан самі жанчыны пазбягалі кармлення грудзьмі і звычайна наймалі для гэтай справы карміліцу — маладую здаровую жанчыну з прыгонных сялян, якая карміла сваё і панскае дзіця ад нараджэння да года. Праз шэсць месяцаў іх пачыналі прыкормліваць. У багатых сем'ях у параўнанні з сялянскімі была значна большая магчымасць ужываць лепшыя прадукты і ў дастатковай колькасці. Акрамя таго, знаёмства з заходнееўрапейскай кухняй, пэўныя веды аб укладзе жыцця, харчаванні дзяцей дазвалялі рабіць яго больш паўнацэнным і правільным, аб чым сведчыць і значна меншая смяротнасць і колькасць захворванняў сярод дзяцей вышэйшых саслоўяў (Бараноўскі. 1928. № 8–9. С. 50).

Трэба адзначыць, што кармленне дзяцей грудзьмі пасля года было хутчэй сімвалічным, чым кармленне ў поўным сэнсе слова. Пазней недахоп мацярынскага малака дзецям кампенсавалі за кошт іншых прадуктаў — давалі ім стравы, якія гатаваліся ў сям'і.

У перапынках паміж ежай маленькім давалі «сусолку» («сусла», «кукла») з жаванага чорнага хлеба, бульбы, проса, пячэння або перніка. Такое кармленне дзяцей захавалася да 20-х гадоў XX стагоддзя і нават пазней. Гэта мела і адмоўныя вынікі. З аднаго боку, «сусолка» служыла суцяшэннем маленькіх, з другога — яна, спачатку пажаваная іншымі членамі сям'і, у тым ліку і старымі з карыёзнымі зубамі, мноствам мікробаў, спрыяла заражэнню дзіцяці, што часта заканчвалася трагічна (Витебские... 1898, № 142, 28 лістап.).

Калі ж груднога малака не было або не хапала, пачыналі прыкормліваць на 4–6-м месяцы, тым больш што згодна з народным звычаем, лічылася неабходным як мага раней прывучаць маленькіх да іншага харчу. Сялянкі давалі сваім дзецям

малако каровы, казы, зрэдку — малако авечкі, пры гэтым звычайна яго не кіпяцілі. Прыкладна з паўгода ў рацыён маленькіх уваходзілі малочныя кашы (манная, грэцкая, аўсяная і інш.), у якія клалі растопленае масла і зверху залівалі малаком. У бедных сем'ях нярэдка гатавалі замест кашы «кармушку» (накшталт кашы): у вадзе разварвалі маленькія кавалачкі хлеба. Ад яе ў дзяцей часта здараліся расстройствы страўніка. Прыкормлівалі, па сведчанні апытаных, таксама і супамі, баршчамі, кісялём, кампотам (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 3).

Кашы, супы, баршчы, у якія клалася менш тлушчу і больш малака, гатавалі далёка не ва ўсіх сем'ях. Большасць сялянак не разумела неабходнасці іх спажывання. Была яшчэ адна страва, якую рабілі спецыяльна для маленькіх, з узбітага яйка і малака (зараз яна называецца амлетам). Яе гатавалі для дзіцяці з шасцімесячнага ўзросту, а некаторыя і раней. Гэта страва лічылася карыснай для дзяцей.

Трэба адзначыць, што сялянкі інтуітыўна правільна прытрымліваліся думкі аб неабходнасці даваць у раннім узросце дзецям больш вараных, печаных і сырых прадуктаў, пазбягаючы смажаніны, небяспечнай для дзіцячага страўніка. Так, вельмі карысным (і не без падставы) сяляне лічылі салёнае сала, якое давалі маленькім. Зараз вядома, што дзякуючы наяўнасці ў ім фаліевай кіслаты яно добра засвойваецца арганізмам.

Каб прарэзванне зубоў праходзіла лягчэй, маленькім давалі сухарык ці костачку, якія служылі ім свайго роду бавай, заняткам. Гадавалыя дзеці грызлі моркву, бручку, бурак і нават бульбіну. Сырая гародніна была важнай крыніцай вітамінаў і іншых карысных рэчываў.

Аднак некаторыя маці-сялянкі і самі кармілі малалетніх дзяцей сырой гароднінай і садавінай, якую звычайна нават не мылі. Трэба адзначыць, што прадукты харчавання і для дзяцей, і для дарослых у той час наогул рэдка ацэньваліся па гігіенічных правілах. Дзяцей прывучалі есці ўсё без разбору («Ешце ўсё, што даюць», «Пуза — не зеркала, што ні з'еў, нічога не бачна») (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 40). І гэта лічылася нормай. Адсюль дызентэрыя і іншыя хваробы, якімі часта хварэлі ў сялянскім асяроддзі. Першым сродкам пры глістах лічылі гарэлку. Яе давалі нават маленькім. Гэты спосаб лячэння дайшоў да нашага часу. У пасудзіну налівалі крыху гарэлкі і прапаноўвалі дзіцяці мачаць у яе хлеб альбо крыху выпіць. Здаралася, як сведчаць апытанні вясковага насельніцтва, дзіця так «намачаецца» яе, што, ап'янеўшы, зваліцца пад стол (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 42).

Як адзначалася, важнае месца ў харчаванні дзяцей займала малако. Яно з'яўлялася асноўным прадуктам харчавання немаўлят. Акрамя таго, з малака рабілі розныя прадукты, патрэбныя для дзіцячага харчавання: масла, смятану, тварог, сыроватку. Частка яго ішла на так званыя «бялёныя», «забеленыя» стравы, калі ў супы (яшневы, пярловы, грэцкі, бульбяны, а таксама з бручкі, морквы, лапшы) дабаўлялі крыху малака за некалькі хвілін да гатоўнасці або пры падачы на стол. «Бялёныя» стравы характэрныя для нацыянальнай кухні беларусаў. Яны мелі паўсямеснае распаўсюджванне і былі любімымі стравамі, звычка да якіх выпрацоўвалася на працягу многіх стагоддзяў.

Малако і малочныя прадукты багатыя кальцыем, вітамінамі, бялкамі і таму садзейнічаюць развіццю дзіцячага арганізма. Трэба, аднак, сказаць (гэта падкрэслівалі і ўсе даследчыкі і апытаныя старажылы), што большасць сялянскіх сем'яў вымушаны былі абмяжоўваць спажыванне такіх важных малочных прадуктаў, як масла, тварог, смятана. Частка іх ішла на продаж для атрымання сродкаў на набыццё іншых рэчаў, аплату падаткаў, аброку. Таму гэтыя прадукты лічыліся прысмакамі як для дзяцей, так і для дарослых.

Харчаванне дзяцей увогуле залежала ад заможнасці сям'і. У бедных, як сцвярджае прымаўка, «часам з квасам, а парою з вадою». Асабліва не хапала дзецям прадуктаў жывёльнага паходжання, багатых бялкамі і іншымі неабходнымі рэчывамі, а таксама рыбы. Апошняя часцей трапляла ў ежу ў мясцовасцях, багатых на рэкі і азёры.

Сала і мяса ў чыстым выглядзе часцей за ўсё, нават у серадняцкай сям'і, спажывалася на вялікія святы. Толькі на Каляды, Вялікдзень дзеці маглі ласавацца living рознымі стравамі са свініны (кілбасы, кумпяк), а таксама гусей, качкай, курыцай ці баранінай.

Асновай харчавання як дарослых, так і дзяцей усіх узростаў, акрамя немаўлят, быў хлеб і бульба. Улетку шырока ўжывалі ў ежу вырашчаную гародніну: капусту, буракі, агуркі, моркву, бручку, цыбулю. Тыя, хто меў сад, у дастатку спажывалі яблыкі, грушы, слівы. У харчаванне дзяцей у летні час дабаўляліся сабраныя ў лесе чарніцы, суніцы, буякі, журавіны і іншыя ягады, а таксама грыбы.

Хлеб пяклі раз у тыдзень. Час ад часу, калі дазваляў дастатак, маці толькі для дзяцей пякла булкі. У Гродзенскай губерні, напрыклад, гэта былі «гусачкі» (у выглядзе птушкі), а таксама фунтовыя булачкі (Шейн. 1902. Т. III. С. 67). Дзеці ў гэты дзень круціліся каля маці і з нецярпеннем чакалі, калі атрымаюць ад яе кавалачак гарачага духмянага хлеба.

Выпякалі яго звычайна на дубовых ці кляновых лісцях, якія надавалі хлебу апетытны своеасаблівы пах. К канцу тыдня хлеб станавіўся крыху чэрствым, але і яго елі з задавальненнем. Улюбёнай ежай дзяцей быў чорны хлеб з нацёртай часнаком скарынкай ці проста пасыпаны соллю. Яго выпрошвалі ў маці ў перапынку паміж ежай. Выключэнне рабілі толькі для маленькіх і «блазнаў», астатнія павінны былі чакаць абеду, падвячорка ці вячэры. Вельмі падабалася дзецям бульба «ў мундзірах», да якой (не ў пост) жарылі скваркі, яешню або давалі «камсу» (ількі). Ачышчаную ад шалупіння бульбу нярэдка мачалі ў соль. З бульбы гатавалі «картапляную кашу» («камы», тоўчаная бульба і г.д.), якую запраўлялі таплёным салам ці смажанымі скваркамі, дабаўлялі крыху малака, зрэдку — смятану, а потым ставілі ў печ. Яна пакрывалася румянай смачнай коркай, якую заўжды аддавалі дзецям. Да гэтай кашы на стол ставілі міску з сыраквашай ці па кубку малака. У пост кашу запраўлялі тоўчаным макам і да яе гаспадыня падавала салёныя агуркі, памідоры, грыбы, капусту.

У сялянскай кухні ў XIX — сярэдзіне XX стагоддзя вельмі часта выкарыстоўвалі адвараную бульбу, якую лупілі адразу за сталом у час ежы або раней, калі з яе рабілі «камы», «тоўчаную бульбу», пяклі праснакі ці гатавалі іншыя стравы (Никифоровский. Очерки... 1895. С. 47). Печаная бульба лічылася прысмакамі у дзяцей. Такую бульбу маці гатавала «па заказу» дзяцей. Пяклі яе і самі дзеці ў вогнішчы, калі пасвілі скаціну на полі, у лесе ці проста ў вольны час.

Бульбяныя клёцкі (шарыкі з дранай бульбы) лічыліся таксама прысмакамі. Іх гатавалі ў выглядзе забеленага супу або падсмажанымі з салам на патэльні.

Сапраўдным святам лічылі дзень, калі маці гатавала дранікі («драчаны») ці «бабку» («картапляная бабка») у чыгунку ў печы. Часам у сырую таркаваную бульбу для бабкі дабаўлялі пшанічную муку і запраўлялі дробна нарэзаным і падсмажаным салам з цыбуляй.

Значная колькасць страў гатавалася з круп (ячнай, грэцкай, прасяной і інш.). Старыя ўспамінаюць, што маці вучыла іх купленыя крупы (грэчку, проса) спярша памыць, потым усыпаць іх ў чыгун ці гаршчок і заліць халоднай вадой крыху меней, чым даверху. Ячныя і пярловыя крупы, выробленыя ў асабістай гаспадарцы, звычайна не мылі, каб заставалася вельмі каштоўнае мучністае асаджэнне. Пры кіпенні мякінныя і вотруб'евыя астаткі, якія былі ў іх, лёгка было збіраць пры дапамозе шумоўкі (Никифоровский. Очерки... 1895. С. 46). Кашу або суп ставілі ўжо ў добра

прапаленую печ, крупы за 2 – 3 гадзіны, а то і болей добра разварваліся і былі вельмі смачнымі.

Дзеці чакалі, калі маці даставала з печы духмяную з залацістай коркай кашу, якую залівалі зверху халодным малаком. Менавіта гэтая корка была прадметам дзіцячых спрэчак.

Супы і баршчы, якія гатаваліся таксама густымі, мала адрозніваліся ад кашы. Дыктавалася гэта перш за ўсё недахопам ежы. Ад больш густых страў хутчэй з'ўлялася насычэнне і было больш сілы, якая патрабавалася на выкананне цяжкіх гаспадарчых работ. З гэтай прычыны і хлеба елі даволі шмат, ужываючы яго з кожнай стравай.

Звычайнай стравай на снеданне былі аладкі з жытняй, зрэдку з пшанічнай мукі або з сумесі пшанічнай, грэцкай і ячневай. Іх гатавалі як на хлебнай рошчыне, так і на сыраквашы або сыроватцы з дабаўленнем соды. Гаспадыня складвала выпечаныя аладкі на настольнік, а потым ім жа і накрывала, каб былі мяккімі. Такім жа чынам складвалі ў стос і бліны.

Вельмі любілі дзеці «мазаныя» (здорам, маслам) ці «маканыя» проста ў патэльню са смажаным салам бліны і аладкі. Да аладак часцей падавалі тварог з сыроваткай, смятану ці малако. Асаблівай прысмакай і дадаткам да іх была верашчака (мачанка). Для яе бралі свіныя рабрынкі, кавалкі кілбас і падсмажанае сала, якія варыліся ў мучной падліўцы.

Вясной і летам гатавалі баршчы з крапівы і шчаўя з дабаўленнем бульбы, якія запраўлялі падсмажаным салам і смятанай (ці малаком), а таксама «бацвінне», «халаднік» з буракоў. Смачнай атрымоўвалася ў печы гарбузовая каша (з пшаном, пшанічнай мукой і малаком).

Яблыкамі, грушамі і іншай садавіной дзеці пачыналі ласавацца, калі яна вырастала, можа, з арэх. Елі і няспелы агрэст, які ў дзікім выглядзе рос непадалёку ад дома, а таксама вішнёвую і слівовую смалу, якой шмат было на дрэвах. Вясной каштавалі бярозавыя «шышкі», жавалі «таўкачыкі», а зімой збіралі пад ліпамі ліпавыя семкі. Звычайнай справай было наесціся на лузе лісцікаў шчаўя або яго «пукоў» (суквецце шчаўя). Летам на рэчцы або возеры рвалі явар, абдзіралі верхняе лісце і даставалі смачную і мяккую сарцавіну, якой і ласаваліся.

Цяжкае жыццё, недахоп прадуктаў харчавання вымушалі дзяцей знаходзіць і нават здабываць сабе ежу. Вясковыя дзеці ведалі ад старэйшых, як адшукаць прыдатнае для ежы карэнне раслін, не кажучы ўжо пра ягады. Кожную вясну дзеці і падлеткі лічылі асабістай справай збор бярозавага ці кляновага соку. Потым ён, прыгатаваны гаспадыняй, стане цудоўным напоем: «бярозавікам» ці «кляновікам», які ўся сям'я з

задавальненнем будзе піць ўлетку. У вёсках, якія знаходзіліся непадалёку ад рэчак, азёраў, дзеці ўмелі лавіць рыбу, ракаў з дапамогай вудаў, кашоў, сетак ці проста рукамі. Асаблівае ўменне патрабавалася пры «рабаванні» мёду ў дзікіх пчол, якія старанна абаранялі свае прыпасы. Хлопчыкі займаліся лоўляй птушак і звяркоў, ставячы на іх пасткі.

У беларусаў існавалі свае правілы паводзін за сталом, якія дзеці засвойвалі з дзяцінства. Гэта быў асобы парадак, якога прытрымліваліся ўсе члены сям'і.

Прачнуўшыся раніцай, дзеці з нецярпеннем чакалі снедання. З'есці нават кавалачак хлеба не дазвалялася, пакуль страва не будзе пастаўлена на стол. Толькі самым маленькім маці давала невялікі кавалак хлеба, і тыя з'ядалі яго седзячы на «палу».

Перш чым сесці за стол, кожнае дзіця мыла рукі і твар, паліваючы адно аднаму са збанка. Зімой вада часта замярзала ў хаце, таму кавалачкі льду траплялі ў збанок і халадзілі рукі. Летам мыццё часцей адбывалася на дварэ непадалёку ад ганка. Мыліся дзеці з задавальненнем, пырскаючы вадой, нярэдка жартуючы, аблівалі адзін аднаго. Выцершыся ручніком («уціральнікам»), кожны садзіўся на сваё строга вызначанае месца, папярэдне перахрысціўшыся ўслед за бацькам. Месцы за сталом размяркоўваліся па старшынству. Самае пачэснае ў цэнтры займаў бацька, бліжэй да яго садзіліся старэйшыя дзеці, за імі — малодшыя. Маці займала месца з краю, бо ёй трэба было завіхацца ля печы і падаваць ежу на стол.

Перад снеданнем гаспадыня клала на стол лыжкі, хлеб, ставіла бліны. Маленькае дзіця маці звычайна садзіла на «ўлонні» (калені) і карміла сама. Дзеці, якія навучыліся карыстацца лыжкай, елі разам з усімі. Садзілі іх побач з маці, а каб яны маглі есці самі, на лаўку падстаўлялася калодка, на якой яны і сядзелі. І ад дарослых маленькія засвойвалі правілы паводзін за сталом, як казалі — правілы «людскасці» (Никифоровский. Очерки... 1895. С. 60).

М.Я.Нікіфароўскі так апісвае правілы паводзін за сталом у Віцебскай губерні: кожны павінен быў да таго, як пачаць есці суп ці боршч, з'есці кавалачак хлеба — «глытанік», пасыпаны соллю. Для гэтага соль з агульнай салонкі бралася лыжкай і ссыпалася ў маленькую кучку каля сябе справа, каб на працягу яды пасля кожнай стравы пасыпаць ёй наступныя «глытанікі». Пачынаць есці можна было толькі тады, калі, паставіўшы ўсе стравы, сядзе маці і скажа: «Прынімайцеся!» Бацька-гаспадар пачынае моўчкі рэзаць хлеб на скібкі. Хлеб у сялянскай сям'і — асноўная ежа і яго ўжывалі больш, чым «варыва». Дзеці з нецярпеннем чакалі «пакромкі», «гарбыля», якія заўсёды

прапаноўваліся ім. Нярэдка стравы ставіліся на стол у той жа пасудзіне, у якой варыліся, асабліва «пячыстыя». Першым страву зачэрпваў лыжкай бацька, потым астатнія па чарзе. Далей ужо ўсё залежала ад спрыту: той, хто спазняўся, мог застацца паўгалодным. Праўда, старэйшыя, як зазначае П.В.Шэйн, сачылі за тым, каб хапіла ўсім і хто-небудзь адзін не мог з'есці больш за іншых (Шейн. 1902. Т. III. С. 35).

Відэльцаў звычайна не было, і таму ўсе стравы елі лыжкай. Боршч ці суп, якія стаялі пасярэдзіне стала прыкладна на аднолькавай адлегласці ад кожнага, нялёгка было данесці, не праліўшы. Таму дзяцей вучылі, што яны павінны, зачэрпнуўшы «варыва», падкласці пад лыжку скібку хлеба і несці яе да роту. Калі хто-небудзь з дзяцей рабіў гэта няўмела і праліваў з лыжкі, то бацька «даваў навуку» лыжкай па лбе. Усё гэта, як успамінаюць старыя людзі, звычайна рабілася моўчкі і дзіця не адважвалася, баючыся новага пакарання, плакаць ці скардзіцца. Тое ж чакала і непаслухмяных дзяцей, асабліва калі яны пачыналі сварыцца за сталом, сваволіць, смяяцца і г.д. Згодна з правіламі, дзецям не дазвалялася размаўляць у час ежы. Толькі бацькі маглі перакінуцца рэдкім словам. А распараджэнні гаспадара дарослым і дзецям звычайна даваліся ў канцы або перад ядой. І парушаць гэты парадак не дазвалялася нікому.

Елі ўсе з агульнай міскі або талеркі. Спачатку вычэрпваўся з міскі «жыдзінь» (вадкая частка), потым — «гушча». Пасля яды лыжку аблізвалі і клалі на стол. Хлеб ламаць і адкусваць трэба было акуратна, кожную ўпаўшую крошку адразу ж падымалі, віноўнік цалаваў яе са словамі: «Выбачай, Божанька!» і з'ядаў.

Усе стравы, якія ставіліся на стол, з'ядалі поўнасцю. Нярэдка, калі ежа была асабліва смачнай, посуд нехта з дзяцей нават вылізваў. Поўнасцю з'ядалася ўсё, што прапаноўвалася ў час яды. Гэта традыцыя, дарэчы, існавала на Беларусі яшчэ ў пасляваенныя 50—60-я гады нашага стагоддзя. Таму сумна бачыць сёння ў дзіцячых садках, школьных сталовых, ды і ў сям'і недаедзеную на талерцы ежу, пакіданыя на стале і нават на падлозе кавалкі хлеба. Гэта сведчыць аб страце добрай народнай традыцыі — з павагай адносіцца да хлеба.

Дарослыя і старэйшыя дзеці саступалі маленькім права вычарпаць астаткі ежы, якія яны злівалі ў лыжку або выпівалі «нагбом» прама з гаршка ці чыгунка. Стукаць лыжкай па пустому гаршку таксама нельга было, бо бацька тут жа спыняў свавольніка ўдарам лыжкі па руцэ ці лбе.

Ніколі ў сялянскай сям'і не елі цэлым куском сала ці мяса. Калі суп ці боршч былі з салам, маці вынімала сала з

гаршка і старанна таўкла яго драўляным таўкачыкам у місцы, потым вылівала яго ў гаршчок і тады страву можна было есці. Стравы з мясам падаваліся на стол, і гаспадар прымаўся за справу. Уся сям'я моўчкі ўважліва наглядае, як бацька дзеліць мяса, і кожны чакае сваёй чаргі. Звычайна косткі і храшчы аддаваліся дзецям і былі для іх сапраўдным ласункам.

У некаторых сем'ях мяса ці сала клалі на агульную талерку, з якой кожны браў сваю порцыю і пры гэтым толькі пасля дазволу маці. Пачуццё такту не дазваляла ўзяць больш, чым другія. Маленькім дзецям «прысмакі» маці давала з лыжкі. Аналагічным чынам спажывалі пячысты (мяса запечанае, тушанае), якія падаваліся з падлівай. Кожны браў рукой ці лыжкай кавалачак мяса і еў з хлебам, які макаў у падліву.

Бліны звычайна падаваліся з «маканінай» (падліва з мяснымі, каўбаснымі кусочкамі, са смятанай, маслам і г.д.). Адразу трэба было адарваць чвэрць бліна, звярнуць яго ў трубачку і апусціць у маканіну так, каб адкрытым бокам зачарпнуць з яе гушчу (кавалак мяса і інш.) і адразу з'есці цалкам. Дзеці маглі з'есці гэтую порцыю ў 2—3 прыёмы. Вымазаныя ў падліву пальцы тут жа аблізваліся.

Правілы паводзін за сталом у беларусаў патрабавалі есці павольна, не спяшаючыся, старанна пераЖоўваючы ежу. З аднаго боку, гэта пазбаўляла ад небяспекі «падавіцца» ёю, з другога — вядома, што насычэнне наступае праз 20—30 хвілін пасля яды. А таму пры хуткай ядзе трэба было гатаваць больш яе, што цяжка было б мець шматлікай сялянскай сям'і. Да гэтага трэба дадаць, што, як правіла, у вялікай сям'і не было праблем з апетытам дзяцей. Адна старая жанчына з Магілёўшчыны, якая расла ў сям'і адна, успамінала, што ёй часта не хацелася дома есці. Затое з асалодай яна ела разам з іншымі дзецьмі ў суседзяў, дзе пяцёра дзяцей навыперадкі з'ядалі цэлы гаршчок кашы і яна, хоць і нішчымная без масла і сала, здавалася ёй больш смачнай, чым дома.

Важнае значэнне сяляне надавалі выхаванню беражлівых адносін да хлеба, які лічыўся асноўным, галоўным прадуктам харчавання («Хлеб усяму галава»). Першае, аб чым даведваецца дзіця, падрастаючы, гэта тое, што хлеб нельга кідаць ці ляпіць з яго «катэлкі». Вучылі збіраць нават самыя маленькія крошкі і з'ядаць. Рэзаў хлеб за сталом звычайна гаспадар — бацька, але старэйшых дзяцей таксама вучылі, як правільна гэта рабіць: прыкласці бохан хлеба да левага боку грудзей рабром, выпуклым бокам да правай рукі і нажом, які трымаецца ў правай руцэ, зрэзаць спачатку «пакромку» («гарбушку», «гарбыль») з вяршыні

і рэзаць далей на «лусты» («скібкі») раўнамернай таўшчыні. Калі рэзалі не ўвесь бохан, а частку яго, то «акрайчык» клалі на стол і накрывалі ручніком (Никифоровский. Очерки... 1895. С. 43). Бацькі вучылі: «Не кідай хлеба, бо Бог будзе гневацца і хлеб нас кіне, то кепска без хлеба» (Шейн. 1887. Т. І. Ч. 1. С. 242). У гэтых словах адчуваюцца не проста беражлівыя адносіны да хлеба, а нават параўнанне яго з Богам, бо без хлеба няма і жыцця. У час храмавых свят (акрамя Вялікадня) хлеб асвячалі ў царкве, і гэты хлеб («абедня») лічыўся асабліва каштоўным.

У.Сыракомля (Сыракомля. Добрыя... 1993. С. 130) у вершы «Акраец хлеба» пісаў:

> Бярэ чалавек яго ў вусны з пашанай.
> У хлебе зялёным сіла ёсць немалая,
> У хлебе жыццё людзям Бог прысылае.
> Мы з хлебам бяром у любое імгненне
> Збавенне для цела, для духа збавенне.

Беражліва ў сялянскай сям'і адносіліся не толькі да хлеба. Ашчаднасць была рысай характару беларусаў. З ранняга дзяцінства навучалі берагчы і цаніць усё, што здабыта рукамі чалавека, на што патрачаны сілы і час. Таму кожнае зярнятка на таку, у свірне ці іншым месцы падымалі і кідалі ў кучу ці ў мяшок. Падбіралі кожны ўпаўшы крышталік солі, кавалачак сала і г.д.

Такім чынам, дзеці на прыкладзе бацькоў засвойвалі беражлівыя адносіны да ўсяго, што здабыта працай. Больш таго, усё гэта яны лічылі дарамі Божымі і верылі, што ён няспынна сочыць за паводзінамі кожнага і здольны пакараць за непавагу да хлеба і іншых прадуктаў, за пустыя ці зняважлівыя размовы, лаянку і стараліся не парушаць гэтыя няпісаныя правілы.

**Дзіцячыя рэчы, «інвентар», прадметы быту, адзенне, абутак.** Важную ролю ў першапачатковай сацыялізацыі дзяцей, іх духоўным развіцці адыгрывалі ўмовы жыцця, а таксама рэчы і прадметы, якія іх акружалі і якімі яны карысталіся (дзіцячая мэбля, сродкі перамяшчэння, адзенне, абутак, цацкі). Для немаўлят звычайна рыхтавалі асобныя пасцельныя прыналежнасці: падушачкі, навалачкі, матрацы і г.д. Іх колькасць і якасць матэрыялу ў многім залежалі ад сацыяльнага, а значыць і матэрыяльнага становішча сям'і. Але нават і ў бедных сем'ях стараліся ўпрыгожыць карункамі або вышыўкамі навалачкі, «пакрышкі» з простага палатна (у больш заможных — з міткалю, каленкору, маркізету), асабліва тую частку, якая пакрывала галаву немаўляці. Няпрэдка да «пакрышкі» спецыяльна прышывалі прыгожыя «нагалоўнікі» з карункамі.

Першыя месяцы жыцця немаўляты большую частку знаходзіліся ў люльках, сценкі якіх упрыгожвалі разьбой ці роспісам.

Спецыяльнага посуду для маленькіх дзяцей большасць сялян не магла сабе дазволіць, і таму карысталіся агульным посудам, які часова выкарыстоўвалі толькі для самых маленькіх (грудного ўзросту).

Адзенне дзяцей, як і дарослых, падзялялася на сезоннае, святочнае і паўсядзённае. У немаўлят былі 1 – 2 рубашачкі, чэпчык, пялюшкі з саматканага палатна, «спавівач», коўдра. Так званы дзіцячы «мятлік» рабіўся з куска старога тонкага палатна, які складвалі напалам, праразалі дзірку для галавы (Курыловіч. 1990. С. 80). На зіму дзецям валілі «катанкі» (валёнкі).

На працягу першага года жыцця дзіця любога полу спавівалі ў пялюшкі («полкі») з старога льнянога палатна, якое добра ўбірала вільгаць, не выклікала раздражнення скуры. Завязвалі і зверху «спавівачом» (вузкі даматканы пояс у два вяршкі шырынёй і 2,5 аршына даўжынёй), бо лічылі, што тады ногі ў дзіцяці будуць роўныя (Шейн. 1902. С. 77). Але некалькі разоў на дзень іх разгортвалі і давалі паварушыцца, мянялі пялюшкі. Спавівалі да таго часу, пакуль дзіця не ўставала на ногі. Такое дзіця апраналі ў кашулю і ставілі ў стойку (дзве дошкі, злучаныя калочкамі, у верхняй акруглая адтуліна, у якую ставілі дзіця).

Спала дзіця ў драўлянай люльцы («калыска», «зыбка»), якую летам у час жніва бралі з сабой у поле, вешалі на дрэва ці ставілі ў цянёк пад «бабку» (3 – 4 снапы, звязаныя разам камлём кверху) (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 83, л. 12). А каб не турбавалі мухі, камары, абварочвалі люльку тканінай. Вядомы на Беларусі саламяныя і палатняныя калыскі. «Саламяная калыска немаўляці так зроблена, – пісаў Уладзіслаў Сыракомля, – каб маці магла лёгка ўскінуць яе на плечы і панесці ў поле, дзе працуе, а калі дзіця ў гэтай калысцы, пастаўленай у цень жытняга снапа, плача ад гарачыні ці голаду, малы апякун ці апякунка спявае яму песню пра катка, які прынясе малому шаўковы пасак ці смачны піражок, пра курак, што радзяцца, чым бы яго пачаставаць... манатонны спеў закалыхвае яго да сну» (Сыракомля. Вандроўкі... 1992. С. 312).

У Лідскім раёне Гродзенскай вобласці, напрыклад, палатняныя калыскі (палатно, нацягнутае на драўляную раму) у полі сялянкі падвешвалі на трыногу ці проста на дрэва яшчэ ў нашым стагоддзі. У 20 – 30-я гады ў дзіцячы побыт увайшлі "ложкі-качалкі", у якіх спалі немаўляткі (в. Крынкі Ліёз-

ненскага раёна Віцебскай вобласці, в. Язвіна Шумілінскага раёна) (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 83, л. 14, 16).

Існавала цікавае павер'е, што калыску для першага дзіцяці абавязкова павінен быў зрабіць сам бацька. Тады, на народны погляд, дзеці будуць больш шанаваць бацькоў. Затым калыска пераходзіла да наступных дзяцей – у такім выпадку дзеці будуць больш дружныя і згуртаваныя (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 69, л. 13).

Некаторыя сялянкі клалі немаўля на рассцеленую "сярмягу", а каб яно не плакала, давалі ў рот "сусолку". У калыску ў асобных раёнах Беларусі клалі нажніцы (ад сурокаў), а пад яе венік (каб нячыстая сіла не забрала дзіця) (Улашчык. 1989. С. 130).

Калі немаўляты спалі ў калысках, то больш старэйшыя дзеці – на печы, на палку, на лавах або драўляных ложках. Для спання рабілі "сеннікі", напханыя саломай або сенам. Спалі і проста на старызне. Былі і коўдры, шытыя сваімі рукамі, дзе верх быў з сукна або шарака, а ніз – палатняны (Мінская губерня). Пракладкай нярэдка служыла кудзеля (Улашчык. 1989. С. 130). Падушкі рабілі самі з курынага, гусінага пер'я. Доўгімі зімнімі вечарамі маці разам з дзецьмі "скубла" пер'е, выкідваючы жорсткую сарцавіну.

Так, дзеці да 10—12 гадоў спалі ўсе разам на палку ("палацях", "палу") каля печы або на печы і накрываліся чым прыдзецца: кажухом, посцілкай і г.д. У старэйшым узросце спалі брат з братам, а сястра з сястрой, што дыктавалася неабходнасцю раз'яднання, звязанага з перыядам палавога выспявання і адпаведнымі праблемамі гэтага ўзросту. У некаторых сем'ях гэта правіла не выконвалася (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 83, л. 12).

Як і ў ежы, у адзенні дзяцей у XIX стагоддзі існавалі адрозненні. Перш за ўсё яны былі абумоўлены полаўзроставымі асаблівасцямі дзяцей, а таксама нацыянальнымі традыцыямі і сацыяльным статусам бацькоў. У першыя гады жыцця ў немаўляці адрозненняў гэтых не існавала.

Кашуля была першым адзеннем, што надзявалі яшчэ ў перыяд ранняга дзяцінства хлопчыку і дзяўчынцы, якія ўжо добра трымаліся на ножках. Доўгая кашуля з тоўстага хатняга палатна служыла адзіным адзеннем хлопчыкаў і дзяўчынак да 5, а часта да 6—8 гадоў і нават болей. Яе падпярэзвалі даматканым поясам. У цёплую пару года дзеці хадзілі ў такой кашулі босыя. І адрозніць хлопчыка ад дзяўчынкі можна было толькі па даўжыні валасоў (у хлопчыкаў – кароткія, пастрыжаныя паўкругам, у дзяўчынак – доў-

гія, заплеценыя ў коскі), а таксама па шнурку караляў, якія ўпрыгожвалі шыю дзяўчынак.

У параўнанні з простым даматканым адзеннем сялянскіх дзяцей адзенне дваранскіх дзяцей, пачынаючы з узросту немаўляці, выдзялялася сваёй прыгажосцю. Коўдра ў хлопчыка была блакітнай, у дзяўчынкі – ружовай. У XIX стагоддзі дваранскія сем'і, а таксама сем'і купцоў і нават духавенства мелі магчымасць набыць дарагія матэрыі, часцей замежныя, з якіх шылася адзенне дзецям і дарослым. Пры гэтым улічваліся асаблівасці тагачаснай моды. Дзяўчынак, напрыклад, апраналі ў прыгожыя сукенкі з фартушкамі. З трох гадоў ім адпускалі доўгія валасы, якія зачэсваліся па модзе. Хлопчыкі ў сваім адзенні нагадвалі бацьку ў мініяцюры. Трэба адзначыць, што ў прычосках дзяцей, як і ў адзенні, таксама прасочвалася іх прыналежнасць да пэўнага сацыяльнага слоя.

Пачынаючы з вясны вельмі любілі дзяўчынкі плесці вяночкі з кветак, спачатку з дзьмухаўца, потым з розных лугавых і палявых кветак (рамонкаў, валошак і інш.).

Улетку сялянскія дзяўчынкі рабілі сабе ўпрыгожанні: "каралі" з чырвоных ягад рабіны, з гарлачыкаў, якія ў час квецені рвалі на рэчцы або сажалцы. Доўгую сцябліну гарлачыка раздвойвалі на дзве, надломваючы потым невялічкімі кавалачкамі. Атрымлівалася ўпрыгожанне накшталт ланцужка з медальёнам, якім служыла расцвіўшая кветка з белых лілеяў і жоўтых гарлачыкаў.

У XIX стагоддзі хлопчыкам надзявалі штаны (порткі) у 6 – 8 гадоў. Да гэтага часу яны насілі толькі доўгую кашулю. У 20 – 30-я гады XX стагоддзя ўзрост хлопчыкаў, якія не мелі порткаў, знізіўся да 3 – 4 гадоў. З гэтай пары яны насілі тканыя "штонікі", якія фарбавалі фарбай з раслін, у тым ліку талакнянкай (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 52) (в. Старыя Максімавічы Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці). У асноўным абновы дзецям шылі толькі да свята Вялікадня, і гэта ўздымала настрой дзяцей – яны адно перад адным паказвалі іх. У халады адзеннем сялянскіх дзяцей былі кажушкі або світкі з чужога пляча (старэйшых дзяцей або бацькоў), доўгія спадніцы і порткі з даматканага палатна, суконная хустка і лапці з анучкамі, перавязаныя аборамі. Верхняе адзенне для дзяцей шылі толькі ў заможных сем'ях (Курыловіч. 1990. С. 81). Зімой дарослыя і дзеці на ногі надзявалі валёнкі, якія выратоўвалі ад вялікіх маразоў. Больш заможныя маглі дазволіць сабе і галёшы, якія, надзетыя зверху валёнкаў, не дазвалялі ім прамокнуць у час адлігі або доўгага хаджэння па снезе. Трэба сказаць, што валёнкі, або "катанкі", лапці, а таксама боты (часта маці ці бацькі) былі адзіным

абуткам дзяцей. Пакупны абутак быў амаль недасягальным для селяніна і куплялі яго часцей толькі юнакам і дзяўчатам. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя у гардэробе дзяўчат у вёсцы пачалі з'яўляцца набытыя ў горадзе капелюшы і модныя чаравікі, у хлопцаў – боты (з кірзы, хрому) або чаравікі. Разам з тым, як адзначаюць старажылы, нават у перадваенны час (30-я гады) многія дзеці хадзілі ў школу ў лапцях (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 54) (Клімавіцкі раён, в. Старыя Максімавічы). Як расказвала жыхарка вёскі Баркі Бярэзінскага раёна, яна мусіла насіць бацькоўскую світу і лапці ў школу. Саромячыся аднагодкаў, яна здымала світку, калі падыходзіла да школы (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70, л. 87).

Галаўным уборам дзяцей у халады была шапка ў хлопчыкаў і хустка у дзяўчынак, улетку – саламяныя капелюшы, якія дзяўчынкі любілі ўпрыгожваць кветкамі.

Святочнае адзенне дзяцей мала адрознівалася ад штодзённага. Яно толькі было чыстым, свежым ці новым. Больш выдзяляліся сярод іншых у гэтыя дні юнакі і дзяўчаты, прыгажосць адзення якіх дыктавалася неабходнасцю "шукаць сабе пару".

У святы дзяўчаты апраналі андаракі, вышытыя або затканыя сарочкі, якія ў розных мясцовасцях Беларусі адрозніваліся і каляровай гамай, і арнаментыкай, і пакроем, і якасцю палатна. У халодную пару зверху апраналі белую світку. Абавязковай прыналежнасцю ўбору дзяўчыны былі розныя ўпрыгожанні – каралі, завушніцы, а таксама стракатыя прыгожыя хусткі, абвязаныя вакол шыі, са спушчаным канцом. Хлопцы паважна хадзілі ў высокіх "чабоцях", у камзолах чорнага ці сіняга колеру са стракатымі шклянымі ці металічнымі гузікамі. Паверх камзола – пояс, які некалькі разоў абвіваў талію, зверху – світка і белая валяная шапка на галаве. У XIX ст. у вясковую моду з горада прыйшлі фуражкі з казырком, якія сталі прыналежнасцю ўбору хлопцаў.

У 20-я гады XX стагоддзя дзяўчаты часцяком апраналі спадніцу і кафтан, хустку, купленую ў краме. У халодны час – кажухі і саматканыя світы. Абутак быў раскошай. Таму хадзілі босыя да глыбокай восені, часта хварэлі.

Да пачатку 30-х гадоў у побыт сялян уваходзілі нікеляваныя лыжкі, прымусы, плюшавыя коўдры (Бараноўскі. 1928. № 8 – 9. С. 61), хоць карысталіся і шырокімі драўлянымі лыжкамі, спалі па 2 – 3 чалавекі і коўдрай была дзяруга (в. Крынкі Ліёзненскага раёна Віцебскай вобл.). У дамах калгаснікаў замест ікон на сценах вывешвалі партрэты правадыроў, сямейныя фотаздымкі ў рамках. З'явіліся ў вёсцы першыя яслі для маленькіх дзетак.

На І Усерасійскім з'ездзе работніц у 1922 г. была прынята рэзалюцыя аб выхаванні дзяцей, асноўная ідэя якой – увядзенне грамадскага выхавання, якое павінны былі забяспечыць дзіцячыя сады, яслі, дамы. Інакш кажучы, каб яно было "свядомым і арганізаваным", выхаванне трэба было даверыць перш за ўсё дзяржаве, адмяніўшы "патранат" (аддачу дзяцей на выхаванне ў вёску) (Владимиров. 1919. № 3. С. 113–114) і адсоўваючы сямейнае выхаванне дзяцей на другі план.

У 20-я гады ХХ ст. нярэдка дзеці сялян дзеля матэрыяльнай дапамогі бацькам вымушаны былі наймацца ў батракі. Звычайна яны працавалі пастухамі, конюхамі і г.д. у больш заможных сялян хутароў і аколіц. Нярэдка бацькі адпраўлялі іх у заробкі аж да "пiлiпаўскiх загавiн". Многія з гэтых дзяцей не маглі наведваць школу да снежня ці ўвогуле адмовіцца ад навучання.

Падлеткі ў сялянскай працы з'яўляюцца значнай падсобнай сілай, і ў 8–10 гадоў хлапчукі і дзяўчаты ідуць на працу як дапаможная сіла ў гаспадарцы. З усходу да заходу яны на нагах і, паклаўшы ў торбачку кавалак хлеба, бутэльку малака, цэлы дзень снуюць са статкам па балотах і лясах. Хранічна недаядалі і недасыпалі, а ад хадзьбы па балотах хварэлі рэўматызмам 10–15-гадовыя дзеці.

Праўда, сяляне з недаверам адносіліся да першых ясляў для дзяцей, думаючы, што дзяцей будуць біць, недастаткова карміць і "драць" вялікі налог. Добры догляд дзяцей і чысціня ў яслях змянілі гэты погляд. З цягам часу яслі ў вёсцы сталі своеасаблівым медыцынскім кансультацыйным пунктам, куды часта звярталіся маці.

***Гігіенічныя і санітарныя ўмовы ўтрымання***. Адным з важных гігіенічных правіл было мыццё рук перад ядой, мыццё цела ў лазні. Звычайна мыліся ў лазні адзін раз у месяц, а калі была магчымасць, то і часцей. Да 6–7 гадоў дзяцей незалежна ад полу бралі з сабой мыцца і бацька і маці. Пазней стараліся мыцца бацькі з дзецьмі аднаго полу.

У некаторых месцах (заходнія раёны Беларусі) лазняў не было і мыліся проста ў начоўках. Дзяцей, асабліва маленькіх, купалі часцей, чым мыліся дарослыя. Летам дзяўчаты і хлопцы пасля працы мыліся ў рацэ або сажалцы. Бялізну мылі з дапамогай попелу, які насыпалі ў цэбар і лілі на яго вар. Прасавалі бялізну "качалкай". У беларускай сям'і існавалі таксама гігіенічныя правілы, якім маленькіх дзяцей і дзяўчынак вучыла маці, хлопчыкаў – бацька.

Жыццё дзяцей заўсёды было звязана са шматлікімі хваробамі. Асабістую небяспечнасць для іх уяўлялі інфекцый-

ныя захворванні і захворванні прастуднага характару, такія, як пнеўманія, хваробы горла, носа і інш. Адсутнасць эфектыўных сродкаў лячэння многіх хвароб, іх прафілактыкі, недахоп медыцынскіх работнікаў, дрэнныя санітарна-гігіенічныя ўмовы жыцця сялянскіх дзяцей з'яўляліся прычынай вялікай дзіцячай смяротнасці, асабліва ў вёсцы.

Малыя дзеці ў летнюю пару часта заставаліся без нагляду, асабліва калі ў час збору ўраджаю ці сенакосу іх пакідалі пад апекай старых бабуль і дзядуль. Яны нярэдка аб'ядаліся зелянінай, маглі пакалечыць адзін другога ці трапіць у бяду. У гэты час назіралася вялікая смяротнасць дзяцей ад дызентэрыі і іншых хвароб. Менавіта летам адбывалася найвялікшая колькасць пажараў, якія ўчынялі дзеці, яны ж станавіліся і іх ахвярамі. Вялікую шкоду здароўю дзяцей наносіла карыстанне паслугамі знахарак, асабліва пры цяжкіх хваробах, якія патрабавалі неадкладнай медыцынскай дапамогі.

Дзеці хварэлі значна часцей, чым дарослыя. Ва ўзросце да пяці гадоў памірала трэць нарадзіўшыхся дзяцей. Асабліва вялікай была смяротнасць да года. Захворванням спрыялі і дрэнныя санітарна-гігіенічныя ўмовы жыцця як у вёсцы, так і ў горадзе, асабліва бедных слаёў насельніцтва.

У сярэдзіне XIX стагоддзя шмат сялян жыло ў курных хатах, дзе дым выходзіў не толькі ў душнікі за печчу, але і праз вокны, дзверы, таму ў дзяцей часта здараліся прастудныя захворванні: "гарлянка" (хваробы горла), гарачка, пнеўманія і інш.

З ранняга дзяцінства дзяцей вучылі разбірацца ў лекавых якасцях траў і карэнняў, а таксама адрозніваць добрыя ягады і грыбы ад атрутных. Шырока карысталіся дзеці лісцем трыпутніку ў якасці лячэбнага сродку супраць нарываў, сокам чыстацелу змазвалі бародаўкі. Шмат траў і карэнняў былі вядомы ім як сродкі лячэння.

Запаленні слізістай абалонкі рота лячылі сумессю мёду з імбірам (змазвалі хворыя месцы).

Дыятэзныя праявы на целе дзіцяці звычайна лячылі адварам чыстацелу, які давалі піць у якасці напою, а таксама купалі ў ім. Добрым сродкам ад скурных хвароб лічылі і купанне ў адвары "ваўчкоў" (чарады).

Нават маленькія дзеці добра ведалі і пры неабходнасці карысталіся простымі сродкамі пры парэзах, апёках. Паўсямесна пры парэзах рукі або нагі першай дапамогай было прамыванне гэтага месца, на якое звычайна клалі сырую дробна сцёртую бульбу або змазвалі алеем, топленым салам і г.д.

Дызентэрыю ("крывавы панос") лячылі настоем з чарніц або чарнічным кісялём, сушанымі і сцёртымі ў парашок му-

хаморамі, настоенымі на віне, якія трымалі на сонцы. Давалі піць таксама напой з шышак вольхі. Паносы лячылі яшчэ засушаным расцёртым курыным "пупком", парашок з якога змешвалі з вадой.

Калі дзіця захворвала, яго спачатку спрабавалі вылечыць самі, а калі не дапамагала, звярталіся да знахарак, нават з такой небяспечнай хваробай, як брушны тыф. П.В.Шэйн апісвае адзін з такіх выпадкаў: "Бабка тут жа памые дзіця ў цёплай вадзе, расціраючы мылам грудку, пераверне яго на "адліў", злёгку ўдарыць далонню па пятах тры разы і перадае маці: "Цяпер будзе ўжо здаровы" (Шейн. 1902. Т.III. С. 78). Вядома, што пасля такога "лячэння" дзеці нярэдка паміралі.

Здаралася, што маленькае дзіця спалохалася чагосьці. У такіх выпадках бацькі шукалі "бабку", якая паспяхова лячыла "пярэпалах". Амаль у кожнай вёсцы была жанчына, якая валодала ўнушэннем і, магчыма, гіпнозам. Па ўспамінах старых, да яе ішлі раніцай, да ўсходу сонца. Яна выкатвала з печы чырвоныя вугалькі на "загнёт", нешта шаптала над імі, пырскала вадой. Потым брала мякіш хлеба, рабіла шарык і зноў качала шарык па голым жываце дзіцяці са словамі загавору. Як адзначалі апытаныя (гэта ім запомнілася з дзяцінства), дзіцяці станавілася лёгка і спакойна і, прыйшоўшы дадому, яно засыпала і спала амаль суткі.

Да "бабкі" з "пярэпалахам" звярталіся ў больш цяжкіх выпадках, калі не дапамагалі свае асабістыя сродкі. Звычайна маці ці бабуля клалі немаўля ў дзяжу зверху падыходзячага цеста і чакалі, пакуль дзіця пачне крычаць. Тады давалі соску і клалі ў калыску. Гэты магічны прыём, аднак, не прыносіў поспеху.

Маленькія дзеці, якія ўвесь час плакалі, лічыліся хворымі, і гэта хвароба атрымала назву "крыксы" і "плаксы". Прычынай яе лічылі нячыстую сілу ("д'ябла"), якая забіралася ў дзіця, калі маці забывала хоць раз, укладваючы яго спаць, перахрысціць яго, калыску і нават дзверы і вокны (Шейн. 1893. Т.II.С. 536). У такіх выпадках за дапамогай звярталіся да знахароў, а таксама выкарыстоўвалі розныя загаворы.

***Прымхі і забабоны***. Многія хваробы беларусы лічылі вынікам "урокаў", "суроцаў" (дурнога вока) і верылі, што сурочыць дзіця можа не толькі дрэнны чалавек, але і добры, не толькі чужы, але і свой. Сурочанае дзіця вызначалі па розных прыметах: калі яно кідаецца ў сне без усялякай прычыны, крычыць без супынку, у яго падымаецца жар і г.д. Да нашага часу захаваліся некаторыя ўяўленні аб прычынах, якія вядуць да гэтага. Так, існуе перакананне, што нельга хваліць дзіця, захапляцца яго сілай, розумам, спрытам і знешнасцю, бо дзіця можа страціць гэтыя

якасці. Калі ж хтосьці хваліў дзіця альбо здзіўляўся яго добрым якасцям, то, каб пазбегнуць "уроку", маці ці хто іншы гаварылі: "Соль табе ў вочы, галаўня ў зубы, гаршчок між шчок, палена між калена" (Быт белорусских... 1854. Вып. II.С. 261). Асабліва стрымана трэба было адносіцца да немаўляці, на якога нават нельга было доўга глядзець. І калі ўпершыню падыходзілі да дзіцячай калыскі, каб зірнуць на нованароджанага, згодна з павер'ем, тры разы сплюнуўшы, казалі: "Няхай расце здаровым". Дзіця стараліся не паказваць незнаёмым і ўвогуле абмяжоўвалі кола людзей, якія маглі бачыць яго. Нельга не адзначыць засцерагальны сэнс такога падыходу, таму што для маленькіх дзяцей кантакты з дарослымі, іх пацалункі пагражалі рознымі інфекцыямі, таму інтуітыўна імкнуліся пазбегнуць іх.

Радыкальным сродкам ад "суроцаў" у народзе лічылася апырскванне вадой, хоць былі і іншыя: замовы, уціранні маці твару дзіцяці падалом ніжняй сарочкі з прыгаворкамі і г.д. Адна шырокараспаўсюджаная замова ажыццяўлялася так. Яе трэба было прачытаць да ўсходу сонца над вадой і даць выпіць сурочанаму. Маці замаўляла: "Царыца-вадзіца з-пад ранішняй зары і з-пад вячэрняй зары, шэры камень абмывала, круты беражкі сцірала. Раб (імя) рукой сваёй ваду браў, рабу (імя) ізмываў ад усялякага суроку, ад усялякага часу пазбаўляў, урокам па свету не хадзіць, рабе Божай вялікай ня быць. Амінь!" (Шейн. 1893. Т.II. С. 533). Існаваў і звычай абкурвання дзяцей ва ўзросце да года; бо ў гэты перыяд яны падвержаны хваробам, таму ад бацькоў патрабаваліся больш уважлівыя, беражлівыя адносіны да маленькіх, што спрыяла ўзнікненню павер'яў, звычаяў, звязаных з іх доглядам. Захаваліся шматвяковыя славянскія звычаі – першы раз стрыглі дзіця не раней чым у год, а таксама "абгрызалі" пазногці (Бобровский. 1863. Ч. І. С. 882). Гэтых звычаяў прытрымліваліся на вёсцы да нядаўняга часу.

Валасы ўпершыню ў Гродзенскай губерні, па словах П.В.Шэйна, стрыглі на 3-м годзе, аднак у іншых раёнах Беларусі былі і іншыя тэрміны – пасля года. Згодна са звычаем, маці, расчэсваючы валасы маленькага, прыгаворвала: "Дай Божа ласкавы, каб ты ніколі не заблудзіў і ішоў простай дарожкаю" (Шейн. 1902. Т.III. С. 78). У гэтых словах – імкненне з дапамогай магічнага прыёму паўплываць на будучыню дзіцяці і пажаданне яму добрага лёсу. Састрыжаныя валасы стараліся пакласці ў якую-небудзь дзірку ў сцяне або пусціць па рэчцы (па цякучай вадзе). Верылі, што калі спаліць валасы дзіцяці ў агні, у яго будзе жар у галаве, а калі проста выкінуць на вуліцу або ў доме, іх маглі схапіць

птушкі ці мышы для сваіх норак або гнёздаў і ў дзіцяці будуць балець галава і вушы.

Беларусы прытрымліваліся многіх прымет, няўвага да якіх, на іх погляд, магла садзейнічаць сурокам, пагаршэнню здароўя дзіцяці і нават яго смерці. Так, маці, напрыклад, ніколі не дазваляла "гуташыць" калыску, калі ў ёй не было дзіцяці, таму што, па народнаму павер'ю, гэта прывядзе да яго смерці. Дарэчы, гэтай традыцыі трымаюцца часта і зараз, хоць сэнс яе не ўсе ведаюць.

Дзіця на рукі стараліся браць спераду, бо, калі бралі ззаду, лічылася, што з немаўляці вырасце ўпарты чалавек. Зараз, перадаючы маленькага з рук у рукі, у жарт, з замілаваннем маці злёгку пляскае яго па спінцы ці ягадзіцах. Раней гэта рабіць не дазвалялася, бо дзіця, згодна з прыметай, будзе злое і капрызнае.

Да года не шылі маленькаму сарочкі і пялюшкі з новага палатна, не паказвалі яму люстэрка, каб абараніць ад злых сіл. Выкананне некаторых прымет суправаджалася перахрышчваннем тройчы дзяцей, паліваннем вадой або сплёўваннем і г.д. Месца, куды ўпадзе дзіця, тры разы палівалі вадой (каб не здарылася няшчасце) або прымушалі зрабіць гэта само дзіця (тройчы сплюнуўшы) (Шейн. 1887. Т. І. Ч. І. С. 16).

У хатняй жывёлы, якой спужалася дзіця, звычайна адразалі пучок поўсці і, спаліўшы яе, абкурвалі дзіця. Калі яно спужалася чалавека, то ў таго адразалі пучок валасоў у час сну. Горш было, калі жывёліна была дзікай, а чалавек — незнаёмы альбо прычына спалоху была невядомая – тады звярталіся да знахарак.

У беларусаў існаваў звычай, які мае, відаць, агульнаславянскае паходжанне, згодна з якім маці (або хто-небудзь іншы) пры першых самастойных кроках дзіцяці брала нож і "рэзала" (праводзіла па падлозе ці зямлі рысу паміж ножак дзіцяці) са словамі: "Разарвіцеся, путы!" і дабаўляла: "Цяпер ён будзе хадзіць, бо я яму пуцечка разрэзала". Гэтае магічнае дзеянне, на іх погляд, садзейнічала добрай хадзьбе немаўляці. У рускіх, калі дзіця доўга не хадзіла , запрашалі бабку. Яна ставіла дзіця насупраць сябе на падлогу і нажом праводзіла крыж паміж ножак дзіцяці.

У кожнай мясцовасці існавалі свае сродкі лячэння ад сурокаў. П.В.Шэйн апісвае, як у заходніх раёнах Беларусі лячылі "суроцы" з дапамогай "вады з рота". У хату прыносілі міску чыстай крынічнай вады і кожны з сям'і тройчы набіраў вады ў рот і выпускаў зноў у міску. Гэтай вадой абмывалі хворае дзіця. Калі, напрыклад, была ўпэўненасць, што сурочыў хто-небудзь

са знаёмых, суседзяў ці членаў сям'і, то яму прапаноўвалі даць самому "вады з рота" хвораму (Шейн. 1902. Т.III. С. 85).

Больш за ўсё баяліся "дурнога вока" тых людзей, пра якіх ведалі, што яны ў маленстве былі адняты ад грудзей, а потым зноў харчаваліся малаком маці. Небеспадстаўна, відаць, лічылі здольнымі сурочыць дзіця людзей з цёмнымі вачыма, дурной рэпутацыяй, злых і таму стараліся абмежаваць кантакты гэтых людзей з маленькімі дзецьмі. Разам з тым, па народным уяўленні, дзеці ўвогуле менш за ўсё маглі дрэнна ўплываць адзін на аднаго ў сэнсе "суроку". Больш таго, здольнасць "вылечыць" сурокі прыпісвалася як першаму, так і апошняму дзіцяці ў сям'і, якому даручалася "выцерці" сурочанага соллю са словамі: "Соль табе ў вочы, галаўню ў зубы, палена ў калена, штоб я не балела".

Як даведваліся, сурочана дзіця ці не? Гэта ўдакладнялі так: тройчы абносілі вакол галавы хворага жменьку солі, а потым кідалі яе ў агонь і па слабаму ці моцнаму трэску пры яе гарэнні вызначалі ступень захворвання. Згодна з другім спосабам, у ночвы з чыстай рачной вадой, дзе купалі дзіця, кідалі гарачыя вугалькі, калі яны шыпяць і круцяцца, то ўпэўненасць у насланні пацвярджалася.

Прычыну з'яўлення хваробы вызначалі наступным чынам. Маці з хворым дзіцем ішла ў амбар ці пакінутую хату, адмыкала там кубел, клала ў яго дзіця і зноў замыкала. Тым часам старэйшае дзіця яна адпраўляла за вароты наглядаць за вуліцай. Калі на вуліцы з'яўляўся чалавек, то прычынай хваробы лічыліся "суроцы", а калі нікога не было – іншыя прычыны (Шейн. 1902. Т. III. С. 287).

Трэба адзначыць, што метадаў лячэння ад "дурнога вока" ў беларусаў было вядома шмат. Найбольш распаўсюджаныя – выціранне, "высмокτванне", абкурванне, мыццё, прадзяванне. І сёння яшчэ ў многіх раёнах Беларусі вядомы звычай "уціранне" маці твару дзіцяці падолам сарочкі. У XIX стагоддзі з гэтай мэтай яшчэ карысталіся бацькоўскімі нагавіцамі (іх паясніцай). Цікавы звычай праносіць дзіця паміж целам і сарочкай, калі маці тройчы "прадзявала" дзіця з падолу праз ворат або праз бацькоўскія штаны. Метад "высмоктвання" заснаваны на тым, што больш падвяргаюцца "сурокам" вочы і сэрца, якія маці "высмоктвала" і сплёўвала ў бок.

Калі было невядома, ад каго прыйшло насланнё на маленькага, цішком адразалі пасму валасоў у магчымага віноўніка, запальвалі іх і абкурвалі дзіця. Такое ж абкурванне праводзілі і смеццем, якое бралі не менш чым з трох суседскіх хат. П.В. Шэйн апісвае існаваўшы ў мінулым звычай мыцця

маленькіх з каласкамі. Пры гэтым дзейнічаюць усе тыя ж магічныя лічбы "3" і "9". Бралі 9 жытніх каласкоў, "выцiралі" імі цела дзіцяці і тройчы апускалі іх у ваду, дзе купалася дзіця: калі каплі вады заставаліся на каласках, гэта прымета, што дзіця "суročана". Каб адвесці ад дзіцяці "дурное вока", купаючы, трымалі над ім каласкі, праз якія лілі ваду. Потым каласкі раскідвалі ў розныя бакі, а ваду разлівалі.

Каб абараніць дзяцей ад хвароб, бабка пры першым купанні ваду вылівала ў вугал, каб ніхто не мог пераступіць праз яе і не перадаў свае хваробы дзіцяці.

Калі выпадаў малочны зуб, маці папярэджвала дзіця, каб яно не лізала языком гэта месца: лічылі, што новы тады не вырасце або будзе крывы. Вера ў гэтую прымету захоўвалася вельмі доўга, а ў некаторых месцах дайшла да нашых дзён. Яшчэ да 50 – 60-х гадоў у сельскай мясцовасці Беларусі шырока бытаваў звычай, калі дзеці кідалі выпаўшы зуб за печку і прыгаворвалі: "Мышка, мышка, дай мне касцяны зуб, на табе залаты" або "Мышка, мышка, на табе касцяны, дай мне моцны, як жалезны" і г.д.

Маленькае дзіця да года, згодна з народным павер'ем, нельга было называць "жабай" нават у жарт, таму што яно будзе гарбатае.

Хвароба, лічылі ў народзе, – жывая істота: яна прыходзіць, садзіцца на плечы, нападае на чалавека, вылятае, любіць ці не любіць тую або іншую ежу. Цікава, што рэшткі гэтага ўяўлення дайшлі да нашых дзён і нярэдка можна пачуць: "Напала хвароба" і інш. Хворае дзіця гладзілі і казалі: "Так ёй, чортавай хваробе, пайшла!".

Да выродлівых дзяцей адносіліся па-рознаму. Сяляне лічылі нараджэнне выродлівага дзіцяці божым пакараннем жанчыне за грахі і шкадавалі такое дзіця. Былі выпадкі, калі яно станавілася прадметам насмешак і кпін, асабліва з боку дзяцей.

Сярод дзіцячых хвароб даволі частай, асабліва ў маленькіх, быў "вогнік", калі твар дзіцяці пакрываўся струпамі і вельмі свярбеў. Лячыла яе бабка-шаптуха на "сходзе" месяца ці на "маладзік". Шаптуха налівала на патэльню ваду, клала вугалькі, зверху шчэпкі і падпальвала іх. Затым абводзіла пальцамі, змочанымі ў гэтай вадзе, хворае месца і загаворвала. Нагавораную ваду яна давала з сабой, выкарыстоўвалі яе ў якасці прымочак. Як адзначалі многія апрошваемыя, у большасці выпадкаў хвароба адступала і дзіця выздараўлівала.

Ад сутаргі ("корчы") лячылі такім чынам. Дзіця ставілі каля карыта і пракручвалі дзірку ў сцяне, на ўзроўні галавы, падстрыгалі валасы, пазногці на руках і нагах, якія потым

забівалі ў дзірку. Калі дзіця перарасце гэтую дзірку, лічылі, што хварэць яно больш не будзе.

Калі маленькае дзіця было неспакойным, крычала, каб супакоіць яго, давалі піць малако, закіпячонае з макам, ці настой маку, ці крыху гарэлкі, ад чаго дзіця нярэдка станавілася вялым і санлівым (Витебские... 1898, № 142, 28 лістап.).

Існавала і шмат забабонаў, што перадаваліся з вуснаў у вусны ў дзіцячым асяроддзі, якім яны шчыра верылі. Найбольш часта дзеці папярэджвалі адзін аднаго не браць у рукі зялёных жаб, ад якіх быццам бы ўзнікаюць на руках бародаўкі, не разбураць птушыных гнёздаў, бо злаўмыснік будзе канапаты, не перадражніваць паходку людзей з фізічнымі недахопамі, што можа садзейнічаць пераходу калецтва да самога дзіцяці і г.д.

Як бачна з вышэйнапісанага, уменне арыентавацца ў навакольным асяроддзі, знаходзіць сваё месца ў ім перадавалася дзецям як ад бацькоў, дарослых увогуле, так і набывалася з узаемаадносін з аднагодкамі і з жыццёвых абставін. Да гэтага трэба дадаць, што вясковыя дзеці пераўзыходзілі сваіх гарадскіх аднагодкаў сталымі адносінамі да ўсяго, што складала іх побыт, да прыродных з'яў і вылучаліся сваёй прыстасаванасцю да абставін і жыццяўстойлівасцю. Гэтаму ў многім садзейнічалі больш суровыя ўмовы жыцця і блізкасць да прыроды, неад'емнай часткай якой дзеці сябе адчувалі.



# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ Ў ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ

У жыцці дзяцей важнае месца займаюць гульні. Роля іх абумоўлена тым, што яны садзейнічаюць правільнаму фізічнаму развіццю, умацаванню здароўя, развіваюць сілу, спрыт, вастрыню зроку і слыху, а таксама назіральнасць, кемлівасць, удумлівасць, знаходлівасць, вытрымку, калектывізм, клопат аб іншых, любоў да роднага краю, пачуццё справядлівасці, прыгажосці і г.д.

У айчыннай і замежнай навуцы існуе некалькі падыходаў да класіфікацыі гульняў. У аснову структуравання адны даследчыкі клалі характар арганізацыі гульнёвага калектыву, мэтавыя ўстаноўкі, умовы для калектыўных дзеянняў гуляючых, другія – месца і час правядзення гульні, выкарыстаны інвентар, фізічныя нагрузкі і г.д. Беларускі этнограф Е.Р. Раманаў, напрыклад, падзяляў гульні на інтэлектуальныя і фізічныя ў залежнасці ад таго, якія выхаваўчыя задачы яны выконваюць (Романов. Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 553). На жаль, такая ўмоўная класіфікацыя не ўлічвае той акалічнасці, што большасць народных гульняў маюць не адзін, а некалькі выхаваўчых вынікаў: развіваюць і фізічныя, і маральныя якасці. З пункту гледжання фальклярыстычнай навукі цікавасць уяўляе класіфікацыя Г.А. Барташэвіч, якая вылучае два разрады: гульні як мастацка-драматычнае дзеянне і як сродак фізічнага выхавання (Дзіцячы... 1972. С. 31).

На нашу думку, гульні трэба разглядаць перш за ўсё як частку культуры. Традыцыйныя дзіцячыя гульні з уласцівымі ім парадкам і правіламі, накіраванымі на мадэліраванне ролевых адносін паміж удзельнікамі, дапамагалі асвойваць культуру свайго народа. Шырока распаўсюджаныя так званыя імітацыйныя гульні былі важным спосабам узнаўлення вопыту папярэдніх пакаленняў. У такія гульні дзецьмі пераносяцца ўражанні ад

убачанага ў сям'і, у тым ліку звязаныя з характарам працоўнай дзейнасці. Увогуле імітацыйныя гульні ўзнаўлялі самыя розныя жыццёвыя з'явы. Ужо на першым месяцы жыцця дарослыя вучылі дзяцей самаму простаму імітаванню (рухаў, мяўканню, крыку птушкі ці жывёлы), пазней – з дапамогай розных прыстасаванняў (свістулек, травінак і г.д.). Спачатку гульня носіць спантанны характар, пазней становіцца больш асэнсаванай, з элементамі фантазіі, калі маленькае дзіця, напрыклад, гайдае ляльку, спяваючы калыханку, ці скача на "коніку", і асэнсаванай – калі робіць простыя прылады працы. Перадача вопыту папярэдніх пакаленняў узбагачала дзіцячую культуру і садзейнічала перадачы этнічных традыцый (Дмитриев, Иванов. 1991. С. 60–61). Існуюць два тыпы пераймання культурнага вопыту: ад старэйшага пакалення і ад сваіх аднагодкаў.

У народзе існуе разуменне, што падрыхтаваць дзяцей да дарослага жыцця, памагчы ім засвоіць жыццёвыя прынцыпы, нормы паводзін лягчэй у ходзе гульні. Гульня як прыродная патрэбнасць чалавека мае для гэтага велізарныя магчымасці. Перш за ўсё яе добраахвотны характар стварае спрыяльныя ўмовы для шчырых сяброўскіх зносін, для раскрыцця здольнасцей, таленту, характару, добрых і дрэнных схільнасцей дзяцей.

Крыніцай вывучэння гульняў у дзіцячым асяроддзі сярэдзіны XIX – пачатку XX стагоддзя, іх мясцовых асаблівасцей з'яўляюцца працы вядомых этнографаў М.Я.Нікіфароўскага, М.В.Доўнар-Запольскага, Е.Р.Раманава, якія добра ведалі народныя гульні. Трэба адзначыць, што пэўная частка народных гульняў захавалася ў беларускай вёсцы да нашага часу. Аднак у апошнія дзесяцігоддзі наглядаўся працэс, калі гульні забываліся, знікалі, выцясняліся з быту ў выніку распаўсюджвання сродкаў масавай інфармацыі. Ёсць пагроза страты велізарнага культурнага пласта, а з ім – уплыву народных гульняў на фарміраванне падрастаючага пакалення з-за парушэння пераемнасці традыцый.

Аналізуючы беларускія народныя гульні, якія ахопліваюць усе сферы жыцця, нельга не адзначыць іх шырокае бытаванне на Беларусі, велізарную ролю, якую яны адыгрывалі ў выхаванні дзяцей. Гульні былі амаль адзіным іх заняткам у вольны час. Вядомы беларускі пісьменнік М.Гарэцкі падкрэсліваў наяўнасць у народным жыцці вялікай колькасці гульняў: "Ад маленства, як на ногі станець, колькі розныі гульняў перагуляець беларус! І ці мае яшчэ хоць адзін народ на зямлі столькі гульняў і жартаў, як беларус?" (Гарэцкі. Наш тэатр. 1913. С. 13). Дзякуючы выкарыстанню ў іх нескладанага інвентару, прыстасаванняў, маг-

чымасцям правядзення ў любых умовах гульні былі даступны кожнаму.

У гульнях арганічна выяўлялася сувязь чалавека з прыродай, навакольным асяроддзем. У кожнага ўдзельніка выпрацоўваліся такія каштоўныя і неабходныя для жыцця якасці, як вынослівасць, смеласць, кемлівасць, уменне арыентавацца ў навакольным асяроддзі, на мясцовасці, а таксама сіла, спрыт, хуткасць, развівалася фантазія і вынаходлівасць. Інакш кажучы, гульні садзейнічалі развіццю фізічных і разумовых здольнасцей, выхаванню пэўных якасцей, неабходных для станаўлення асобы. Дзякуючы ім хутчэй спасцігаліся мудрасць жыцця, маральныя і этычныя нормы, узнікала пачуццё калектывізму.

Гульні з'яўляюцца адным з самых старажытных пластоў нацыянальнай культуры. Яны былі вядомы яшчэ першабытным людзям, служылі крыніцай духоўнай і фізічнай радасці і развіцця асобы. Менавіта ў гульнях дзеці маглі выявіць свае здольнасці, як фізічныя, так і разумовыя, паспытаць радасць фантазіі. Многія гульні перадаваліся з пакалення ў пакаленне на працягу некалькіх стагоддзяў і мелі агульнаславянскія карані. Гэта перш за ўсё карагодныя гульні, калядныя гаданні і маскарадныя пераапрананні, "бабкі", "лапта", "гарэлышы" і інш.

Важную ролю ў беларусаў адыгрывалі традыцыі, абрады і вераванні, якія аказвалі ўплыў на гульні і былі цесна звязаны з імі. Гэта Купалле, Каляды, Гуканне вясны і інш. Больш таго, некаторыя культавыя і бытавыя абрады служылі сюжэтамі народных гульняў: "Яшчур", "Зязюля", "У тура", "Жаніцьба Цярэшкі", "Страла". Вядома, што ў развіцці беларускіх гульняў значную ролю адыгралі гістарычныя падзеі і звычаі, якія адышлі ў мінулае і знайшлі адлюстраванне ў гульнях, напрыклад, "Жану красць", "У казакоў", "Прыгон", "У вайну", "Рускія і ляхі", "Некрут", "Кароль", "У бізуна" і г.д.

Характэрнай адметнасцю народных гульняў з'яўляецца тое, што яны цесна звязаны з народнай творчасцю. Колькі ў іх розных песень, прыпевак, прымавак, загадак, элементаў народных абрадаў! А гэта, як вядома, дазваляе спасцігаць народныя традыцыі і жыццёвую мудрасць. Гульні ж для дзяцей у мінулым стагоддзі былі своеасаблівай школай, дзе адбывалася навучэнне ўсяму неабходнаму, дзе яны гартаваліся фізічна і маральна, атрымлівалі першыя жыццёвыя і працоўныя навыкі, знаёміліся з народнымі вераваннямі, звычаямі і традыцыямі.

У гульнях беларусаў знайшлі адбітак перш за ўсё тыя элементы, якія звязаны з распаўсюджваннем такіх сельскагаспадарчых заняткаў, як земляробства, жывёлагадоўля, рыбалоўства, паляўнiцтва. Гэта гульні ў аратага, пастуха, жняю, касца, рыба-

ка і г.д. Многія з іх непасрэдна звязаны з працоўнымі працэсамі, напрыклад "Пячэнне хлеба", "Пастух і авечкі", "У каноплі", "У каваля", "Рыжыкі саліць", "У копны, у кучы", "Лыкі драць", "Снапы вязаць" і г.д. Наглядаючы за працай дарослых, дзеці проста паўтаралі ў гульні працоўныя працэсы. У гульнях выкарыстоўваліся нескладаныя прадметы хатняга ўжытку або іх імітацыя. Фантазійны характар насіла і выкарыстанне ў гульні хатніх і дзікіх жывёл і птушак (гусі, зайцы і інш.).

Набор цацак у сялянскіх дзяцей у XIX – сярэдзіне XX стагоддзя быў вельмі сціплы. Пакупная цацка рэдка трапляла ў дзіцячы быт і была сапраўдным цудам. Цацкі былі самаробныя, зладжаныя бацькамі ці старэйшымі дзецьмі. Падрастаючы, дзеці самі рабілі сабе цацкі. Найбольш пашыранай у дзяцей малодшага ўзросту, асабліва ў дзяўчынак, была лялька з анучы. Добра зробленая, яна нярэдка была любай усім дзецям у сям'і і перадавалася "ў спадчыну". Звычайна ляльку шылі з тканіны, паперы. Валасы рабілі з кудзелі, воўны, нітак ці конскага воласа. Шылі і адзенне для лялек, нярэдка вельмі ўмоўнае, недэталізаванае. Хоць былі майстрыхі, якія рабілі сапраўдны касцюм, што насілі ў данай мясцовасці, толькі маленькіх памераў. Рабілі лялькі і з гліны, кары дрэва. Абавязковы прадмет для дзіцячых гульняў – мячык – валілі з воўны. Мячыкі рабілі і з анучаў, якія, як і поўсць, прапітвалі дзёгцем.

Роля цацак заключалася ў тым, што яны рыхтавалі мысленне дзіцяці да вытворчай дзейнасці. Цацкі дапамагалі замацоўваць сувязь з традыцыйнай бытавой культурай, засвойваць розныя працоўныя аперацыі і ўсведамляць розніцу полаў. Дзяўчынкі, гуляючы з лялькамі, посудам, вучыліся даглядаць маленькіх, шыць, выконваць іншыя бытавыя аперацыі, якія ў будучым спатрэбяцца жанчыне. Хлопчыкі, выкарыстоўваючы ў сваіх гульнях цацкі ў выглядзе прылад працы (плуг, барана, лапата і г.д), атрымлівалі першыя навыкі сельскагаспадарчай працы мужчыны-селяніна.

У дзяцінстве кожны сутыкаўся з сімваламі, сімвалічнымі дзеяннямі, якіх шмат існавала і існуе ў розных народаў. Імі карысталіся не толькі дзеці, але і дарослыя. Шырока вядомы, напрыклад, сімвалічныя для ўсталявання сяброўскіх сувязей у многіх народаў абрады пабрацімства, жараб'ёўка і г.д.

Сімвалы і сімвалічныя дзеянні, якімі карысталіся дзеці, былі пераняты ў дарослых. Так, рукабіццё пры сведках для замацавання дагавораў паміж сялянамі зусім натуральна існавала ў дзіцячым асяроддзі ў розных гульнях. Перш чым пачаць гульню, карысталіся такім сімвалам, як жараб'ёўка, якая павінна была вызначыць пачынальніка гульні або яе галоўную дзейную асобу.

Сімваламі суправаджаліся ў дзіцячым асяроддзі і выпрабаванні, калі прайграўшы павінен быў пацалаваць каго-небудзь, а таксама сячэнне пруцікам, вяроўкай ці іншым прадметам, поўзанне на карачках, скаканне праз агонь, дранне за вушы, "шчаўбаны" і г.д.

Шырока распаўсюджаны да сённяшняга дня сімвал "цур", якім пачыналася ("цур я!") або заканчвалася ("цур я першы!") гульня. Вядома, што ён бярэ пачатак ад боства Цур, які, на погляд беларусаў, беражэ межы зямельных уладанняў і ўвогуле аберагае права маёмасці (Очерки... 1897. С. 144). Дзеці казалі слова "цур" не толькі ў гульні, але і ў іншых выпадках: пры знаходках, здабычы чаго-небудзь "цур маё!", "цур папалам!" і г.д.

Прымаючы ў свой гурт новага члена, дзеці часта патрабавалі ад яго прысягі, абяцання, клятвы кіравацца інтарэсамі гурта і падпарадкоўвацца ім. Сімвалічным абрадам гэтага часцей было цалаванне свайго крыжыка пасля клятвы або рукабіццё.

Гульні адрозніваліся па ўзросту дзяцей. Гуляць дзеці пачыналі ва ўзросце немаўляці: спачатку дарослыя забаўлялі іх, падкідвалі і гушкалі на руках, потым, калі яны маглі трымаць у ручках прадметы, давалі самаробныя цацкі ("лялькі"). Простыя фізічныя практыкаванні, якімі, як правіла, суправаджаліся гульні маленькіх, развівалі іх рукі, а жартоўныя песенькі і прыгаворкі, імітаванне галасоў птушак і жывёл знаёмілі з навакольным жыццём, маральнымі нормамі, дазвалялі атрымаць першыя ўяўленні аб дабрыні.

З узростам пашыралася колькасць гульняў і змяняўся іх змест, яны ўскладняліся. Аднак чым большы ўзрост дзіцяці і бяднейшая сям'я, тым менш заставалася часу для правядзення вольнага часу ў гульнях з аднагодкамі, бо дзеці ў сялянскай сям'і пачыналі працаваць з 4 – 5 гадоў. Вольнае жыццё, калі можна так сказаць, было ў немаўлятак і ў раннім дзяцінстве (пераходны перыяд да дзяцінства), працягвалася нядоўга – ад 2 да 4 – 5 гадоў. У гэты час дзеці разам з засваеннем жыццёвых ведаў асвойвалі першыя нескладаныя гульні, якія былі своеасаблівым сродкам знаёмства з навакольным асяроддзем, маральнымі ўстоямі грамадства.

Немаўляці яшчэ да таго, як яно пачынала самастойна сядзець, давалі розныя цацкі, каб яно не плакала. "Цацкай" была і хлебная корка, пернік, сухарык, абаранак, кавалак морквы, бручкі, рэпы або маленькая цурачка, костачка і інш. "Чым бы дзіцёнак ні бавіўся, абы не плакаў" – так лічылася ў народзе. Калі ж цацкі ў руках не было, дзіця гуляла са сваімі ручкамі, ножкамі: перабірала пальчыкі, ссала іх. Па народнай прымеце такое дзіця лічылі недаўгавечным, а таму стараліся прадухіліць такія за-

няткі і давалі яму цацкі ці забаўляльныя прадметы. У сялянскай сям'і цацкам не прыдавалі выхаваўча-развіваючае значэнне. Перш за ўсё трэба было на нейкі час забавіць дзіця, каб мець магчымасць справіцца з хатняй працай.

Ведаючы, што кожны прадмет або цацку, якія траплялі ў рукі маленькіх, яны без разбору цягнуць у рот, маці старалася даваць тыя, што не пашкодзяць ім, папярэдне памыўшы ці выцершы іх.

Першыя гульні дзіцяці, якое самастойна магло сядзець, а потым і станавіцца на ножкі, былі звязаны з лялькай. Маці ці старэйшыя дзеці, падаючы такую цацку, казалі дзіцяці, што гэта "лялька", і паказвалі, як яе "няньчыць". Дзіця засвойвала першыя паняцці: "ляля" есць, п'е, ходзіць, размаўляе, спіць і г.д.

Гульня з цацкамі вельмі захапляла дзіця, і маці ў гэты час магла займацца хатнімі справамі. Таму, пачынаючы з калыскі, маленькім давалі для забаўкі самаробныя цацкі або прадметы, якія б не былі вострымі, калючымі, каб яно не зрабіла сабе шкоды. Немаўля магло працяглы час гуляць з такімі прадметамі-цацкамі. Час ад часу маці ці старэйшыя дзеці падыходзілі да яго, каб зноў даць згубленую цацку ў маленькія ручкі – "лапуркі" (Никифоровский. Очерки... 1897. № 3. С. 22).

Падрастаючы, дзіця пачынае разумець, што не кожны прадмет, з якім яно гуляе, "смачны". На другі год жыцця дзеці пачынаюць ужо гуляць з цацкамі больш свядома. Дзяўчынкі апранаюць ляльку або звычайную цурку, якая выконвае яе ролю, у "сукенку", "спавівае", "корміць" ляльку. "Лялькай" дзіця называе ўсё, што падобна на людзей ("ляля ідзе").

Усе астатнія прадметы гульні ў маленькіх называліся "цацкі, цацы, цыцынькі, цацунькі". Як адзначалася, цацак "мануфактурнага" паходжання ў сялянскіх дзяцей амаль не было. Як правіла, цацкі дзеці рабілі самі альбо з дапамогай старэйшых дзяцей ці бацькоў. Што датычыць гульні "ў лялькі", то звычайна ў яе гулялі дзяўчынкі, пачынаючы з маленькага ўзросту да падлеткавага, а то і пазней. Забавай хлопчыкаў лялька была толькі ў перыяд маленства.

У беларусаў была своеасаблівая школа пешчання. Немаўлятак забаўлялі, прывучалі да простых гульняў з дапамогай пацешак, якіх багата мелася ў народнай творчасці. Так, падкідвалі дзіця на руках, пахлопвалі яго па плечуках, пагладжвалі па жывоціку, згіналі і выпрамлялі ручкі і ножкі, робячы гімнастыку дзіцяці і суправаджаючы яе спецыяльнымі забаўлянкамі, як імправізаванымі, так і ўсім вядомымі ў той ці іншай мясцовасці.

Крыху пазней маці ці нянька, трымаючы голую ручку дзіцяці ўверх далоняй, вадзіла па ёй пальцам і спявала:

– Ласачка, ласачка,
Дзе была?
– У Бога была.
– Што рабіла?
– Кросны ткала.
– Што заткала?
– Кавалак сала.

Потым, узяўшы дзіця на рукі, спачатку сама ціхенька пляскала дзіцячымі далонямі і прыпявала:

Лады-лады-ладкі.
Дзе былі? – У бабкі!
– Што елі? – Кашку!
Што пілі? – Бражку!
Кашкі паелі,
Бражкі папілі,
На галоўку селі,
Пырх – і паляцелі.

На апошніх двух радках маці ўзнімала ручкі дзіцяці ўгору, дакраналася да галоўкі і пачынала махаць яго ручкамі, імітуючы палёт птушкі. Такія забаўлянкі выклікалі захапленне і смех дзіця, былі пацехай і своеасаблівай гімнастыкай.

Забаўлянкі тыпу "сарока-варона" мелі шмат варыянтаў і былі добра вядомы кожнаму дзіцяці. Звычайна ўпершыню іх чулі ад маці, старэйшай сястры або бабулі, пазней дзіця само спрабавала пляскаць у далоні пры першых словах забаўлянкі:

Сарока-варона
Кашку варыла,
Дзетак карміла:
Гэтаму давала
Гэтаму давала,
Гэтаму давала,
Гэтаму давала.
А ты, пальчык,
Маленькі пальчык,
Схадзі па вадзіцу
У сцюдзёну крыніцу...

Далей маці дакраналася да розных месцаў на руцэ дзіцяці, пачынаючы з кісці, і пры словах:

Тут крыніца,
Тут сцюдзёна вадзіца

асцярожна казытала маленькага, які стараўся ўхіліцца і смяяўся. Трэба сказаць, што гэтыя забаўлянкі даволі шырока бытуюць як у вёсцы, так і ў горадзе і іх расказваюць, каб суцешыць ці забавіць дзіця, узняць настрой.

Захаваліся да нашых дзён і наступныя забаўлянкі. Загнуўшы сярэднія пальцы рукі і выцягнуўшы ўперад указальны і мізінец у выглядзе рожак (імітуючы казу), дарослы спяваў (Дзіцячы фальклор. С. 223):

Ішлі козы рагатыя, багатыя:
— Каго пападу, таго забаду!
Аксютку папалі,
Аксютку забадалі:
Будык-будык-будыкі!

З апошнімі словамі казыталі дзіця (нядоўга), а яно смяялася. З забаўлянкі маленькае пазнавала, што каза можа "забадаць".

Забаўляючы дзіця, клалі яго на жывоцік, спінку, пагладжвалі і спявалі. Прыемны матчыў песні, а таксама лёгкі масаж спіны, жывата, ручкі або ножкі супакойліва ўздзейнічалі на дзіця. Цяпер мы добра ведаем пра дзеянне кропкавага масажу. У народзе здаўна інтуітыўна карысталіся ім. Так, узяўшы ножку дзіцяці, ціхенька стукалі пальцам па падэшве спачатку адной, затым другой нагі, прыгаворваючы:

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Куплю чаравічкі,
Малы, невялічкі,
На Валюшкіну ножку.
Кую, кую другую,
Паеду ў другую.
Дарожка – даўгая,
А ножка – малая.

Развівалі рухі дзіцяці простыя фізічныя практыкаванні, якія выконваліся з дапамогай дарослых. Вельмі распаўсюджаным было гушканне дзіцяці на руках і на нагах пад напеў спецыяльных забаўлянак, так і з імправізацыямі. Пасадзіўшы яго на калені, спявалі:

Чук-чук-чук,
Налавіў дзед шчук,
А баба – плотак
Ды пазвала цётак.

Пры гэтым дзіця злёгку падкідвалі і пакачвалі. У імправізаваных забаўлянках, якія заканчваліся словамі “Гук, яма!”, калені расстаўляліся, дзіця падала і тут жа яго падхоплівалі. Вельмі падабаліся маленькім гушканні на нагах: дзіця садзілася або клалася на ногі, іх падымалі і апускалі долу.

Вучылі дзіця хадзіць, трымаць раўнавагу, водзячы па лаўцы, прыгаворваючы: “Топ, топ...”

Вельмі любілі маленькія і прасцейшыя гульні, адной з якіх была “дзіравыя гаршкі”. Любілі яе праводзіць з маленькімі старэйшыя дзеці. Пасадзіўшы дзіця сабе на плечы, скакалі з ім па хаце і прыгаворвалі: “Прадаюцца дзіравыя гаршкі!” або “Гаршкі, гаршкі дзіравыя!”. Прысутныя ціхенька пляскалі пры гэтым малога па спіне, чым прыносілі вялікае задавальненне дзіцяці, якое станавілася аб’ектам усеагульнай увагі.

Забаўлялі і пацяшалі дзяцей і з дапамогай танцаў і жартоўных песень. Вучылі першым гукам, імітуючы хатніх жывёл і птушак: “мяў”, “гаў” і г.д., а таксама добраму стаўленню да іх. Пры словах “Коця харошы!” гладзілі ката спачатку сваёй рукой, а потым рукой дзіцяці. Са словамі “ харошы” гладзілі па галаве, спіне ці руцэ маці, бацьку, сястру, брацiка. Нярэдка казалі пры гэтым: “Абдымі або пацалуй тату, брацiка...” або пыталіся ў маленькага: “Пакажы, як ты любіш брацiка” і ён імкнуўся абняць ручкамі або пагладзіць. Дзеці атрымлівалі такім чынам першыя ўяўленні аб добрых адносінах, пяшчоце, любві. Акрамя таго, знаёміліся з жывёламі і птушкамі, пачыналі разумець месца і ролю кожнага з іх у жыцці і быце людзей.

Як адзначалася, сярод гульняў у малых дзяцей найбольш распаўсюджаны былі імітацыйныя гульні, з якіх яны ўзнаўлялі дзеянні хлебароба, касца, пастуха, каваля, рыбака і іншыя. У іх не толькі характарыстыка розных работ, але і назвы інвентару, прылад працы, якімі карысталіся пры гэтым, а таксама прадметаў хатняга ўжытку, пабудоў, назвы хатніх і дзікіх жывёл і асоб: “хата”, “вол”, “гусі”, “ваўкі”, “каноплі”, лён”, “шпень”, “пастух”, “рыбак”. Па ўспамінах доўгажыхароў, дзеці малых узростаў (з 2 – 3 да 8 – 10 гадоў) перш за ўсё гулялі ў “сяўбу”, “сенакос”, “уборку ўраджаю” і інш. Яны па прыкладу дарослых “рабілі” сельскагаспадарчы інвентар: саху, барану, тапорык, граблі, калёсы і іншыя прылады і на невялікім кавалачку зямлі або пяску “сеялі”, “баранавалі”, “касілі”, “жалі”, “малацілі”, “рубілі лес” з дапамогай самаробных прыстасаванняў. Цікава, што сельскагаспадарчыя і хатнія прадметы ў гульнях дзяцей распрацоўваліся дэталёва, працэс за працэсам, з падрабязнасцямі. На вясковай вуліцы яны “жалі” або бралі лён, вязалі яго ў снапы і ставілі ў “бабкі”, потым абмалочвалі з дапамогай палкі. Пры гэтым яны

размаўлялі паміж сабой наконт "ураджаю" і плёну сваёй працы, імітуючы размовы бацькоў і суседзяў.

Вельмі распаўсюджанай сярод малых дзяцей была гульня "ў дом", у якой прымалі ўдзел дзеці абодвух полаў. У гэтай гульні ўзнаўляліся хатнія працы: прыгатаванне ежы, мыццё бялізны, уборка, догляд за дзецьмі і г.д. Звычайна дзяўчынкі выконвалі ролю маці, а хлопчыкі – бацькі. Яскрава бачны ў ёй існуючы ў сям'і падзел працы на "мужчынскую" і "жаночую", а самае галоўнае – імітацыя ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, мужа і жонкі. Назіраючы за гульнёй дзяцей, можна было ўявіць узаемаадносіны ў сям'і гэтых дзяцей. Даслоўна ўзнаўлялі дзеці пахвалу і лаянку, расказы дарослых і нават іх дыкцыю і жэстыкуляцыю. "Маці" часцей выступала клапатлівай, добрай, спагадлівай, "бацька" – руплівым і сур'ёзным гаспадаром, загады якога былі законам для ўсіх.

Асобныя гульні дзяцей, нягледзячы на іх аднастайнасць, цягнуцца па 2 – 3 гадзіны і не надакучваюць ім. Гэта імітацыйныя гульні ў "маці і дачку", "у дом" і інш. У працэсе гульні дзеці паказваюць, што дачка павінна слухацца маці, выконваць яе даручэнні. У гульні "ў дом" ідзе навучэнне розным хатнім справам, развіваецца ўменне размяркоўваць абавязкі, даводзіць да канца пачатую справу.

У гэтай гульні, як і ў іншых, прысутнічалі самаробныя прадметы або іх імітацыя, выкарыстоўваліся старыя непатрэбныя рэчы, якія атрымлівалі "статус" таго ці іншага прадмета або рэчы. Так, "ролю жывёлы" (свіней, коз, авечак, кароў) маглі іграць іх гліняныя ці драўляныя выявы або простыя каменьчыкі (летам – розныя жучкі, якіх то трымалі ў "хляве", то выпускалі "пасвіцца"), "хлеба" – аладка з пяску, "стравы" – шышкі, травы, лісце, палачкі, лыжкі – вычышчаная макавая галоўка, "леса" – утыканыя ў пясок або зямлю веткі дрэў ці траў, пер'е птушак і г.д. Дзяўчынкі любілі гуляць "у абедкі", сэнс якой у частаванні адзін другога, напрыклад, "хлебам", "яблыкамі" і г.д.

Такім чынам, гульні былі звязаны з гісторыяй народа, яго культурай, бытам і працоўнай дзейнасцю. Сярод іх найбольш распаўсюджаны гульні: "У гуські", "Пікар", "Кашка", "Свінка", "Елка", "Хатка", "Гарлачыкі", "У пераскочкі", "У казу", "У чыжыка", "У чорта", "У пана", "Гусі-лебедзі". Прыстасаваннямі ў гэтых гульнях-бавах былі розныя рэчы: вяровачка, дошка, костачка, каменьчыкі, цурачка, кнуцік, радзей – мячык.

Цікава адзначыць, што дзіцячыя гульні былі не толькі сацыяльна, але і нацыянальна дэтэрмінаваны. Яшчэ А.С. Дамбавецкі адзначаў, што калі ў дзяцей беларусаў кнуцік, конік, салдацік, барабанчык, тапорык былі цацкамі для гульні, то ў

яўрэйскіх – дзіцячыя цацкі і самі гульні былі звязаны з гандлем, рамяством, пазыкамі і г.д.

Існавалі пэўныя правілы гульні. У залежнасці ад абставін, яны маглі крыху мяняцца. Звычайна перад пачаткам гульні размяркоўваліся ролі з дапамогай лічылак – кароценькіх вершыкаў з добра выяўленым рытмам, які больш-менш звязаны (ці не звязаны) са зместам гульні.

З надыходам вясны пачыналіся гульні дзяцей на свежым паветры. У раннім дзяцінстве любімай гульнёй было качанне па траве, асабліва на ўзгорках. Разам з аднагодкамі на траве можна было пакуляцца праз галаву. Лета давала шырокія магчымасці для гульні "У жмуркі" ("кулюкушкі", "хованкі" і г.д.). Для гульняў дзеці выкарыстоўвалі розныя расліны. Так, хлопчыкі рабілі сабе накідкі з конскай цыбулі (Касяровіч. 1930. С. 16). Ад дажджу ладзілі "капелюшы" з вялікіх лісцяў лопуха; кара асобных дрэў ішла на паяскі; у якасці ўпрыгожання хлопчыкі выкарыстоўвалі пер'е птушак, дзяўчынкі – плялі вянкі з кветак і траў, рабілі пацеркі з ягад рабіны, шыпшыны і г.д. Калі гульня патрабавала пераўвасаблення ў "індзейцаў" ці каго іншага, у ход ішлі ягады чарніц, суніц, а таксама гліна, якімі вымазвалі твар, рукі, ногі. Увогуле летнія гульні былі больш разнастайнымі і масавымі, бо ў гэты час ствараліся часовыя каманды, гурты для спаборніцтва адзін з другім.

Паўсямесна на Беларусі месцамі гульняў былі вясковыя прасторы. Хаваліся ў лесе, гумне, клеці, на вуліцы, двары, у хаце. Выбар канкрэтнага месца хованкі залежаў і ад фантазіі гуляючых, якія маглі схавацца пад бочкай, залезці ў стог сена або саломы, пад страху. Знайсці іх часам было няпроста. Разнавіднасцей гэтай гульні было шмат: "Квачыкі", "Агарыш", "У мароза".

Любімай гульнёй дзяўчынак была, ды і зараз застаецца, гульня "ў класы". Ледзь толькі сыходзіў снег, а часам і на падсохлых праталінах яны робяць "класы" – рысуюць клеткі. Адзіным прыстасаваннем гэтай гульні быў кавалачак чарапка, шкла, які кідалі па чарзе ў першую, другую і г.д. клетку і, скачучы на адной назе, адбівалі ў наступную, стараючыся не трапіць нагой або "біткай" на рысы, што раздзялялі "класы".

Узроставыя асаблівасці гульняў бачны на прыкладзе "блазнаў". Свой вольны час "блазны" з дазволу бацькоў праводзілі ў гульнях з аднагодкамі на вясковай вуліцы, выгане або двары. Летам яны бегалі босыя, у адной сарочцы і нярэдка да вечара, не заўсёды траплялі дадому паабедаць і задавольваліся, чым угосцяць у прыяцеляў. Занятыя працай дарослыя мала турбаваліся з-за іх адсутнасці, бо сялянскія дзеці былі даволі самастойнымі і за імі не было дро-

бязнай апекі бацькоў. Ды і чуллівая маці аднаго з дзяцей заўсёды знаходзіла, чым накарміць сяброў сваіх дзяцей. Гэта было ў традыцыі беларусаў.

У гульнях дзяцей адлюстроўвалася і грамадскае жыццё вёскі. Вядомымі былі гульні ў "старасту", "урадніка", "папа", "пана", "прыгон", "рэкруты", "жабракоў", "цыганоў" і інш.

У гульнях паказаны ўсе бакі жыцця селяніна – і радасныя, і сумныя ("у хрэсьбіны", "у вяселле", "у свята", "у хаўтуры" і г.д.).

Толькі ў апошнія два дзесяцігоддзі амаль знікла з дзіцячага побыту вядомая з далёкіх часоў гульня "ў конікі". Яна не патрабавала асаблівых прыстасаванняў і ў яе гулялі малодшыя дзеці пачынаючы з двух гадоў і ўключаючы перыяд блазноцтва. Дастаткова было мець невялікую вяровачку з лыка або паясок, якія працягвалі ў зубы "коніку", і "кучар" удала скакаў на ім. Нярэдка падганялі "коніка" дубцом або кнуцікам, пакрыкваючы на яго, як заўзятыя вознікі. Хлопчык, які выконваў ролю каня, імітаваў яго бег, пераходзячы з трушку ў галоп. Гулялі ў гэтую гульню і на карачках. Гэта ігра давала магчымасць выхаду дзіцячай энергіі. Разам з тым нельга не заўважыць, што дзеці не проста імітавалі працу дарослых на кані. Яны вучыліся кіраваць канём. "Возік" заўсёды кранаў тую ляйчыну, у які бок трэба было павярнуць "каня". Больш таго, асабістыя назіранні кожнага з дзяцей праяўляліся ў тым, як ён гладзіць "коніка", як клапоціцца аб ім – корміць і поіць яго і нават як абыходзіцца з ім (ласкава, спагадліва або груба, жорстка).

Гульня "ў коніка" была шырока распаўсюджана на Беларусі. Для самых маленькіх хто-небудзь са старэйшых дзяцей (радзей – бацька) наладжваў гэтую гульню ў пакоі, сам пры гэтым выконваў ролю "коніка". Дзіця ўзбіралася на спіну "коніку", трымаючыся рукамі за шыю або вушы, спрабавала паскакаць на ім. Час ад часу неўтаймаваны "конік" спрабаваў скінуць седака, якому патрабаваўся навык трымацца з усяе моцы.

Дух змагарства, магчымасць паспрабаваць сваю сілу і вынослівасць наогул былі характэрны для гульняў дзяцей розных узростаў. Самай простай і распаўсюджанай сярод іх была гульня "ў абгонкі" ("перагонкі", "навыперадкі" ці "хто каго абгоніць"). Звычайна дыстанцыя выбіралася на вуліцы, выгане, каля лесу. Па камандзе аднаго з гуляючых пачынаўся бег, пры гэтым кожны імкнуўся першым дасягнуць фінішу – каменя, дрэва, агароджы, лесу і г.д. Пераможца павінен быў плюнуць ва ўстаноўленым месцы і вымавіць: "Цур!"

Сіла і спрыт патрабаваліся дзецям для хадзьбы на хадунах.

Для гэтага трэба было зрабіць хадуны, якія ўяўлялі сабой дзве высокія палкі, да якіх на вышыні каля метра прыбівалі цуркі – ступені для ног. Хадзьба на хадунах была справай няпростай, каб навучыцца хадзіць, трэба было шмат трэніравацца. Гэтая гульня захапляла перш за ўсё падлеткаў і нават юнакоў.

У падлеткаў разам з гульнямі, якія патрабавалі шмат фізічнай сілы, былі такія забавы, дзе неабходна была кемлівасць. Шырока вядомымі гульнямі падлеткаў былі "Жгуцікі", "Шлякі", "Гарадкі", "Капустка", "Каралі ці біркі", "Сеч капустку", "Куць", "Цот і лішка", выбіванне з ямы арэхаў, жалудоў, гульні ў каменьчык і інш. Такія гульні, як "Капустка", "Куць", сутнасць якіх – біццё працiўніка па руцэ кулаком або рабром далоні, выпрацоўвалі ўменне выкарыстаць няспрытнасць, памылкі працiўніка і нават развівалі акцёрскія здольнасці, бо трэба было паказаць фальшывую трывогу або бесклапотнасць і г.д. Умелай маскіроўкі ад удзельнікаў гульні патрабавала гульня "Жгуцікі" – біццё скручанай хусткай па спіне. Атрымаўшы ўдар, ігрок павінен быў беспамылкова адгадаць, хто з таварышаў ударыў. Гэта было нялёгка, бо ўсе рабілі бесклапотны выгляд, такім чынам стараліся адвесці падазрэнне ад сябе.

Што датычыць гульні з выбіваннем арэхаў ці жалудоў з ямкі, то яна патрабавала практычных навыкаў, каб стаць лоўкім ігракам.

Любімай гульнёй хлопчыкаў-падлеткаў была гульня "У шлякі" ("бабкі"), для якой кожны спецыяльна рабіў сабе "бітку" і насіў яе ў кішэні. Яна патрабавала ад ігрока тонкага вакамера і лоўкасці рукі, каб кінуць бітку ў пэўнае месца і каб яна лягла правільна.

Трэба адзначыць, што большасць гульняў – і гэта асноўная іх рыса – патрабавала шмат фізічнай сілы, спрыту, кемлівасці, у выніку дзеці атрымлівалі добрую фізічную загартоўку. Вясковыя дзеці ўжо ў падлеткавым узросце былі фізічна загартаванымі, вынослівымі і маглі выконваць работы ў полі і па гаспадарцы, якія патрабавалі шмат сілы. Бег, скокі праз канаву, роў, бар'ер і г.д. фізічна развівалі дзяцей.

Вясковыя дзеці ведалі і зімовыя гульні. У XIX стагоддзі асаблівых прыстасаванняў для катання па лёдзе ці снезе ў іх не было. Заменай ім былі самаробныя канькі, якія падвязвалі да катанак, звычайныя гаспадарчыя санкі. Збіраліся для зімовых гульняў часцей на выгане, на ўзгорках, возеры або рацэ. З гары каталіся на санках, на якія нярэдка ўсаджвалася цэлая гурба дзяцей. Смехам, жартамі суправаджалася кулянне ў снег, калі сані пераварочваліся. Як і зараз, дзеці любога ўзросту з

захапленнем гулялі ў снежкі. Калі не было санак, каталіся з горак на любых дошках.

У Магілёўскай губерні для катання зімой выкарыстоўвалі "казу" – дошку з выгнутым спераду носам (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70. Л. 4). У ёй рабілі чатыры дзіркі, заганялі туды калкі і прыбівалі зверху яшчэ адну дошку. Потым некалькі разоў аблівалі ніжнюю дошку вадой знізу, куды дадавалі конскага гною. На ёй добра было коўзацца з гары дзецям, якіх шмат змяшчалася ў "казе".

Адной з любімых гульняў дзяцей і моладзі было гушканне на арэлях ("гутарэлях"). Звычайна арэлі наладжвалі на вуліцы або ў садзе, дзе на дрэве або на слупах прывязвалі вяроўку. Для зручнасці ўнізе клалі дошчачку. Для маленькіх арэлі рабілі ў хаце (зімой), дзе вяроўку прыладжвалі да крука ці кольца, убітага ў брус на скрыжаванні пакояў (уваход у другую палавіну хаты).

Сабраўшыся гуртамі, дзеці любілі гуляць "у фанты", "жмуркі", "сапсаваны тэлефон", "у вугалькі" і інш.

Дзяўчынкі летам скакалі праз вяровачку. Гэта вельмі рухавая гульня, у ёй расходавалася шмат энергіі. Нярэдка працягвалася яна па 2–3 гадзіны.

У юнакоў і дзяўчат важнае месца займалі танцы – "скокі". Скакаць любілі ўсе. Танцавалі "Лявоніху", "Мікіту", польку, кадрылю, мазурку, люстэрка, падэспань, казака, зялёны, цыганачку, кракавяк і інш. Запрашаліся музыкі з гармонікам, скрыпкай, радзей – з цымбаламі.

Даволі папулярнай у хлопчыкаў, асабліва падлеткаў, была барацьба ("боркі") – накшталт сучаснай вольнай барацьбы. Гэта адна са старажытнейшых гульняў не толькі дзяцей, але і дарослых. Найбольш распаўсюджана была барацьба "да крыжа", калі праціўнікі стараліся паваліць адзін другога на зямлю спінай, і пераможцам станавіўся той, хто пры гэтым трымаў праціўніка за раскінутыя ў бакі рукі. Атрымлівалася фігура ў выглядзе крыжа.

Сярод гульняў, якія патрабавалі фізічнай сілы і вынослівасці, вядома хлапчуковая гульня "ў зацэп". Сутнасць яе ў тым, што двое хлопчыкаў, седзячы адзін насупраць другога, счэплівалі сярэднія фалангі сагнутых пальцаў і цягнулі адзін другога да таго часу, пакуль пераможца першым разагне палец праціўніка.

На Беларусі шмат народных гульняў суправаджалі святы і абрады. Так, на Юр'я дзеці вадзілі карагоды, гулялі "У тура", "Мужа і жонку", "Свінку", "Ваўка і авечку", "Гусі-лебедзі" і інш.

Калядныя святы, свята Тройцы, русальны тыдзень, Купалле таксама не абыходзіліся без гульняў ("баў"), якія былі неад'емнай і, можна сказаць, важнай састаўной іх часткай. Яны былі традыцыйнымі, і кожны падлетак удзельнічаў у іх. Да гульняў дзяцей нярэдка далучаліся і дарослыя.

Назвы ўдзельнікаў гульні звычайна ўтвараліся ў залежнасці ад гульневых сюжэтаў: пастух, авечка, жняя, касец, рыбак і г.д. Арганізатары ці галоўныя дзеючыя асобы часта мелі назву "матка" або "старшы", "войт". Гулялі або "самі за сябе" – індывідуальна, або "ўсе за ўсіх" – камандныя гульні. Месца разметкі, дзе праходзілі гульні, называлі "поле", "горад", "кон", "мета", "гняздо" ў залежнасці ад віду гульні. У гульнях карысталіся палкамі, цуркамі, пугамі, барановымі костачкамі, драўлянымі і металічнымі палачкамі, шарыкамі, мячыкамі. Гэта асноўны інвентар дзіцячых гульняў. Выкарыстоўваліся іншыя прадметы, якія знаходзіліся на вуліцы: каменьчыкі, шышкі, розныя травы і г.д.

Найбольш распаўсюджаным спосабам размеркавання роляў былі лічылкі – рыфмаваныя і вельмі рытмічныя кароткія вершы, звязаныя па зместу, альбо проста набор рыфмаваных слоў. Выкарыстоўвалі і спосаб жараб'ёўкі. Гуляючых для сваёй каманды звычайна выбіраў завадзіла ("матка").

Пакараннем прайграўшых было, як правіла, выкананне ў гульні супрацьлеглай ролі або аддача прайграўшым фанта, выкананне ім песні, танца. Хоць сустракаліся гульні, дзе прайграўшаму "даюць пытку" (білі па тыльнай частцы далоні), "даюць жгута" (па спіне "кнутом" у выглядзе скручанай хусткі або шапкай), праганялі "праз строй" (кожны з удзельнікаў шчыпле або піхае прайграўшага).

У гульні "У гарадкі", напрыклад, прайграўшы павінен быў на сваёй спіне перанесці пераможца "з горада ў горад". Узнагародай за перамогу ў гульнях "У бабкі", "У казанца", "У косці" станавіліся збітыя пераможцамі бабкі. У шырокараспаўсюджанай гульні "У ножыкі", якая дайшла да нашых дзён, прайграўшы павінен зубамі выцягнуць з зямлі забіты калок, што часта было нялёгкай справай, бо забівалі яго на ўзроўні з зямлёй.

Аналізуючы маладзёжную гульню "Жаніцьба Цярэшкі", нельга не заўважыць яе выхаваўчае значэнне і асабліва вялікую ролю ў падрыхтоўцы моладзі да шлюбу. Яна была своеасаблівай рэпетыцыяй вясельнага рытуалу. А калі "рэпетыцыя" адбывалася некалькі разоў, асноўныя моманты вяселля добра засвойваліся прысутнымі і запаміналіся. У гэтай гульні ішло навучанне тактоўнасці, добрым адносінам паміж людзьмі, чаму нямала спрыяў ласкавы гумар: нязлосна высмейваліся няўмелая праца і ра-

зам з тым існавала забарона на высмейванне фізічных недахопаў чалавека.

Такім чынам, гульні мелі важнае значэнне ў жыцці дзяцей, садзейнічалі выхаванню. Велізарная разнастайнасць народных гульняў і іх шырокае бытаванне на Беларусі рабілі іх своеасаблівай школай, дзе дзеці развіваліся фізічна і маральна, узнавалі першыя паняцці аб навакольнай прыродзе і грамадстве. Як рэальная частка народнай культуры гульні цесна звязаны з гісторыяй народа, яго бытам, працоўнай дзейнасцю, звычаямі, абрадамі, традыцыямі. У вясковым асяроддзі пэўная частка гульняў захавалася да нашых дзён.

Сёння наглядаецца збядненне свету дзіцячай гульні. У значнай меры гэта адбываецца таму, што дзеці амаль не ўдзельнічаюць у працоўных працэсах, а таксама ў выніку раздзялення дзіцячага грамадства на фармальныя ўзроставыя групы, у выніку чаго паслабляецца ўзаемасувязь паміж імі, а значыць, і перадача народнага вопыту. На гэта ўплывае тое, што пераважная большасць дарослых выключылі з выхавання гульню і замянілі яе кнігай. А без дапамогі дарослых дзіцячая культура здольная толькі да элементарнага ўзнаўлення простых гульняў спартыўнага характару. У выніку адбываецца знішчэнне народных традыцый, асабліва ў гульнях дзяцей буйных гарадоў.



# ДЗЕЦІ Ў ВЕРАВАННЯХ І АБРАДАХ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

У сялянскім асяроддзі да пачатку XX стагоддзя моцна і стабільна захоўваліся старажытныя з'явы ў вераваннях, звычаях і абрадах, светаўспрыманні, а таксама ў выхаванні дзяцей. Стэрэатыпы паводзін і ўяўленняў, якія маюць вытокі з даўніх часоў, трымаліся на прынцыпе "старыны не рухаці", "так рабілі нашы дзяды". Беларусы лічылі старадаўнія звычаі найбольш зразумелымі і непарушнымі, таму што яны ішлі ад дзядоў і прадзедаў і перадаваліся нашчадкам.

У дадзеным раздзеле мы разгледзім народныя вераванні, звычаі, прыметы, абрады і традыцыі, якія звязаны з нараджэннем, ростам, бытам і жыццём дзяцей увогуле. Адны з іх былі вынікам багатай фантазіі беларуса, другія – мелі рэальны змест, трэція – культавае значэнне, частка з іх сумяшчала ў сабе ўсе гэтыя адзнакі. А.Кіркор яшчэ ў мінулым стагоддзі як рысу нацыянальнага характару беларусаў адзначаў багатую ад прыроды фантазію, наяўнасць творчых сіл, дасціпны розум, схільнасць да гіпотэз і своеасаблівых тлумачэнняў з'яў прыроды (Киркор. Следы... 1882. Т. III. Ч. II. С. 317). Большасць народных вераванняў, звычаяў і абрадаў мелі вялікі выхаваўчы ўплыў на дзяцей.

Найбольш цікавыя звесткі па гэтых праблемах утрымлівае фальклор. У народных паданнях, казках захаваліся рэшткі першабытнага светапогляду, згодна з якім існавала вера ў нараджэнне дзіцяці (асабліва багатыроў) без бацькі, без маці – з костачкі, зерня, гарошыны і г.д. Дастаткова жанчыне было праглынуць гарошыну ці зярнятка і яна зацяжарыць і народзіць дзіця (як у казцы "Пакаці-гарошак").

Рэшткі татэмістычных вераванняў, у якіх прызнавалася сваяцкая сувязь чалавека з пэўным відам жывёлы, бачны, напрыклад, з казкі "Івашка – мядзведжае вушка".

Няясныя ўяўленні старажытных людзей аб з'яўленні дзяцей можна ўбачыць і на прыкладзе культа дрэва, бусла. Так, звычай садзіць дрэва пры нараджэнні дзіцяці, напэўна, звязаны з верай старажытных людзей у магчымасць з'яўлення дзяцей з дрэва. Да сённяшняга дня дайшоў да нас водгаласак старажытнага веравання аб бусле, які быццам бы прыносіць душу нованароджанага. І зараз маленькім пры з'яўленні браціка ці сястрычкі гавораць, што іх прынёс бусел. Ёсць і іншае тлумачэнне асабліва цёплых і паважлівых адносін беларусаў да гэтай птушкі.

Згодна з народным паданнем, бусел – гэта чалавек, якому Бог даверыў вартаваць гадаў, а ён парушыў яго запавет і незнарок выпусціў іх.Ператвораны за гэта ў бусла, ён вымушаны цяпер збіраць іх. Народ верыць, што бусел прыносіць шчасце і дабрабыт, таму чапаць буслоў ці знішчаць іх забаранялася, і кожны селянін лічыў за шчасце, калі ў яго двары пасялялася гэта птушка. Нярэдкія былі выпадкі, калі на страсе хаты ўстройваліся дзве сям'і буслоў і яшчэ тры сям'і – дзе-небудзь на гумне ці амбары.

Шмат вераванняў было звязана са смерцю дзяцей. Па сведчанні Е.Раманава, памёршыя немаўляткі ў беларусаў лічыліся святымі. Згодна з народнымі ўяўленнямі, яны ў замагільным жыцці сустракаюць сваіх хросных бацькоў з запаленымі свечкамі і ўвогуле там (у царстве нябесным) апекунамі іх з'яўляюцца не родныя, а хросныя бацька і маці.

Народныя ўяўленні знаходзілі добрую глебу. Пачынаючы з маленства і нават з калыскі дзіця слухае казкі, паданні, песні, гісторыі аб паходжанні свету і чалавека, навакольнай прыродзе, розных духах і верыць у самае неверагоднае. У народных уяўленнях важнае месца займала вера ў розных духаў. Гэту веру выкарыстоўвалі і ў працэсе выхавання. Каб супакоіць маленькае дзіця, дарослыя запалохвалі яго рознымі страшэннымі істотамі, духамі, нячысцікамі, якія быццам заўсёды знаходзяцца непадалёку, а таму могуць прыйсці і пакараць непаслухмянае дзіця. Адной з такіх істот у беларусаў была Мара. Напрыклад, калі дзіця не хацела засынаць, капрызіла, а на вуліцы ў гэты час чуліся гукі, падобныя на ўдары ў чыгунны кацёл, яму гаварылі, што гэта ідзе Мара – велізарнае страшыдла на кароткіх лапах.

Яшчэ, каб суцешыць дзіця, калі не дапамагалі ласкі, запалохвалі ваўком, які быццам бы толькі і чакае, каб схапіць малога і панесці ў лес. У якасці страшыдлы выступаў дзед-жабрак і пан, пры з'яўленні якіх малыя, як правіла, хуценька хаваліся на

печ ці іншае месца, помнячы матчыны словы аб тым, што непаслухмяных дзяцей воўк забірае ў торбу, а дзед-жабрак – б'е.

Зімой, калі за акном завываў вецер ці чулася выццё ваўкоў, якія падыходзілі да самай хаты, селянін расказваў дзецям, што гэта ідзе ўладар марозаў Зюзя. Малявалі яго ў выглядзе сівога старца з доўгай барадой, босымі нагамі, у доўгім белым кажуху, без шапкі, з жалезнай булавою (Киркор. Следы... 1882. Т.III. Ч. II. С. 253). Вядома, такі грозны бог наводзіў страх на дзяцей і яны ў зімнія вечары хаваліся на печы. Дарослыя ўнушалі дзецям, што нельга гнявіць Зюзю, інакш ён прыдзе ў вёску, стукне аб пень і пачнуцца страшэнныя траскучыя маразы, ад якіх няма паратунку. І таму ў калядную куццю першую лыжку куцці прапаноўвалі марозу (кідалі за акно або астаўлялі ў спецыяльнай місцы).

Цікава, што і сёння можна пачуць: "Схавай ручкі, а то Зюзя адмарозіць", "Не чапай, а то будзе Зюзя". Гэта, на наш погляд, і ёсць рэшткі старажытнага веравання ў бога зімы – Зюзю, якое захоўваецца з часоў паганства. Дакладнага сэнсу гэтага выразу, праўда, ніхто не ведае. Тое ж адносіцца і да слоў, якімі звяртаюцца да маленькіх, калі яны хочуць узяць у рукі нешта гарачае або дакрануцца да агню – "Не чапай, а то будзе жыжа". Хутчэй за ўсё, у старажытнасці гэта было звязана з богам агню – Жыжалем.

Змалку кожнае дзіця было "знаёма" з дамавым, які, па іх уяўленні, жыве побач: за печкай, у пячурцы або пад падлогай ці ў хляве.

Звычайна дамавы ("дзедка") – гэта маленькі дзядок, які жыве ў кожнай хаце і быццам бы спрыяе дабрабыту ў ёй. Але калі яго пакрыўдзіць ці не дагадзіць яму, то з добрага "дзедка" становіцца злы.

Трэба адзначыць, што хатніх духаў было шмат: "дзедка", "бабка запечная", "дзеткі заплечныя", а таксама "баннік", "гуменнік", "хлеўнік" і інш., якія ахоўвалі хату, двор, гаспадарку і патрабавалі ад гаспадароў і дзяцей павагі і ахвяр у выглядзе яды, напрыклад (Романов.Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 289; Довнар-Запольский. Белорусская... 1893. С. 81). Ім заўсёды ў час Дзядоў астаўлялі на палку астаткі памінальнага абеду. Дзецям унушалі, што, убачыўшы духа, гаварыць з ім нельга, а трэба перахрысціцца і прачытаць малітву (Романов. Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 289). У хаце, акрамя добрых духаў, могуць з'явіцца і дрэнныя ("злыдні"). У беларускім фальклоры ёсць казкі пра гэтых духаў, яны прыносяць селяніну гора і галечу. А каб гэтага не здарылася, народная мудрасць сцвярджае, што ўсё залежыць ад самога чалавека, яго паводзін у адно-

сінах да добрых духаў, якія ахоўваюць чалавека, але могуць пакінуць яго, калі іх раззлаваць, і іх месца зоймуць "злыдні".

У раннім дзяцінстве верылі ў нячыстую сілу – вельмі шматлікую і разнастайную (д'ябал, чорт, сатана, бес, нячысты дух, Анціпка бяспяты, кадук, паралюш, Лыцыпер і інш.). Па народным уяўленні, самым старэйшым сярод іх (галоўным), які і развёў яе, з'яўляецца "дзядуля Лыцыпер" (Люцыфер). Страх перад нячысцікамі і неабходнасць абараніцца ад іх выпрацавалі звычку не вымаўляць слова "чорт" ні ў доме, ні ў іншым месцы нікім з дзяцей ці дарослых ("каб ён не з'явіўся"). Таму заменай яму служылі словы "шут" ("шут яго ведае"), "ідал" ("ідал гэты", "ён", "тэй") (Романов. Белорусский... Вып. VIII–IX. 1912. С. 287).

Каб засцерагчы дзіця ад нячыстай сілы, у калыску немаўляці клалі грабянец ці верацяно, а таксама нажніцы.

Дзіцячае ўяўленне аб нячысціках фарміравалася пад уплывам бацькоў і старэйшых. Нячысцікаў распазнаваць навучалі дзяцей, таму што яны прымаюць аблічча розных жывёл або птушак (чорнага ката, сабакі, барана і г.д.). Цяжка было маленькім не паверыць у існаванне нячыстай сілы, калі амаль кожны расказчык, як правіла, прыпомніць, што ён "сам бачыў чорта" і быў ці ледзь не стаў ахвярай яго хітрыкаў. І тут жа расказчык паведамляў слухачам, як ён выратаваўся ад яго.

Дзіця навучалі, што, калі ён незнарок вымавіць слова "чорт", то, каб засцерагчы сябе, павінен тройчы плюнуць праз левае плячо. Бо лічылася, што з левага боку заўсёды падсцерагае чорт, а з правага – знаходзіцца ангел-захавальнік. Адсюль і дайшоўшая да нашага часу звычка пляваць праз левае плячо са словамі: "цьфу, цьфу". Дзецям унушалі, што абедзве гэтыя сілы вядуць запісы добрых (ангел-захавальнік) і дрэнных (чорт) спраў, і ў залежнасці ад таго, што пераважае, радуецца або плача адзін з іх. Існавалі і звычаі, парушэнне якіх магло наклікаць бяду (чорта). Так, кожнае дзіця ведала, што кінуўшы праз акно якую-небудзь рэч або плюнуўшы праз яго, якраз і трапіш у такую сітуацыю. Згодна з павер'ем, чорт (бес) можа нарадзіцца нават з пляўка, калі плюнеш на пол і разатрэш яго. Страх перад нячысцікам у гэтых выпадках спрыяў і выпрацоўцы добрай звычкі захоўваць чысціню і парадак у доме. Акрамя таго, за пляванне на падлогу, па народнай прымеце, чалавеку трэба будзе расплачвацца на тым свеце – лізаць гарачую патэльню (Романов. Белорусский... Вып. VIII–IX. 1912. С. 313). Магчыма, веданне гэтага таксама стрымлівала дзіця ад дрэнных звычак.

Увогуле вера ў звышнатуральныя сілы, якія могуць змяніць жыццё чалавека, прынесці яму карысць або шкоду, і звязанае

з гэтым рэгламентаванне дрэнных учынкаў, паводзін, слоў і г.д. аказвалі ў XIX – пачатку XX стагоддзя вялікі выхаваўчы ўплыў на дзяцей, бо моцна трымаліся ў іх свядомасці.

Звышнатуральнае, па народных вераваннях, падсцерагала і за парогам дома: у лесе, дзе жыў лесавік, у полі – палявік, у рэчцы – вадзяны. Калі дзеці ішлі ў лес за грыбамі ці ягадамі, стараліся трымацца разам і не губляць адзін аднаго з віду. Бо кожнага, хто адыдзе ад гурта, можа збіць з дарогі, напалохаць велізарнага росту ("з дрэва") лесавік. А паратунак таму, хто сустрэне яго, можа знайсці, калі пераабуцца, памяняўшы на нагах лапці.

Найбольшую небяспеку для малых дзяцей уяўляла рэчка, возера, балота. Здаралася, што дзеці тапіліся ад няўмення плаваць ці трапіўшы ў вір або багну. У народзе існавала павер'е, што гэта вадзянік "схапіў дзіця за ногі і пацягнуў у вір". Дзяцей вучылі быць асцярожнымі з вадой і пазбягаць тых месцаў, дзе, як лічылі, жыў вадзяны.

Асцерагацца трэба было і прыгожых (або агідных) жанчын-русалак. Верылі, што ўсе яны баяцца святла і з'яўляюцца толькі ноччу. Слухаючы расказы аб тым, што вадзяныя любяць жыць каля млыноў або ў вірах рэк і могуць утапіць таго, хто спадабаўся ім, дзіця пачынала разумець, як небяспечна купацца ў такіх месцах і хадзіць ноччу, а таксама неабходнасць быць асцярожным з вадой. Уражвалі дзіця і маляўнічыя аповяды пра тое, якія намаганні прадпрымаюць лесуны, імітуючы крык птушкі, каб падманам завесці паляўнічага ці каго іншага ў глыбіню леса ці ў багну і загубіць там, пра русалак, якія вабяць сваіх ахвяр шматлікімі агеньчыкамі і захапляльна тужлівымі песнямі ў балотныя багны і глыбіні цёмных вод.

Народны погляд вучыць і супрацьстаяць нячысцікам. Гэта не толькі перасцярога, але і навучанне загаворам ад іх, неабходнасць тройчы перахрысціцца пры сустрэчы з імі.

Дзецям прыходзілася пераадольваць спакусу сарваць у чужым садзе яблык ці ўлезці ў гарох, бо бацькі расказвалі ім аб страшным лёсе злодзеяў, якія трапілі ў жалезную ступу, былі стоўчаны ў ёй і потым з'едзены "жалезнай бабай". Менавіта гэтая злая старая падсцерагае ў полі і на агародзе наўмыснікаў, каб схапіць іх жалезным крукам, а потым расправіцца.

Як вядома, дапытлівасць маленькіх, іх цікаўнасць да навакольнага асяроддзя і з'яў прыроды ў мінулым стагоддзі часцей за ўсё задавольвалася паданнямі і легендамі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Нават у наш час старыя людзі расказваюць, напрыклад, аб паходжанні плям на месяцы, якія быццам бы з'яўляюцца выя-

вамі двух братоў – Каіна і Авеля. Менавіта Каін, па загаду бога, асуджаны вечна трымаць на спіне забітага ім брата Авеля. Гэта гісторыя, у якой закладзена думка аб непазбежнасці расплаты за дрэнны ўчынак ці зладзейства, дайшла да нас з даўніх часоў і зараз аказвае вялікае ўражанне на дзяцей.

Вельмі павучальнымі былі расказы дарослых пра "ведзьмакоў", "ведзьмаў", "чараўнікоў". Па ўяўленнях народа, ад іх залежаў ураджай, хваробы і выздараўленне чалавека і скаціны, нават перамена надвор'я. Лічылі, што ведзьмы чэрпалі сваю сілу са зносін з нячысцю, наперад аддаючы сваю душу на пякельныя мукі ("чорту душу прадаў").

Дзеці верылі і ў магутныя сілы ведзьмакоў, чараўнікоў, ведзьмаў, якімі лічыліся людзі з вялікімі магчымасцямі рабіць дрэннае, наклікаць хваробу і нават смерць. Гэтыя якасці часта прыпісвалі людзям, якія займаліся лячэннем, жылі на водшыбе, у лесе. Большасць жа чараўнікоў, па народных вераваннях, хаваліся ад людскога вока і рабілі свае справы, калі чалавек не чакаў гэтага.

Шматлікія апытанні ў розных кутках Беларусі паказваюць, што яшчэ ў пачатку нашага стагоддзя і нават пазней у народзе трымаліся старажытныя вераванні аб ведзьмаках і ведзьмах, якія злятаюцца на шабашы падчас Каляд, Купалля і іншых свят і робяць людзям шкоду.

Мноства вераванняў было звязана са з'явамі прыроды. Цікавасць дзяцей да сонейка патрабавала тлумачэння дарослых аб тым, што глядзець на яго нельга, бо аслепнеш. А вось убачыўшы малады месячык, гаварылі дзіцяці, трэба перахрысціцца і сказаць: "Маладзічок маладэй, у цябе рог залатэй! Табе на прыбытак, а нам на спасенне (ці здароўе)!" Гэта, па разуменні беларусаў, на цэлы месяц давала дзецям здароўе. Сонечных зацьменняў баяліся нават дарослыя, не ведаючы прычыны гэтых з'яў, і звязвалі з імі вялікі мор ці голад.

Шматлікія расказы пра небяспеку навальніцы, пачутыя ад бацькоў ці старэйшых дзяцей, выхоўвалі ў маленькіх страх перад маланкай і громам. Каб аберагчыся ад іх, дзяцей вучылі запаліць у час навальніцы лампадку ці свечку перад абразамі, закрыць юшкі і выгнаць з хаты чорных катоў і сабак, калі яны там знаходзіліся. Забаранялася штонебудзь рабіць у гэты час, нават есці, нельга было хавацца ў час навальніцы ў лесе пад дрэвам ці кустом. Разам з тым, згодна з народным вераваннем, калі дзеці пры першым громе вясною тры разы перакуляцца праз галаву, то будуць увесь год здаровыя і іх не "заб'е пярун" (маланка, гром).

У маленстве і раннім дзяцінстве дзеці асабліва верылі ў незвычайныя здарэнні, пераўвасабленні людзей у розныя істоты,

а таксама ў магчымасць зрабіцца невідзімкай або вырасціць Змея Гарыныча і г.д. Гэтыя небыліцы, пачутыя ад старэйшых, хвалявалі іх. Многія з дзяцей рабілі спробы дасягнуць пастаўленай мэты, але поўнасцю выканаць заданне, якое ставілася пры гэтым, было немагчыма. Так, каб з яйка вывеўся змей, трэба было яго некалькі месяцаў трымаць пад пахай, чаго нават пры вялікім жаданні не мог зрабіць ніхто.

Шмат народных вераванняў звязана з ачышчальнай сілай агню. Асаблівую сілу меў купальскі агонь. З мэтай абараніць сябе ад чараўніцтва, спазнаць на сабе ачышчальную сілу агню, "падсілкавацца" жыццёвай энергіяй сонца моладзь у купальскую ноч скакала праз агонь, а ў некаторых месцах (Лепельскі павет) над купальскім кастром хлопцы "калыхалі" дзевак, а дзеўкі – хлопцаў (Романов. Белорусский... Вып. VIII–IX. 1912. С. 295). У беларусаў вядомы звычай "палання" дзяцей, калі хворае і нават здаровае дзіця з мэтай прафілактыкі раскачвалі перад печчу, дзе палаў агонь (Шейн. 1902. Т. III. С. 104).

У дзяцей выхоўвалі павагу да агню. Згодна з народнымі ўяўленнямі, абыякавасць да яго можа прывесці да кары з боку самога агню – на губах і языку з'яўляюцца прышчы ("вогнік", "жыжка"). Дарослыя казалі ім: "Не плюй у агонь, а то вогнік выскачыць". Сувязь хваробы з агнём бачна і з загавору супраць рожы, гангрэны, "вогніка" і інш. Верылі ў "чысціню" агню, які выратоўвае ад хваробы, ачышчае (напрыклад, у скаканні праз касцёр у ноч Купалля). Акрамя таго, беларусы лічылі яго магутным, здольным не толькі караць, але і дапамагаць чалавеку. Печ як месца "жыхарства" агню лічылася чыстым месцам, існавалі забароны апаганьвання печы, напрыклад, дурным словам ці кіданнем у яе розных прадметаў. Гэтаму навучалі з ранняга дзяцінства.

Дзецям была вядома забарона даваць суседцы вуголле з печы (бо з ім, па народным уяўленні, сыходзіў з дому дабрабыт, багацце), а калі гэта здаралася, то яно павінна было вярнуцца ў хату (пасылалі за вугалькамі да пазычыўшай суседкі) (Богданович. Пережитки... 1895. С. 18).

Дзеці змалку даведваліся ад дарослых, як па розных прыметах прадказаць надвор'е, будучы ўраджай і г.д. Многія народныя прыметы мелі рацыянальны сэнс і грунтаваліся на шматгадовых назіраннях, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Кожны сялянскі хлопчык ці дзяўчынка, напрыклад, з упэўненасцю скажа, што калі ластаўкі нізка лятаюць над зямлёй – будзе дождж, калі вечарам камары "таўкуць мак" на вышыні – будзе добрае надвор'е, калі сонейка на захадзе яснае – наступны дзень будзе добры, а калі цьмянае

– вецер і г.д. Прымет было шмат, але дзеці ведалі найбольш распаўсюджаныя і нават карысталіся рознымі магічнымі дзеяннямі, якія, на іх погляд, маглі паўплываць на змены надвор'я, ураджаю, дабрабыт, здароўе і інш.

Так, на працяглае дажджлівае надвор'е, калі дождж ідзе з дня ў дзень, стараліся паўплываць з дапамогай костачкі (з асвячонага на Вялікдзень мяса), спаліўшы яе ў печы. Каб не пабіў град пасевы і хутка спыніўся, выносілі на вуліцу ў гэты час лапату і мятлу. Забаўляльны характар набыла сёння спроба дзяцей у час дажджу спыніць яго або выклікаць з дапамогай песенькі:

Дожджык, дожджык, перастань,
Мы паедзем на Йрдань,
Богу маліцца,
Хрысту пакланіцца.

Або:

Дожджык, дожджык, лупані,
Казу з поля прагані.

Існавала прымета, што калі пастушок на Ражство ў час вячэры выйдзе ў сад босым і спутае там некалькі дрэў, то летам коні не будуць рабіць патравы. А каб коні былі здаровыя і ўкормленыя, іх купалі ў чысты чацвер да сонца і каталі па іх хрыбце яйка з намаляваным вуглем "крыжыкам" (каб былі круглыя, як яйкі).

Згодна з народнымі павер'ямі, няньчыцца з жывёламі дзецям забаранялі, бо яны лічыліся "паганымі". Цалаваць іх таксама не раілі, таму што сам чалавек стане "паганым". Гэта мела і рацыянальны сэнс, бо ад жывёл дзеці маглі "запазычыць" хваробы, шкодных насякомых і г.д.

Важнае месца ў народных вераваннях, звычаях, абрадах адводзілася паважлівым адносінам да ідэі Бога і рэлігійных атрыбутаў, якія фарміраваліся ў дзяцей змалку. У кожнай хаце на бажніцы была ўстаноўлена адна або некалькі ікон (часцей – Спасіцеля, Боскай Маці, святога Мікалая, Георгія Пераможца, святой Варвары ці архангела Міхаіла), завешаных прыгожымі набожнікамі. Без патрэбы нельга было чапаць іх ці здымаць. Іконамі бласлаўлялі на шлюб дарослых дзяцей: жаніха іконай Збавіцеля ці святога Мікалая, нявесту – Багародзіцы ці святой Угодніцы.

Сярод прымет і вераванняў, якія існавалі ў адносінах да рэчаў рэлігійнага культу, недапушчальнай лічылася згуба шыйнага крыжыка, што прадвяшчала няшчасце. Дзяцей папя-

рэджвалі і аб недапушчальнасці такога вялікага граху, як легчы нагамі да ікон, сказаць дрэннае слова перад імі і г.д. Усё святое трэба было берагчы, захоўваць, паважаць.

У беларусаў існавала мноства прымет, звязаных з абліччам дзяцей, іх паводзінамі, звычкамі, схільнасцямі і г.д. Так, доўгія тонкія пальцы ў хлопчыка, па народнай прымеце, азначалі, што з яго выйдзе "або пан, або гультай", у дзяўчынкі – добрая праля. Калі маленькае дзіця есць зямлю, то яно, на пагляд беларусаў, будзе недаўгавечным (Романов. Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 304).

Некаторыя народныя ўяўленні звязаны з тым, што маленькія дзеці могуць уплываць на прыплод і матэрыяльны дабрабыт сям'і. Так, маці першае неастыўшае яйка курыцы абносіла вакол галавы дзіцяці са словамі: "Няхай курка знясецъ столькі яек, колькі тут ёсць валасоў" (Шейн. 1893. Т. 2. С. 18). Валасы, па народнаму звычаю, нельга кідаць ні ў агонь (будзе жар у галаве), ні на вуліцу (бо мышы пацягнуць у нару і будзе шум у галаве). Таму, калі стрыглі маленькіх, валасы пускалі на цякучую ваду (у рэчку) або запіхвалі ў сценныя дзіркі, каб не маглі іх схапіць птушкі (будзе балець галава).

Да нашага часу існуе вераванне, згодна з якім, пачуўшы ўпершыню зязюлю, трэба запытацца, колькі гадоў пражывеш або колькі гадоў засталося да жаніцьбы ці замужжа, і атрымаеш адказ: колькі разоў пасля гэтага яна пракукуе, столькі і жыць.

Згодна са звычаем, моцна спужанае дзіця маці адразу ж абпырсквала вадой і рвала каўнер у рубашцы. Калі пры размове хто-небудзь чхне, значыць, па народнай прымеце, чалавек гаворыць праўду і тое, што ў гэты час задумаў, збудзецца. Дзіцяці ў такіх выпадках заўсёды казалі: "Вялікі расці, не вучыся красці!"

У Рагачоўскім павеце, напрыклад, існавала павер'е, што калі дзіця ў сем гадоў развяжа сваю закапаную пры нараджэнні пупавіну, то будзе разумным чалавекам (Романов. Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 314).

Дзіцяці забаранялася хадзіць задам наперад ці на адной абутай назе, таму што гэта, па ўяўленні беларуса, прадракала смерць каго-небудзь з бацькоў.

Паўсямесна вядома прымета, што свіст у хаце можа выклікаць вецер. Цікава, што і сёння захавалася забарона свістаць у доме, якая зыходзіць з народнай прыметы, бо не будуць весціся грошы.

Існавалі звычаі, звязаныя з выпечкай хлеба. Навучаючы дачку, маці папярэджвала яе, што нельга выліваць памыі ў падпечча, таму што пасаджаны ў печ хлеб не будзе падыходзіць, румяніцца і выпякацца. Больш таго, рытуал выпечкі

хлеба павінен адбывацца ў спакойных умовах, бо хлеб "не любіць", вучыла маці, калі моцна размаўляюць, стукаюць дзвярыма, калі ў гэты час точаць нож, сякеру, касу і г.д. (патрэскаецца) (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 149).

Выхаваўчую ролю выконваў звычай, калі незнарок упаўшы кавалачак хлеба трэба было падняць, пацалаваць яго і з'есці або кінуць у печку. Калі ўпала што-небудзь іншае, яго абавязкова трэба было аддаць хатняй жывёле: мяса, сала – кошкам, сабакам, бульбу ці кашу – каровам. Паважлівыя адносіны да хлеба выхоўваліся з дзяцінства і перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Нават калі ўзнікала бойка паміж сялянскімі хлопчыкамі, то той, хто трымаў у гэты час у руцэ хлеб, абавязкова пакладзе яго, а пасля возьме і папросіць прабачэння ў хлеба. На жаль, гэта добрая традыцыя аджывае свой век разам са старымі людзьмі, якія ўмеюць цаніць хлеб. Грахом лічылася пакласці бохан хлеба верхам уніз. Нельга было рэзаць яго знізу, як нельга было пракалваць, каб адрэзаць. З дзяцінства кожны ведаў, што есці нажом – грэх, а чужой лыжкай – пасварышся з гаспадаром.

Калі дзіця згубіла (забылася) якую-небудзь рэч, то трэба было, знайшоўшы, папляваць на яе са словамі: "Чорт, чорт! Аддай маё паганае, вазьмі сваё харошае!" – таму што гэта лічылі хітрыкамі чорта.

Шмат народных прымет было звязана з хваробамі дзяцей і іх лячэннем. Кожнаму даросламу чалавеку, асабліва старэйшага пакалення, даводзілася кідаць у маленстве за печку выпаўшы малочны зуб. Па народных вераваннях, зубны боль выклікаюць чарвячкі, якія заводзяцца ў іх, выгнаць якіх можна, калі падыхаць над гарачым вуголлем, на якое кідалі зерне дурману ці беляны ("тады чэрві выйдуць").

Дзеці былі ўдзельнікамі і "вадзяных адпраў" – царкоўных службаў, што адпраўляліся над крыніцамі, звычайна пасля Узнясення. У кожнай мясцовасці былі вядомы такія крыніцы, і ў народнай свядомасці яны звязваліся з цудоўнымі магчымасцямі вады вылечваць ад розных хвароб і ўвогуле ачышчаць ад брыдоты. Так, каля вядомай на ўсю акругу Палыкавіцкай крыніцы (непадалёку ад Магілёва) тры разы ў год на "палыкавіцкія пятніцы" збіраліся дзеці і дарослыя, хлопцы і дзяўчаты з вёсак, мястэчак і гарадоў. У дзень "адправы" тут быў кірмаш, гулянні, дзе малыя маглі павесяліцца і пакаштаваць розныя "саладэсы" (прысмакі). З мэтай ачышчэння і лячэння яны хадзілі разам з маці па ручаі, які цёк ад крыніцы, куплялі васковыя выявы розных хатніх жывёл і прыносілі іх у ахвяру крыніцы. Ахвярамі

ей былі "каралі", завушніцы, манеты. Набіралі з крыніцы "святой" вады, каб потым скарыстоўваць яе для лячэння.

У сям'і дзяўчына знаёмілася з народнымі прыметамі, якія былі скіраваны на яе будучае замужжа. Пры выкананні розных работ маці тлумачыла ёй, што можна рабіць, а чаго нельга, зыходзячы з народных прымет. Так, дзяўчыне раілі не глядзецца вечарам доўга ў люстэрка, таму што яе будучы муж будзе бедняком ці бяздомным. Мужа – горкага п'яніцу "абяцала" такая прымета, як ненаўмысна пралітая на стол страва ў час яды. Дзяўчаты стараліся не садзіцца і на драўляную калоду, бо замужжа тады адсоўвалася да таго часу, пакуль калода ад карыстання не разаб'ецца на трэскі. Згубленыя ўпрыгожанні лічылі прыметай хуткага замужжа дзяўчыны. Калі яна хацела хутчэй уступіць у шлюб, у час вяселля імкнулася хуценька сесці на месца, з якога толькі што ўстала шлюбная пара.

Аналагічныя прыметы былі і для хлопцаў. Той, хто хацеў мець прыгожую жонку, павінен быў на працягу трох велікодных дзён насіць не адзін, а два паясы. Хлопец з мэтай "прываражыць" дзяўчыну, якую пакахаў, павінен быў узяць у царкве сплаў трох свечак і з гэтым тройчы абысці любую дзяўчыну, затым зноў занесці свечкі ў царкву (Никифоровский. Простонародные... 1897. С. 49–60).

Вера ў многія з гэтых прымет і паве'яў вымушала прытрымлівацца іх. Шмат прымет існуе і сёння. Так, паўсямесна бытуе яшчэ прымета, што першым хрэснікам дзяўчыны павінен быць хлопчык, а хлопца – дзяўчынка. Інакш яна не выйдзе замуж, а ён – не ажэнніцца. Нярэдка дзяўчыне, якая мяла смецце праз парог хаты, маці, жартуючы, заўважала, што ў яе будзе лысы муж.

У мінулым стагоддзі шырока карысталіся і гаданнем як магічным прыёмам, здольным, на погляд беларусаў, не толькі ўбачыць будучыню, але пэўным чынам паўплываць на яе. Гадалі перш за ўсё на Каляды, на Новы год, Хрышчэнне, а таксама ў дзень святога Андрэя і іншыя святы.

Адным з радасных і доўгачаканых свят у дзяцей былі Саракі (9 сакавіка па ст. ст.). Маці тлумачыла маленькім дзецям, што ў гэты дзень сарока пачынае віць сабе гняздо, для чаго ёй трэба прынесці 40 пруткоў. А з выраю прыляцяць 40 жаваранкаў – вестуноў вясны. Хлопчыкі, згодна са звычаем, яшчэ да ўсходу сонца павінны былі з зажмуранымі вачыма знайсці 40 трэсак, прынесці ў падоле сарочкі ў хату і высыпаць іх пад печ. Гэта абяцала ім, што яны знойдуць 40 птушыных гнёздаў ці яек. У Быхаўскім павеце шчэпкі ў хату не неслі, а, сабраўшы, кідалі праз пячную трубу (Рома-

нов. Белорусский... Вып. VIII–IX. 1912. С. 142).

У Мінскай губерні (Вілейскі павет) існаваў такі звычай для хлопчыкаў: устаць раней за ўсіх і, не апранаючыся, прынесці як мага болей дроў у хату, што абяцала ім выгоды ў пошуку потым гнёздаў і яек птушак (Крачковский. 1874. С. 99). А калі пашанцуе ўбачыць у гэты дзень "вырай" у небе, то шчасліўца, па народнай прымеце, чакала добрая будучыня і поспех ва ўсім.

У дзень Саракоў дзяцей чакала шмат забаў, пачастункаў. У варотах хлява ці гумна яны маглі пакатацца на арэлях. Дарэчы, катанне гэта лічылася абавязковым, бо ў народным разуменні было звязана са здароўем. Акрамя таго, маці выпякала 40 "жаваранкаў" з цеста, якімі частавала дзяцей. У некаторых месцах гэта былі звычайныя варэнікі ці галушкі.

Першага красавіка – дзень смеху і жартаў, які адзначаецца і зараз. У XIX стагоддзі ён таксама існаваў. Толькі падман адзін другога ў дзяцей звязваўся з уяўленнямі аб дамавіку, які быццам прачынаецца ў гэты дзень. А каб ён не нашкодзіў каму-небудзь, трэба было яго падманваць.

Дзеці ў беларусаў прымалі ўдзел у абрадах. Народнае ўяўленне звязвала гэта з верай, што пэўныя дзеянні малых могуць аказваць уплыў на сілы і з'явы прыроды. Асабліва яскрава гэта бачна ў абрадзе "Гукання вясны", які лічыўся дзіцяча-юнацкім святам і ўдзельнікамі якога былі як дзеці-падлеткі, так і юнакі і дзяўчаты. Многія абрадавыя дзеянні дзяцей у гэты дзень мелі магічны характар. Гэта і спевы песень-веснянак з заклікаммем вясны, і спечаныя з цеста "жаваранкі", з якімі яны бегалі, трымаючы на шастах або проста ў руках, спявалі, скакалі, імітавалі палёт птушак, а потым з'ядалі гэтых "жаваранкаў". Рытуальныя дзеянні звязваліся з хуткім надыходам вясны, якую чакалі хлебаробы, прылётам птушак – вестуноў вясны.

У Навагрудскім павеце Мінскай губерні на Благавешчанне дзеці, згодна з народным звычаем, атрымаўшы ад маці "галіопу" (піражок, выпечаны ў выглядзе бусла, з чубком, крыламі, нагамі і хвастом), бегалі па вуліцы з заклічкай: "Бусля, бусля, на табэ галіопу, а мне дай жыта копу!" (Крачковский. 1874. С. 102). Напэўна, гэта адбітак старажытных вераванняў, у якім прылёт бусла звязваўся з яго ўплывам на будучы ўраджай.

Былі тут і іншыя магічныя дзеянні, выкананне якіх дзецьмі, па народным уяўленні, спрыяла дабрабыту сям'і. Так, маленькія дзеці раніцай адпраўляліся на суседскі двор за трэскамі, што "прываблівала" потым суседскіх курэй несці яйкі на іх двары.

Яшчэ ў XIX стагоддзі верылі і ў здольнасць дзяцей з дапамогай магічных дзеянняў выклікаць дождж ("на бабіна жыта,

на дзедава сена") у засушлівае лета, добрае надвор'е – у халоднае і дажджлівае (Харузина. 1911, № 1–2. С. 30).

Сярод розных свят найбольш прывабнымі для дзяцей усіх узростаў былі Каляды. Да іх старанна рыхтаваліся. Летам дзеці назапашвалі арэхі, семкі і строга прытрымліваліся звычаю: не браць без дазволу і не есці да Каляд. Асабліва важная роля ў калядных абрадах належала падлеткам, юнакам і дзяўчатам, якія былі і арганізатарамі калядных абходаў дамоў, і выканаўцамі розных роляў. У адрозненне ад праваслаўных, у беларусаў-католікаў кожная страва святочнай куцці прыкрывалася кружком аплаткі і, перш чым пачыналася яда, кожнаму прапаноўвалася з'есці кавалачак аплаткі і павіншаваць усіх са святам.

Найбольш спрыяльным для варажбы дзяўчаты і хлопцы лічылі час менавіта напярэдадні Ражства. Немагчыма пералічыць прыкметы, якімі на Беларусі карысталіся ў варажбе. Моладзь праз іх часцей за ўсё хацела даведацца аб будучым замужжы або жаніцьбе, аб долі і лёсе, якія іх чакалі. Вечары на працягу двух тыдняў Каляд называліся Святымі. Гэта быў час мірных і цёплых узаемаадносін дзяцей і дарослых, калі збіраліся ўсёй сям'ёй, слухалі дзівосныя гісторыі дарослых, гулялі ў розныя гульні, загадвалі загадкі, пелі, скакалі, ласаваліся арэхамі, семкамі.

У горадзе дзеці крыху інакш святкавалі Каляды. Па сведчанні А.С.Дамбавецкага, па заканчэнні ўсяночнай маленькія хлопчыкі і дзяўчынкі хадзілі па хатах віншаваць са святам ("Хрыста славіць"). Нярэдка да дзвярэй суседзяў іх падводзілі дарослыя за руку і чакалі, калі яны пачытаюць там "вершыкі", каб потым адвесці дадому. Змест "вершаў" быў прыкладна такі: "Хрыстос радзіўся! Я паненка, я маленька, у школку хадзіла, што вучыла, то і забыла, са святам віншую!" або: "Я маленькі хлопчык, улез на стоўбчык, у дудачку іграю, Хрыста велічаю, са святам паздраўляю, з Хрыстовым Раждзяством!" Сэнс гэтых віншаванняў перш за ўсё ў пажаданні сям'і дабрабыту лічыўся больш дасягальным, калі віншаванне атрымана ад дзяцей – сімвала прыроднай чысціні. Дзеці за гэта атрымлівалі ўзнагароду (ад 2 да 5 капеек).

Шмат народных звычаяў было звязана з сустрэчай Новага года. Напярэдадні свята ў Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні, напрыклад, хлопчыкі позна вечарам лавілі вераб'ёў у пуні пры свеце ліхтарыка. Звычай гэты быў звязаны з тым, што вераб'і не шанаваліся ў вёсцы, дзе яны за лета знішчалі шмат пасеваў. Таму чым больш лавілі вераб'ёў у гэты вечар, тым больш, лічылі сяляне, іх загіне ў гэты год і менш будзе патравы.

На Новы год дзяцей стараліся разбудзіць вельмі рана, таму што лічылі гэта верным сродкам аберагчы іх ад ляно-

ты на ўвесь год (Віленская губерня). А каб поспех спадарожнічаў ім на працягу года, сачылі за тым, каб дзеці не рабілі дрэнных учынкаў, абавязкова наведалі царкву і пасля абедні адпачылі.

На Новы год на Магілёўшчыне (звычай мае назву "Васілля") раніцай дзеці хадзілі па дварах з мяшэчкамі ў руках, у якіх знаходзілася рознае зерне. Уваходзячы ў хату, яны сыпалі жменю зерня і чыталі вершы, у якіх жадалі гаспадарам атрымаць добры ўраджай збожжа. Таму так званых "засявальшчыкаў" сустракалі з радасцю і адорвалі рознымі прысмакамі – абаранкамі, арэхамі, семкамі.

Усе вечары ад Ражства да Хрышчэння лічацца "святымі", таму ніхто не працуе, і моладзь праводзіць час у бавах: скокі з песнямі, прыпеўкамі, гульні ў "яшчура", "каралевіча", гаданні (Киркор. Следы... 1882. Т. III. Ч. II. С. 253).

У Гомельскім павеце зафіксаваны цікавы звычай. Напярэдадні Хрышчэння (5 студзеня па ст.ст.) гаспадыня, трымаючы ў руках гаршчок з "куццёй", пачынае "кудахтаць" і яе падтрымліваюць дзеці, якія залазяць пры гэтым пад стол. Паставіўшы "куццю" на кут і накрыўшы "кулідкай" хлеба, яна сыпле дзецям семкі сланечніку пад стол. Сабраўшы іх, дзеці вылазяць адтуль (Романов. Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 127). Гэты звычай, відаць, ёсць праяўленне сімпатычнай магіі, з дапамогай якой спадзяваліся павялічыць яйканоскасць курэй. Семкі сімвалізуюць шматлікасць курэй, якія будуць весціся ў гаспадарцы.

На Грамніцы, ці Стрэчанне (2 лютага па ст. ст.), па народных уяўленнях, зіма з летам сустракаецца і дзецям прапаноўваецца самім убачыць гэтую сустрэчу. А для гэтага яны павінны былі без верхняга адзення і босымі бегчы за агарод ці гумно. Узнагародай, як абяцалі дарослыя, будуць чырвоныя боты, якія дасць ім "зіма" (Романов. Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 136). Заўсёды знаходзіліся смельчакі, якія яшчэ не зведалі на сабе вынікаў гэтага жарту і ў надзеі атрымаць прыгожыя чырвоныя боты адпраўляліся на "сустрэчу". Калі ж расчараваныя і замерзлыя яны вярталіся ў хату, то, паказваючы на іх чырвоныя ад холаду ногі, бацькі казалі: "Вось вы і атрымалі "чырвоныя боты".

Вялікдзень для дзяцей быў святам, калі патрабавалася прытрымлівацца пэўных правіл паводзін і выканання традыцыйных абрадаў. Паўсямесна дзеці ўсіх узростаў, па традыцыі, наведвалі ў гэты дзень сваіх хросных бацькоў, ад якіх яны чакалі падарункі, пачастункі (кавалак пірага, яйкі і г.д.). Увогуле дарыць адзін другому яйкі – даўні звычай.

Далучэнне да народнай традыцыі ўшанавання памяці па-

мерлых продкаў у беларусаў адбывалася з маленства. Дзеці былі ўдзельнікамі абраду Дзядоў, якія бываюць некалькі разоў у год, а таксама Радаўніцы, сэнс якой таксама ў шанаванні як далёкіх продкаў, так і памерлых родных, блізкіх.

Разам з бацькамі і іншымі сваякамі перад абедам на Дзяды нават маленькія дзеці ўдзельнічалі ў агульнай малітве, стоячы на каленях. Наведвалі ў гэты дзень могілкі, якія разам са старэйшымі папярэдне прыбіралі і ўпрыгожвалі. У Віленскай губерні на Асяніны – "восеньскія дзяды" – існаваў звычай, згодна з якім на могілках менавіта меленькім хлопчыкам трэба было ўзяць голымі рукамі і з'есці ячную кашу (Крачковский. 1874. С. 160).

Да другой паловы XIX стагоддзя ў заходніх раёнах Беларусі на вячэру ў "восеньскія дзяды" ў адзін дом са сваімі прыпасамі збіраўся ўвесь род. Вячэра пачыналася агульнай малітвай і спевамі за памерлых. Пасля старэйшы з роду ішоў за стол, запальваў абрадавую свечку, ставіў яе ў шклянку са збожжам і запрашаў "дзядоў" за пачэсны стол. Дзеці як удзельнікі абрадавай вячэры даведваліся аб усёй радні свайго роду. Спасцігалі яны і сам рытуал, у час якога госці павінны былі садзіцца за стол па старшынству. А з размовы і ўспамінаў, цалкам прысвечаных "дзядам", даведваліся аб сваіх прашчурах: іх імёнах, чым яны вызначаліся, праславіліся, іх прыгодах, характары і г.д. Тут расказваліся сямейныя паданні, якія праз нейкі час дзеці, стаўшы дарослымі, перадавалі сваім дзецям (Пагашчанін. 1927. № 12. С. 67). Так падтрымлівалася сувязь паміж пакаленнямі не толькі блізкімі, але і далёкімі. Шанаванне продкаў стала народнай традыцыяй беларусаў, якая існуе і сёння.

Выхаваўчае значэнне меў звычай раздаць у гэты дзень убогім, бедным каля царквы "дзедаўскі хлеб", "бондачак" – невялікія хлебныя булачкі. Гэта прывучала дзяцей спачуваць і дапамагаць бедным. Тое ж адносілася і да традыцыі запрашаць на вячэру і частаваць бедных суседзяў, якім з сабой давалі гасцінец – кавалак сала ці кілбасы. У гэты дзень у "сямейныя хронікі" ўпісвалі нованароджаных і выпісвалі памерлых. І ад пакалення да пакалення гэты скрутачак захоўвалі ў хаце, у "пачэсным" куце за бэлькай.

Большасць каляндарных свят і абрадаў у беларусаў не абыходзіліся без удзелу дзяцей. Яны ўдзельнічалі ў шэсцях моладзі з лялькамі і пераапранутымі ў розных звяроў і казачных герояў, якія суправаджаліся жартамі, песнямі і г.д. У іх таксама выкарыстоўваліся ў якасці магічных прыёмаў пажаданні, велічанні гаспадароў, абліванне, пасыпанне зернем, разыгрыванне сцэнак, якія выконваліся дзецьмі.

У русальным абрадзе побач з дзяўчатамі ўдзельнічала маленькая дзяўчынка, якая выконвала ролю дачкі русалкі. Такія магічныя дзеянні, як абліванне вадой, пасыпанне зернем, вершаваныя пажаданні, што выкарыстоўваліся ў многіх абрадах, мелі на мэце прывабіць у хату дабрабыт, садзейнічаць добраму ўраджаю, забяспечыць зямлю вільгаццю і г.д. І лепш за ўсіх, па народным уяўленні, гэта маглі зрабіць дзеці і падлеткі. Спрацоўваў тут і добра вядомы прынцып, якога трымаліся многія народы: падобнае выклікае падобнае. Так, мноства цягне за сабой мноства, сіла – сілу, рост – узрастанне. Цікава, што адорванне дзяцей прадуктамі харчавання, рэчамі, цацкамі першапачаткова таксама мела на мэце не толькі парадаваць дзяцей, але і павінна было ўзмацніць вытворчыя сілы і дабрабыт сям'і. Усе ўяўленні беларусаў аб здольнасці дзяцей "прыносіць шчасце" трымаліся на веры аб чысціні дзіцячай душы.

Свята Троіцы – па народнаму Зялёнае свята, Сёмуха – святкавалася тры дні і лічылася вялікім. Па ўяўленні беларусаў і іншых славянскіх народаў, у гэты дзень продкі вяртаюцца на зямлю і знаходзяцца ў зеляніне, таму ў знак ушанавання іх упрыгожвалі зелянінай вароты, хату, двор і г.д. Забаранялася касіць траву і секчы дрэва ў гэты дзень. Да гэтага свята рыхтаваліся загадзя, назапасіўшы "маю", явару, чыста мялі хату і ўпрыгожвалі яе. Справай дзяўчынак і дзяўчат было чыста прыбраць у хаце і з дапамогай "гальня" (веніка) выдраіць да белізны падлогу, яе перад святам густа ўсцілалі яварам, ад якога ішоў вельмі прыемны пах. Да свята сцены хаты, абразы і рамкі з фатаграфіямі ўпрыгожвалі веткамі раслін: бярозы, клёна, каліны, рабіны і інш. Ссечаныя дрэўцы ставілі і ў хаце на куце, а таксама перад хатай, утыкаючы ў зямлю. Дзяўчаты адпраўляліся ў гай, дзе разам з хлопцамі ўдзельнічалі ў абрадзе завівання бярозкі, плялі вянкі, спявалі. Гулянні былі і месцам выбару нявест.

Народнае свята Сёмуха мела асаблівасці ў святкаванні. У гэты дзень дзяўчаты хадзілі ў царкву з кветкамі, дапамагалі ўпрыгожваць яе.

Па традыцыі ў свята Святога Духа да абедні ў царкву абавязкова ішлі дзеці, а пасля абедні з бацькамі – у карчму. Звычай святкавання, як адзначаў П.В.Шэйн, цвёрда трымаўся ў быце. Бацькі наймалі ў гэты дзень музыку і дзеці маглі цэлы дзень скакаць пад яго ігру (Шейн. 1902. Т.III. С. 19). Напярэдадні дзяўчаты "кумiліся" паміж сабой, быццам усталёўваючы на невялікі тэрмін адносіны пасястрынства. Абрад гэты праходзіў прыкладна так: дзяўчаты, якія вырашылі пакуміцца, падыходзілі з двух бакоў да "завітай" бярозкі і цалаваліся, а потым мяняліся якімі-небудзь рэчамі: стужкамі, крыжыкамі, пацеркамі і

г.д. З гэтага моманту яны лічыліся "кумамі" (як і называлі адна другую) і сябравалі, як сёстры. У некаторых сяброўства працягвалася доўга. Іншыя на свята Троіцы, калі "развівалі бярозкі", "раскумліваліся", вяртаючы пры гэтым і сімвалы кумлення – рэчы.

Звычай сярод хлопцаў і дзяўчат "куміцца" на свята Пятра і Паўла (29 чэрвеня па ст.ст.) вядомы ў Магілёўскай губерні. Абрад "кумаўлення" праходзіў у лесе, дзе звівалі вянком дзве суседнія галінкі бярозы ці суседніх дрэў. Праз тыдзень прыходзілі на гэта месца "развіваць" і паглядзець, ці ссохлі вянкі ці засталіся свежымі. Пры гэтым гадалі: калі завяне вянок, то памрэ хто-небудзь, калі ж звівалі вянок хлопец з дзяўчынай, то будзе вяселле (Романов. Белорусский... Вып. VIII – IX. 1912. С. 229). Заканчэннем гэтага свята была невялікая гулянка прама ў лесе, дзе каталіся на арэлях, палілі кастры, вадзілі карагоды, або ў хаце, дзе звычайна збіраліся "на папрадкі". Тут частаваліся, пелі, скакалі хлопцы з дзяўчатамі.

Малых дзяцей (да 7 гадоў) звычайна ў лес не пускалі, баючыся няшчасных выпадкаў. Каб не было спакусу ў дзяцей пабегаць у лесе, іх запалохвалі. Так, маці (в. Нарва, Гродзенская губерня) гаварыла: "Не йдзіце, дзеткі, ні да леса, ні ў жыта, бо ў лесе бегае тучніца (гурт ваўкоў); яна як нападзе на вас, то заесць насмерць, а ў жыце ходзяць раскудланыя русаўкі (русалкі) з велізарнымі нажамі, то яны вас парэжуць (Крачковский. 1874. С. 120). Большасць дзяцей такія пагрозы спынялі.

Без дзяцей не абыходзілася ніводнае вяселле. Іх удзел у вяселлі лічыўся нават пажаданым ("дзеці прыносяць шчасце"). У вясельным абрадзе яны былі не толькі назіральнікамі, але і паважанымі ўдзельнікамі: ішлі перад вясельным поездам, неслі покрыў маладой, у некаторых месцах нават удзельнічалі ў прыгатаванні вясельнага караваю.

Зараз некаторыя элементы ўдзелу дзяцей у вяселлі працягваюць жыццё. З'явіліся і новыя традыцыі, калі маладая абносіць дзяцей цукеркамі (часта кідае ў натоўп) і частуе іх.

На Купалле, як сцвярджае народнае павер'е, русалкі (душы памерлых) устаюць пасля доўгага сну і купаюцца ў рэчцы, возеры да ўзыходу сонца, а калі яно ўзыдзе – сушацца. Дзеці ў гэты дзень стараліся ўстаць раней, каб сваімі вачыма ўбачыць, як "іграе сонейка", пра што яны шмат чулі ад дарослых.

Дзяўчаты і юнакі напярэдадні Купалля збіраюць розныя кветкі, зёлкі, галіны дуба, асіны, рабіны, каб асвяціць у царкве, потым з іх сплятаюць вянкі (як сродак супраць злой сілы).

У вольным часе моладзі і дзяцей вялікае месца займалі веча-

рынкі, ігрышчы, якія прымяркоўваліся да свят ці непрацоўных дзён. Ігрышчы звычайна былі месцам збору моладзі. Толькі на Каляды, а дакладней на другі дзень Каляд, у Гродзенскай губерні, напрыклад, дзяцей, пачынаючы з пяці гадоў, бралі на ігрышча ў карчму (Шейн. 1902. Т. III. С. 104). Тут яны весяліліся, скакалі ўсю ноч разам з дарослымі і бацькамі, якія лічылі, што дзеці павінны прывучацца да грамадскага жыцця. Аднак дазвол на наведванне “блазнотай” карчмы праіснаваў нядоўга, таму што ў канцы XIX стагоддзя тут усё часцей ігрышчы ператвараліся ў звычайныя п’янкі, дзе дзецям забаранялася знаходзіцца.

На вечарынкі звычайна дазвалялася хадзіць з 15 – 17 гадоў. Дзяўчатам з беднай сям’і прыходзілася карыстацца старым абуткам старэйшай сястры і такімі ж старымі сукенкамі. У тых, хто паходзіў з больш заможных сем’яў, было новае адзенне. У Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні, напрыклад, святочным адзеннем дзяўчат былі “рабушкі” (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 69, л. 11) – спадніца, якая разам з сукенкай служыла ім уборам і для вечарынак. Насілі і “саяны” з сукна на льняной аснове, звычайна аднатонныя (зялёныя, чырвоныя, жоўтыя) (АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 69, л. 13), а таксама чорныя і сінія спадніцы. У Гродзенскай губерні дзяўчаты надзявалі тканыя спадніцы з “плаценкавага палатна”, а таксама жакеты, некаторыя шылі сабе касцюмы (“у шашкі”) (там жа). Абутак дзяўчат розніўся ў залежнасці ад сацыяльнага становішча сям’і. Лепшы абутак маглі дазволіць сабе дзяўчаты з больш заможных сямей. Звычайна гэта былі чаравікі ці туфлі. Танцавалі польку, вальс, кадрылю, кракавяк, каробачку, матлеты, маскоўскі, какеткі (Віцебская губерня), у Магілёўскай – яшчэ і зялёны, барыню, рускага, мяцеліцу, падушачку і інш., на Гродзеншчыне сярод іншых былі вядомы мазурка, люстэрка (там жа, л. 9).

Такім чынам, у сялянскім побыце з даўніх часоў да пачатку XX стагоддзя дзякуючы цеснай сувязі пакаленняў моцна трымаліся вераванні, звычаі, абрады, адны з якіх былі скіраваны на выхаванне асобы, фарміраванне ў яе добрых маральных якасцей, другія – з’яўляліся крыніцай ведаў, неабходных пры выхаванні дзяцей; трэція як частка духоўнай культуры перадаваліся ад аднаго пакалення другому, развіваючыся і ўзбагачаючыся.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Народная педагогіка беларусаў як гістарычна абгрунтаваная сістэма была асновай выхавання і мела глыбокія і трывалыя карані. З пакалення ў пакаленне назапашваліся, шліфаваліся і перадаваліся розныя веды, працоўныя навыкі, правілы і нормы паводзін у сям'і, грамадстве і г.д. І гэты працэс насіў мэтанакіраваны характар, бо выхаваўчая спадчына мела ў сваім складзе асобыя формы, метады і прыёмы выхавання дзяцей, якімі карыстаўся народ на працягу многіх стагоддзяў.

Вышэйшага росквіту народная педагогіка дасягнула ў XIX – XX стагоддзях, калі адбылася "селекцыя" найлепшых узораў народнай культуры (у тым ліку і выхаваўчых), якія набылі сэнс ідэалаў людской жыццядзейнасці і паводзін у грамадстве (Конан. 1996. С. 9). Гэтаму шмат у чым спрыяў той культурны асяродак, дзе адбывалася арганічнае спалучэнне жыцця і народнай творчасці. Назапашванне практычна-утылітарнага і духоўнага вопыту, неабходнага для адаптацыі ў культуры этнасу кожнага новага пакалення, ішло праз фальклор, народныя святы і абрады, гульні і г.д., дзе кожны і ўдзельнік, і творца. Выхаваўчы талент народа праяўляўся у тым, што само па сабе выхаванне не вычлянялася з жыцця, а арганічна ўпляталася ва ўсе сферы чалавечых адносін. Дастаткова прыгадаць, што мова кожнага беларуса была напоўнена прыказкамі, прымаўкамі, дасціпнымі народнымі выслоўямі, якія трапна выяўлялі сутнасць розных складаных з'яў і чалавечых адносін. Неаднаразова чуючы іх у дзяцінстве, чалавек не толькі спасцігаў выхаваўчую мудрасць, але і вучыўся выкарыстоўваць яе ў сваім жыцці.

Народныя выхаваўчыя ідэі беларусаў у сваім гістарычным развіцці захавалі рэшткі язычніцкіх уяўленняў, якія арыентаваны на цесную сувязь чалавека з прыродай. Значны ўплыў

на іх аказала і хрысціянская ідэалогія, асноўныя духоўна-этычныя пастулаты якой арыентавалі чалавека на ўдасканальванне свайго ўнутранага свету і неабходнасць выканання хрысціянскіх этычных нормаў.

Важнейшую ролю ў выхаванні дзяцей адыгрывала сям'я. У XIX – пачатку XX стагоддзя тут яшчэ моцна трымаліся векавыя выхаваўчыя традыцыі. Асабліва трывалымі яны былі ў сялянскай сям'і, лад жыцця якой вызначаўся пэўнай кансерватыўнасцю. Як першасная сацыяльна-эканамічная ячэйка грамадства сям'я забяспечвала выхаванне дзяцей, тут пасцігаліся сацыяльны вопыт папярэдніх пакаленняў, народныя традыцыі і нормы паводзін, а таксама вераванні, звычаі, абрады. У сістэме сацыялізацыі дзяцей важную ролю выконвалі блізкія родныя — бацькі, дзядзькі, цёткі, дзядулі, бабулі.

Першымі і асноўнымі выхавальнікамі дзяцей былі маці і бацька, аўтарытэт якіх меў на дзяцей велізарны ўплыў. Згодна з народным звычаем, дзеці павінны былі выказаць павагу і пашану да маці і бацькі, а малодшыя дзеці, акрамя таго, усім старэйшым у доме. Увесь побыт сям'і ў гэты перыяд будаваўся на арганічнай супольнасці і строгім падпарадкаванні ўсіх яе членаў старэйшаму ў сям'і (часцей – бацьку). Адносіны з бацькамі характарызаваліся стрыманасцю. Характар унутрысямейных адносін у сялянскай сям'і, дзе слова бацькі – закон, моцна ўплываў на выхаваўчы працэс.

У традыцыйнай сям'і дзеці ў імператыўна-катэгарычнай форме ўспрымалі большасць прадпісанняў і забарон, якія тычыліся як правіл паводзін, так і жыцця ўвогуле, а таксама розных з'яў і іх ацэнкі. Дэталёва распрацаваным і адшліфаваным быў паўсядзённы побыт беларуса. З маленства дзеці крок за крокам засвойвалі правілы паводзін у сям'і і грамадстве і павінны былі строга выконваць усё, што ад іх патрабавалася. Асноўныя правілы паводзін дзеці ведалі ўжо к пяці гадам.

Вялікую выхаваўчую ролю ў жыцці беларусаў адыгрывалі святы, абрады, традыцыі, якія спадарожнічалі з чалавекам на працягу ўсяго жыцця. У народзе існавала цвёрдае перакананне, што неабходна не толькі трымацца традыцый, але і захоўваць, берагчы іх, перадаць сваім дзецям і ўнукам.

На пачатку XX стагоддзя, асабліва пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая змяніла лад жыцця і ўзаемаадносіны паміж людзьмі, пачаліся змены ў побыце народа, яго ўяўленнях і выхаваўчых поглядах, практыцы выхавання. Асабліва прыметнымі яны былі ў гарадах Беларусі, дзе сямейнае выхаванне пацяснілі грамадскія формы: дзіцячыя садкі, школы-інтэрнаты і г.д.

Вясковая сям'я да пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя заставалася каталізатарам народных педагагічных традыцый. Як сведчаць розныя літаратурныя крыніцы, у паслярэвалюцыйны час побыт дзяцей мала адрозніваўся ад побыту больш ранняга перыяду. Так, у першай палове XX стагоддзя амаль без змяненняў заставалася харчаванне, адзенне дзяцей. Захаваліся народныя традыцыі ў лячэнні дзяцей. Гэта ў многім было абумоўлена тым, што вясковая сям'я яшчэ заставалася адасобленай гаспадарчай адзінкай, з натуральнай гаспадаркай, у якой спажываліся прадукты харчавання, выраблялася адзенне, прылады працы і г.д.

У гарадской сям'і (дзякуючы развіццю грамадскага падзелу працы) асобныя функцыі сям'і пачалі адміраць яшчэ ў канцы XIX стагоддзя. Адпаведна мяняліся і ўзаемаадносіны ў сям'і, як паміж бацькамі і дзецьмі, так і паміж мужам і жонкай. Эканамічная самастойнасць, якую давала праца на фабрыцы, заводзе, парушыла традыцыю пакорнасці, дысцыплінаванасці, поўнага падпарадкавання волі бацькі і змяніла яе на супрацьлеглую.

Сучасны тып выхавання дзяцей у сям'і характарызуецца павышанай увагай і клопатамі аб дзецях. Дзетацэнтрысцкая тэндэнцыя, якая пачала ўкараняцца яшчэ ў XIX стагоддзі, калі любоў да дзяцей выступала адной з вышэйшых маральных каштоўнасцей, з'яўляецца пануючай і ў сучаснай сям'і. У адрозненне ад традыцыйнага тыпу выхавання, пры якім ігнараваліся спантанныя жаданні дзіцяці, адсутнічала адкрытае эмацыянальнае праяўленне любві і пяшчоты да іх і дзе асноўнае месца адводзілася працоўнаму выхаванню, сучасны якраз арыентаваны на патрэбы дзяцей. Больш таго, зараз нормай стала больш адкрытае праяўленне любві і прыхільнасці да іх. Нярэдка бацькі лічацца і са спантаннымі жаданнямі дзяцей, часцей звяртаюцца яны да псіхалагічных метадаў выхавання.

Гаворачы аб дзетацэнтрысцкай тэндэнцыі ў выхаванні, якая характарызуецца павышанымі ўвагай і клопатам аб дзецях, нельга не ўбачыць у ёй і негатыўны бок, бо вынікам яе становіцца менавіта рост злачыннасці сярод дзяцей, іх інфантыльнасць і бестурботнасць (Кон. 1987. № 6. С. 29).

У залежнасці ад тыпу сям'і змяніліся і магчымасці забеспячэння дзяцей усім неабходным. Яны, як вядома, лепшыя ў малых сем'ях, дзе лепшае фінансавае становішча. Бацькі ў такіх сем'ях больш увагі аддаюць дзецям, іх фізічнаму і інтэлектуальнаму развіццю. Аднак большыя сем'і маюць перавагу ў параўнанні з малымі ў выхаванні ў дзецях адказнасці, дабрыні, самастойнасці, працавітасці, клопатаў аб блізкіх і г.д.

Як і ў мінулым, дзецям, асабліва ў гарадах, не хапае ўвагі з боку бацькоў, якія заняты на вытворчасці або ў сельскай гаспадарцы. Дзеці, па сутнасці, не маюць дастатковага кантролю за сваімі паводзінамі. Вырашэнне гэтай надзвычайна важнай праблемы бачыцца нам у скарачэнні працоўнага дня жанчынам, што дазволіць вызваліць час для заняткаў з дзецьмі і іх выхавання.

Негатыўныя з'явы ў выхаванні дзяцей характарызуюцца сёння адсутнасцю ў грамадстве ідэалаў, пэўнай стратай аўтарытэту бацькоў, непаважлівымі адносінамі да старэйшых, прывабнасцю дрэнных узораў паводзін. Больш таго, страта бацькоўскага аўтарытэту з цягам часу нярэдка вымушае дзяцей шукаць гэты аўтарытэт у іншым асяроддзі — у розных кампаніях і г.д. На ўсё гэта трэба звярнуць увагу і грамадскасці, і школе. Ад дзяржавы патрабуецца развіццё культурнага асяроддзя, больш дасканалая сістэма фінансавай падтрымкі сям'і, а таксама шэраг захадаў па прадастаўленню бацькам большых магчымасцей для выхавання дзяцей.

# ЛІТАРАТУРА

Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986.

*Арлова Г.П.* Беларуская народная педагогіка. Мн., 1993.

*Арлова Г.П.* Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы. Мн., 1995.

*Артёмова О.Ю.* Дети в обществе аборигенов Австралии // Этнография детства. Традиционные методы воспитания детей у народов Австралии, Океании и Индонезии. М., 1992.

*Бараноўскі Я.* Санітарна-бытавы стан вёскі Радзілавічы, Букчанскі сельсавет, Тураўскі раён, Мазырская акруга // Наш край. 1928. № 8–9.

Белорусы. М., 1998.

*Бобровский П.* Материалы для истории и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. СПб., 1863. Ч. 1, 2.

*Богданович А.Е.* Педагогические воззрения белорусского народа // Минский листок. 1886. № 61. 18 нояб.

*Богданович А.Е.* Отцы и дети в белорусской деревне // Гродненские губернские ведомости. 1884. № 20, 22, 30.

*Богданович А.Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Гродно, 1895.

*Бутинов Н.А.* Детство в условиях общинно-родового строя // Этнография детства: Традиционные методы воспитания детей у народов Австралии, Океании и Индонезии. М., 1992.

Витебские губернские ведомости. 1898. 28 лістап.

*Владимиров.* Первый Всероссийский съезд работниц (16–22 ноябр. 1922 г.) // Вестник жизни. 1919. № 3.

*Гарэцкі М.* Наш тэатр // Калядная пісанка. Вільня, 1913.

*Гарэцкі М.* У панскай кухні (успаміны) // Беларускі звон. 1922, 25 сак.

*Гоптаревский И.* Надзор за крестьянскими детьми в страдную пору // Гродненские губернские ведомости. 1905. № 24, 24 чэрв.

*Дембовецкий А.С.* Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом описании. Могилев-на-Днепре. Кн. 1. 1882.

*Довнар-Запольский М.В.* Очерки семейного обычного права крестьян Минской губернии // Этнографическое обозрение. 1891. № 1.

*Довнар-Запольский М.В.* Белорусская свадьба в культурно-религиозных пережитках // ЭО. 1893, № 3.

Дзіцячы фальклор (Склад. Г.А.Барташэвіч). Мн., 1972.

*Дмитриев В.А., Иванов В.П.* Опыт сравнительного анализа детских игр // "Мир детства" в традиционной культуре народов СССР: Сб. науч. трудов. Ч. II. Л., 1991.

*Зеленский И.* Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губерния. Ч. 1. СПб., 1864.

*Калачова І.І.* Этнапедагагічныя традыцыі беларусаў і іх уплыў на сучасную гарадскую сям'ю (з вопыту абследавання сямей г. Мінска). Аўтарэф. ...дыс. канд. гіст. навук. Мн., 1995.

*Калачова І.І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Мн., 1999.

*Каптерев Т.Ф.* Избранные педагогические сочинения. М., 1982.

*Караткевіч У.* Збор твораў. У 8 т. Мн., 1989. Т. 4.

*Каспяровіч М.* Для чаго і як вывучаць быт дзяцей // Наш край. 1930.

*Киркор А.* Следы язычества в праздниках, обрядах и песнях // Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье /Под ред. П.П.Семенова. СПб.; М.,1882. Т. III. Ч. II.

*Киркор А.* Этнографический взгляд на Виленскую губернию // ЭС. СПб., 1885. Вып. III.

*Кон И.С.* Этнография детства: Историографический очерк // Этнография детства. Традиционные методы воспитания детей народов Восточной и Юго-Восточной Азии. М., 1983.

*Кон И.С.* Материнство и отцовство в историко-этнографической перспективе // СЭ. 1987. № 6.

*Конан У.* Народная педагогіка ў сістэме этнічнай культуры // Народная педагогіка беларусаў. Мн., 1996.

*Крачковский Ю.Ф.* Быт западно-русского селянина. М., 1874.

*Курыловіч.* Сялянская сям'я // Сям'я і сямейны быт беларусаў. Мн., 1990.

*Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. Мн., 1993.

*Лаппо И.И.* Великое княжество Литовское за время от заключения унии до смерти Стефана Батория (1569–1596). Опыт исследования политического общественного строя. СПб., 1901. Т. 1.

*Міцкевіч А.* Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літву. Мн., 1985.

Народная педагогіка беларусаў. Мн., 1996.

*Никифоровский Н.Я.* Очерки Витебской Белоруссии // ЭО. 1882, № 1, 2; 1893, № 2; 1894, № 1; 1897, № 2, 3; 1898, № 2.

*Никифоровский Н.Я.* Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности (Этнографические данные). Витебск, 1895.

*Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Витебск, 1897.

Новый труд Л.Н.Нидерле о славянских древностях // Этнографическое обозрение. 1912. № 3.

*Охотский Я.Д.* Рассказы о польской старине. СПб., 1874.

Очерки сравнительной этнографии и культуры М.И.Кулишера. СПб., 1897.

*Пагашчанін.* Крывічанскія дзяды // Крывіч. 1927. № 12.

Прыказкі і прымаўкі. Кн. 2. Мн., 1976.

*Пыпин А.Н.* История русской этнографии. Т. IV: Белоруссия и Сибирь. СПб., 1892.

*Ракава Л.В.* Традыцыйная сістэма выхавання // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 2.

*Ракава Л.В.* Быт дзяцей // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 7, 8.

*Ракава Л.В.* Этнапедагогіка сельскага насельніцтва Беларусі // Народная педагогіка беларусаў. Мн., 1996.

*Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Т. 1. Вып. 1, 2. Могилёв, 1885.

*Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 8. Могилев, 1912.

*Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. VIII – IX. Вильна, 1912.

*Романов Е.Р.* Очерк быта нищих Могилевской губернии и их условный язык ("Любецкий лемент") // ЭО. 1890. № 4.

Россия. Полное географическое описание нашего отечества (Под ред. В.П.Семёнова). СПб., 1905. Т. 9.

Русская женщина XVIII столетия. Исторические этюды Вл. Михневича. К., 1895.

Сборник статей "Могилевские губернские ведомости". Под ред. Е.Р.Романова. Вып. III. 1902 – 1903. Могилев-на-Днепре. 1903.

*Сержпутовский А.К.* Сказки и рассказы белорусов-полешуков. Материалы к изучению творчества белорусов и их говора. СПб., 1911.

Статут Великого княжества Литовского 1588 г. Разд. 6. Арт. 1.

*Сыракомля У.* Добрыя весці. Мн., 1993.

*Сыракомля У.* Вандроўкі па маіх былых ваколіцах. Успаміны, даследаванні гісторыі і звычаяў /Перак. з польск. К.Цвіркі. Мн., 1992.

*Улашчык М.* Была такая вёска. М., 1989.
*Харузина В.Н.* Об участии детей в религиозно-обрядовой жизни // Этнографическое обозрение. 1911. № 1–2.
*Шашалевіч А.* Арганізацыя працы, быт у калгасах Чачэрскага раёну // Наш край. 1930. № 4.
*Шейн П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Соч. в 3 т. СПб., 1887. Т. I; 1893. Т. II; 1902. Т. III.

## КРЫНІЦЫ

1. АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 69 – Матэрыялы Гродзенска-Лідскай этнаграфічнай экспедыцыі 1995 года
2. АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 70 – Матэрыялы Віцебска – Мінска-Магілёўскай этнаграфічнай экспедыцыі 1996 года
3. АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 83 – Матэрыялы Віцебскай этнаграфічнай экспедыцыі 1996 года
4. АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 13, спр. 120 – Матэрыялы Віцебскай этнаграфічнай экспедыцыі 1999 года

## СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

АІМЭФ НАНБ – Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі

ЭО – "Этнографическое обозрение"

СЭ – "Советская этнография"

АВ – "Адукацыя і выхаванне"

ЭС – "Этнографический сборник РГО"

ЗМЕСТ

Уводзіны ........ 3
Дзяцінства: узроставыя ступені ........ 7
Працэс выхавання ў народнай педагогіцы ........ 16
Выхаванне працай ........ 38
Умовы жыцця дзяцей ........ 46
Гульні і забавы ў выхаванні дзяцей ........ 68
Дзеці ў вераваннях і абрадах традыцыйнай культуры ........ 84
Заключэнне ........ 102
Літаратура ........ 106

Навукова-папулярнае выданне

**РАКАВА Любоў Васільеўна**

**ТРАДЫЦЫІ СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ**

Загадчык выдавецкага аддзела *У. А. Герасімовіч.*
Рэдактар *З. Я. Дрэбушэвіч.*
Мастак *Ю. І. Бокая.*
Мастацкі рэдактар *А. М. Хількевіч.*
Тэхнічны рэдактар *Г. М. Хейфец.*
Карэктары *Л. К. Місуна, К. А. Сцяпанава.*
Камп'ютэрная вёрстка *І. У. Грыцэль.*

Здадзена ў набор 11.11.99. Падпісана ў друк 12.01.2000. Фармат 84x108 1/32.
Папера газетная. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 5,88.
Ум. фарб.-адб. 6,3. Ул.-выд. арк. 6,4. Тыраж 2000 экз. Заказ 5013.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва "Ураджай"» Дзяржаўнага камітэта
Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 8 ад 02.12.97.
220048, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня "Перамога". 222310, Маладзечна, вул. В. Таўлая, 11.

**«ИЗДАТЕЛЬСТВО “УРАДЖАЙ“»**
**предлагает читателям литературу**
**по вопросам:**

- развития сельского хозяйства;
- экологии;
- хранения и переработки сельскохозяйственной продукции;
- любительского садоводства и огородничества;
- строительства и благоустройства крестьянских усадеб и дачных участков;
- ведения домашнего хозяйства;
- кулинарии.

А также научную, научно-популярную, учебную и справочную литературу.

«Издательство “Ураджай“» выполнит весь цикл редакционных работ по подготовке оригинал-макетов и художественного оформления изданий.

**Издательство “Ураджай“ приглашает к сотрудничеству всех заинтересованных лиц.**

**Наш адрес: 220048, Минск, пр. Машерова, 11.**
**Тел. (017)223-64-94, факс 223-80-23**
**E-mail**

ISBN 985-04-0398-5